ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ВЫДАЕЦЦА З 1932 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 50 (2681) • Пятніца, 14 снежня 1973 года. • Цана 8 кап.

ЛІСТ САКРАТАРУ РАЙКОМА

Ульяна Феакцістаўна,
Я з вамі,
Ліст пішучы, пагаварыць хачу
З даверам,
З тым няўлоўным хваляваннем,
Якое толькі льга душой адчуць.

...Дарог нямала
Знікла ў далячынях,
Навек растала ў будняў мітусні,
Але дасюль ляжыць перад вачыма
Дарога ў Докшыцы, у пошум ніў.

...Вы ў той паездцы
Ад імя райкома
Гасцінная гаспадыняю былі,
Вялі свой рэй,
Пагляды ўсіх рукою
Скіроўвалі на родныя палі.

Расказвалі,
Як «сваталі» сюды вас
Абкомаўскія шчырыя сваты,
Калі яшчэ на ўкамянелых нівах
Пырэчнік гаспадарнічаў густы.

А потым—
Як з адкрытаю душою
Сустрэлі першымі ў раёне вас жанкі
І як пайшлі паўсюднаю вайною
Супроць каменных лаў працаўнікі.

...У палявой смузе
Са славай іхняй побач
Стаялі людзі ратныя з бароў,
Бо на рахунку ваш раён асобым—
Раён і сейбітаў і мужных змагароў.

...Здалёку вёскі,
Вам і ўсім на любасць,
Хваліліся, узняўшыся з садоў,
То вежай фермы,
То высокім клубам,
То домікаў бялюткай чарадой.

І я адчуў:
Вы ў наваколлі гэтым
Жыцця надзейным сталі важаком,
З'яўляючыся партыі паўпрэдам,
Яе жывых ідэй праваднікам.

Таму крынічна
Льецца ваша слова
І столькі добрай людскасці ў вачах,
Аззяны думкай, позірк іх скіроўван
На заўтрашні, аззяны працай шлях.

Міхась КАЛАЧЫНСКІ

Лісткі календара адлічваюць апошнія дні 1973 года, слаўнага рашаючага, трэцяга года дзевятай пяцігодкі. Ён застанецца ў гісторыі вялікай Краіны Саветаў, як год буйных поспехаў міралюбівай знешняй палітыкі ленінскай Камуністычнай партыі, вялікіх гаспадарчых і культурных дасягненняў.

Яшчэ больш магутнай стала наша Радзіма, яшчэ лепш сталі жыць савецкія людзі. За ўсім гэтым стаіць гераічная праца савецкага народа, яго адданасць справе Леніна.

Сярод роўных сясцёр-рэспублік упэўнена крочыць па шляху да камунізма і Савецкая Беларусь. Працоўныя рэспублікі рапартуюць аб датэрміновым выкананні заданняў трэцяга года пяцігодкі.

Гэтымі днямі ў рэспубліку прыйшла радасная вестка. За вялікія поспехі, дасягнутыя ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве, і праяўленую працоўную доблесць у выкананні прынятых абавязацельстваў па павелічэнню вытворчасці і продажу дзяржаве збожжа, бульбы, цукровых буракоў і іншых прадуктаў земляробства ў 1973 годзе, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прысвоіў высокія званні Героя Сацыялістычнай Працы дваццаці чатыром перадавікам сельскай гаспадаркі Беларускай ССР.

Вось яны, нашы новыя героі:

Астрэйка Уладзімір Цімафеевіч — звеннявы калгаса «Беларусь» Любанскага раёна Мінскай вобласці, Байкоў Аляксандр Аляксеевіч — трактарыст саўгаса «Дрыбінскі» Горацкага раёна Магілёўскай вобласці, Бяганскі Міхаіл Паўлавіч — звеннявы саўгаса «Жалезінскі» Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці, Ваньковін Раман Леапольдавіч — звеннявы калгаса «Чырвоная зорка» Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці, Вашкевіч Аркадзь Праколавіч — звеннявы калгаса імя Энгельса Слуцкага раёна Мінскай вобласці, Выскварка Арсень Мікалаевіч — трактарыст калгаса імя Ціміразева Капыльскага раёна Мінскай вобласці, Дзяржынскі Іван Ігнатавіч — дырэктар саўгаса «Яхімаўшчына» Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці, Дрозд Ефрасіння Паўлаўна — звеннявая калгаса імя Кірава Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці, Журбіла Людміла Мікалаеўна — брыгадзір калгаса «Аснежыцкі» Пінскага раёна Брэсцкай вобласці, Зелянкоўскі Іван Фёдаравіч — брыгадзір калгаса «Чырвоная ніва» Брагінскага раёна Гомельскай вобласці, Кошур Марта Уладзіміраўна — звеннявая калгаса «Рассвет» Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці, Крышталевіч Ульяна Феакцістаўна — першы сакратар Докшыцкага райкома Кампартыі Беларусі Віцебскай вобласці, Кучур Лілія Сямёнаўна — звеннявая калгаса «Перамога» Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці, Лучко Акім Сцяпанавіч — старшыня калгаса імя Чапаева Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці, Мокат Аляксандр Міхайлавіч — трактарыст калгаса імя Царука Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці, Мухін Мікалай Дзмітрыевіч — намеснік дырэктара Беларускага навукова-даследчага інстытута земляробства Мінскай вобласці, Мышко Міхаіл Мікалаевіч — старшыня калгаса «Бальшавік» Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці, Палякоў Іван Яўцеевіч — першы сакратар Мінскага абкома Кампартыі Беларусі, Сакоўскі Люцыян Васільевіч — трактарыст калгаса «Кастрычнік» Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці, Самуйлаў Іван Савельевіч — брыгадзір калгаса «Новае жыццё» Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці, Сіроткіна Лідзія Емяльянаўна — галоўны агранам калгаса «Перамога» Талачынскага раёна Віцебскай вобласці, Тачыла Аляксей Міронавіч — звеннявы калгаса імя Жданава Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці, Цебрук Аляксей Аляксандравіч — трактарыст саўгаса «Малеч» Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці, Шарстнёў Мікалай Яфрэмавіч — трактарыст калгаса імя Куйбышава Аршанскага раёна Віцебскай вобласці.

За вялікія поспехі, дасягнутыя ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве, і праяўленую працоўную доблесць Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў ордэнамі і медалямі ў ліку лепшых працаўнікоў краіны і вялікую групу перадавікоў сельскагаспадарчай вытворчасці нашай рэспублікі.

Першы сакратар Докшыцкага райкома Кампартыі Беларусі Ульяна Феакцістаўна Крышталевіч... Слаўная дачка беларускага народа, яна на сваім адказным пасту аддае агульнай справе ўсе сілы, вопыт, веды.

Гэты здымак Ульяны Феакцістаўны зроблены нашым фотакарэспандэнтам Ул. Крукам у час наведання Докшыцкага раёна групай дзеячоў літаратуры і мастацтва Беларусі, дзе яны былі гасцямі слаўных працаўнікоў раёна.

ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА

10—11 снежня 1973 года адбыўся чарговы Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС.

Пленум заслухаў даклады намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР, старшыні Дзяржплана СССР тав. М. К. Байбакова «Аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1974 год» і міністра фінансаў СССР тав. В. Ф. Гарбузава «Аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1974 год».

На Пленуме з вялікай прамовай выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС тав. Л. І. Брэжнеў.

Па абмяркоўваемых пытаннях на Пленуме пачаліся спрэчкі. У спрэчках выступілі: тт. У. В. Шчарбіцкі — першы сакратар ЦК Кампартыі Украіны, М. С. Гарбачоў—першы сакратар Стаўрапольскага крайкома КПСС, І. І. Бодзюл—першы сакратар ЦК Кампартыі Малдавіі, П. Д. Барадзін—генеральны дырэктар Маскоўскага аб'яднання па выпуску аўтамабіляў, А. Э. Вос—першы сакратар ЦК Кампартыі Латвіі, А. В. Георгіеў—першы сакратар Алтайскага крайкома КПСС, К. Н. Руднеў—міністр прыборабудавання, сродкаў аўтаматызацыі і сістэм кіравання, А. К. Чорны—першы сакратар Хабараўскага крайкома КПСС, Б. Ашымаў—Старшыня Савета Міністраў Казахскай ССР, Г. В. Раманаў — першы сакратар Ленінградскага абкома КПСС, А. К. Антонаў—міністр электратэхнічнай прамысловасці, І. А. Бандарэнка—першы сакратар Растоўскага абкома КПСС, Н. Д. Худайбердыеў — Старшыня Савета Міністраў Узбекскай ССР, Е. А. Сальнікава—майстар каталізатарных сетак Беразнікоўскага азотна-тукавага завода імя К. Я. Варашылава, П. М. Машэраў — першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі, Б. Е. Шчарбіна—першы сакратар Цюменскага абкома КПСС, А. І. Шыбаеў—першы сакратар Саратаўскага абкома КПСС, Э. А. Шэварднадзе—першы сакратар ЦК Кампартыі Грузіі, А. Г. Бузніцкі—старшыня ордэна Леніна калгаса імя Жданава Міронаўскага раёна Кіеўскай вобласці, Г. А. Аліеў—першы сакратар ЦК Кампартыі Азербайджана, І. П. Казанец — міністр чорнай металургіі СССР, В. І. Варатнікоў—першы сакратар Варонежскага абкома КПСС.

Пленум ЦК КПСС аднагалосна прыняў адпаведную пастанову.

ПАСТАНОВА ПЛЕНУМА ЦК КПСС

АБ ПРАЕКТАХ ДЗЯРЖАЎНАГА ПЛАНА РАЗВІЦЦЯ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ СССР І ДЗЯРЖАЎНАГА БЮДЖЭТУ СССР НА 1974 ГОД

Адобрыць у асноўным праекты Дзяржаўнага плана развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1974 год і Дзяржаўнага бюджэту СССР на 1974 год і ўнесці іх на разгляд сесіі Вярхоўнага Савета СССР.

Цалкам і поўнасцю адобрыць дзейнасць Палітбюро ЦК КПСС па ажыццяўленню рашэнняў XXIV з'езда партыі ў галіне ўнутранай і знешняй палітыкі, палажэнні і вывады, выкладзеныя ў выступленні Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева на гэтым пленуме.

Прызнаць, што выкананне і перавыкананне плана 1974 года будзе мець вызначальнае значэнне для паспяховага завяршэння пяцігодкі ў цэлым, створыць умовы для далейшага росту эканамічнага патэнцыялу краіны, павышэння матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню народа.

Прапанаваць ЦК Кампартый саюзных рэспублік, крайкомам і абкомам партыі, усім партыйным арганізацыям разгарнуць работу па мабілізацыі камуністаў, камсамольцаў і ўсіх працоўных на выкананне народнагаспадарчага плана 1974 года, кіруючыся выступленнем таварыша Л. І. Брэжнева.

ЛЕНІНСКІМ КУРСАМ

СЕМАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР ВОСЬМАГА СКЛІКАННЯ

Краіна Саветаў завяршае трэці год дзевятай пяцігодкі, год ударнай працы, шырокага размаху сацыялістычнага спаборніцтва.

12 снежня 1973 года ў Маскве, у Крамлі сабраліся пасланцы ўсіх народаў нашай шматнацыянальнай Радзімы—дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР. Тут пачала работу сёмая сесія Вярхоўнага Савета СССР восьмага склікання.

На парадку дня сесіі пытанні:

1. Аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1974 год.
2. Аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1974 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту СССР за 1972 год.
3. Аб зацвярджэнні УказаўПрэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

По першаму пытанню парадку дня з дакладам «Аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1974 год» выступіў намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР, старшыня Дзяржплана СССР М. К. Байбакоў.

Даклад «Аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1974 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту СССР зз 1972 год» зрабіў міністр фінансаў СССР В. Ф. Гарбузаў.

ЗІХАЦІЦЬ КУПАЛАВА СЛОВА

На Мінскім заводзе халадзільнікаў адбыўся семінар камсамольскага актыву. Удзельнікі яго мелі творчую сустрэчу з супрацоўнікамі рэспубліканскага тэлебачання. На экране была паказана стужка, створаная паводле вершаў і паэм Янкі Купалы — «Па шчасце, па сонца». Рэжысёр В. Акімушкін расказаў аб тым, як калектыў выканаўцаў на чале з пастаноўшчыкам гэтай своеасаблівай тэлепаэмы В. Расўскім (сцэнарыст М. Стральцоў) шукаў адпаведную зместу паэтычную экранную форму ўвасаблення купалаўскіх вобразаў. Фільм «Па шчасце, па сонца» ўсхваляваў гледачоў жывым бляскам слова народнага паэта Беларусі.

Такі твор карысна час ад часу паказваць паўторна на тэлеэкранах.

М. КАРОЛЬ,
сакратар камсамольскай арганізацыі цэха.

ГОРАЧА АДАБРАЕМ, ПАДТРЫМЛІВАЕМ!

ПРАЙШЛО два тыдні пасля вяртання Генеральнага сакратара ЦК КПСС Леаніда Ільча Брэжнева з Дэлі, дзе ён вёў плённыя перагаворы з Прэм'ер-Міністрам Індыі Індзірай Гандзі, а рэха гэтай вялікай падзеі працягвае гучаць па ўсім свеце.

Індыя. Слова, знаёмае кожнаму з нас з дзяцінства па кнігах, карцінах, кінафільмах. І хоць я ніколі не была ў гэтай краіне, але добра ўяўляю сабе жывапісную прыгажосць яе прыроды, хараство старадаўніх гарадоў. Індыйская культура—адна з самых даўніх на зямлі. Народ гэтай краіны даў свету выдатных пісьменнікаў, філосафаў, артыстаў.

Але яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў назад слова Індыя асацыіравалася і з такім паняццем, як голад, галеча.

У 1947 годзе індыйскі народ скінуў уладу брытанскіх каланізатараў і абвясціў рэспубліку. Вось ужо больш як два з паловай дзесяцігоддзі Індыя ідзе новым шляхам, будуе новае жыццё.

З першых дзён свайго існавання Рэспубліка Індыя заняла антыімперыялістычную пазіцыю ў міжнародных справах, узяла курс на дружбу і супрацоўніцтва з Савецкім Саюзам, з сацыялістычнымі краінамі. Індыйскі народ добра ведае сваіх сапраўдных сяброў, ведае, хто прыйдзе яму на дапамогу ў цяжкі час. У сваёй прамове перад індыйскімі парламентарыямі Леанід Ільч Брэжнеў пад бурныя апладысменты сказаў, што савецкія людзі заўсёды былі на баку барацьбы індыйскага народа за сваю свабоду і незалежнасць, шчыра падтрымлівалі яе, радаваліся яе поспехам.

Пяць дзён візіту Леаніда Ільча Брэжнева ў Індыі выліліся ў дэманстрацыю дружбы паміж нашымі народамі. Па прамому тэлевізійнаму «масту», наладжанаму пры дапамозе савецкіх касмічных спутнікаў «Маланка», мы з радасцю сачылі за тым, як горача сустракалі простыя людзі Індыі савецкіх прадстаўнікоў. «Хто сябра Індыі? —скандзіраваў натоўп.—Савецкі Саюз, Леанід Брэжнеў!»

Маю асаблівую ўвагу ў сумеснай савецка-індыйскай дэкларацыі прыцягнула тое месца, дзе гаворыцца, што «Абодва бакі вітаюць развіццё савецка-індыйскіх сувязей у галіне навукі, мастацтва, літаратуры, адукацыі, аховы здароўя, прэсы, радыё, тэлебачання, кіно, турызму і спорту...»

Сябры павінны добра ведаць адзін аднаго. І абмен культурнымі каштоўнасцямі толькі ўзбагаціць нашы народы.

Мы, работнікі мастацтва, як і ўсе савецкія людзі, горача падтрымліваем міралюбівую палітыку нашай партыі. Сваім мастацтвам мы заўсёды гатовы служыць высакароднай справе—распаўсюджванню вялікіх гуманістычных ідэй. Мы заўсёды былі і будзем вернымі памочнікамі ленінскай Камуністычнай партыі, актыўнымі будаўнікамі камунізма.

А. КЛІМАВА,
народная артыстка СССР.

Сустрэча ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі. Справа налева — Іван Шамякін, Гелена Брындзава, Вінцэнт Шыкула, Пятрусь Макаль, Анатоль Грачанікаў, Анатоль Вярцінскі, Йозэф Бата.

ВІЗІТ СЯБРОЎ

Мінск наведала група славацкіх пісьменнікаў у складзе Гелены Брындзавай, Вінцэнта Шыкулы і Йозэфа Баты. Вінцэнт Шыкула вядомы беларускаму чытачу як аўтар аповесці «Янікулы з дзядзькам Рафаэлем», якая выйшла ў мінулым годзе ў выдавецтве «Беларусь». Гелена Брындзава працуе над перакладамі твораў нашых паэтаў для анталогіі Беларускай савецкай паэзіі, што неўзабаве выйдзе ў Браціславе.

Госці мелі гутаркі ў Саюзе пісьменнікаў БССР і Беларускім таварыстве дружбы і культурных сувязей з зарубежнымі краінамі, наведалі Літаратурны музей Якуба Коласа, мемарыяльны комплекс «Хатынь» і Курган Славы, азнаёміліся з выдатнасцямі сталіцы.

А. ГАРДЗІЦКІ.

ПРЫЗНАНЫ ЛЕПШЫМІ

Падведзены вынікі Усесаюзнага конкурсу на лепшы музей баявой і працоўнай славы ў вышэйшых і сярэдніх сельскагаспадарчых навучальных установах. Лепшым прызнаны музей Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Галоўнае ўпраўленне вышэйшай і сярэдняй адукацыі Міністэрства сельскай гаспадаркі СССР прысудзіла яму першае месца і грашовую прэмію.

У музеі акадэміі сабрана звыш тысячы экспанатаў, дакументаў, фотаздымкаў. Яны расказваюць аб 133-гадовай гісторыі старэйшай у нашай краіне сельскагаспадарчай навучальнай установы, яе выхаванцах, якія сталі вядомымі вучонымі, Героямі Савецкага Саюза і Сацыялістычнай Працы, вядомымі кіраўнікамі і спецыялістамі сельскагаспадарчай вытворчасці.

Музей стаў добрай школай выхавання маладога пакалення. Адсюль першакурснікі пачынаюць сваё знаёмства з акадэміяй.

БЕЛТА.

ВІНШУЕМ!

За заслугі ў развіцці савецкага тэатральнага мастацтва і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў галоўнага мастака Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа народнага мастака Беларускай ССР Нікалаева Яўгена Дзмітрыевіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

У РЭДАКЦЫЮ «ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА»

Дазвольце праз вашу газету выказаць найлепшыя пажаданні і сардэчную падзяку ўсім, хто павіншаваў мяне з шасцідзесяцігоддзем.

Вісарыён ГАРБУК.

НАША ДРУЖБА МАЦНЕЕ

Творчай сустрэчай з кінематаграфістамі Беларусі і праглядам дакументальных фільмаў студыі «Летапіс» 7 снежня пачаўся тыдзень знаходжання ў нашай рэспубліцы групы дзеячоў мастацтваў Азербайджанскай ССР. Яе ўзначальвае першы намеснік старшыні прэзідыума Азербайджанскага тэатральнага таварыства Джабір Сафараў.

Гэта — візіт ў адказ. У пачатку года ў Азербайджане пабывала вялікая група майстроў беларускага мастацтва.

10 снежня прадстаўнікоў брацкай рэспублікі сустракалі рабочыя Беларускага аўтазавода ў Жодзіна. Разам з дзеячамі мастацтваў Азербайджанскай ССР сюды прыехалі народная артыстка СССР Л. П. Александроўская і народны артыст БССР С. С. Бірыла. Яны прадставілі рабочым гасцей, расказалі, як цёпла і сардэчна сёлетняй вясной прымалі творчых работнікаў Беларусі працоўныя Азербайджана.

Ад нафтавікоў Каспія, ад рабочых, калгаснікаў, дзеячоў культуры і мастацтва вялікі, сонечны «салам» перадаў прысутным кіраўнік групы, першы намеснік старшыні прэзідыума Азербайджанскага тэатральнага таварыства Джабір Сафараў.

Потым адбыўся канцэрт дружбы.

Пасля канцэрта госці з Азербайджана агледзелі цэхі прадпрыемства, у музеі працоўнай славы азнаёміліся з гісторыяй завода.

11 снежня ў памяшканні тэатра імя Я. Купалы адбылася творчая сустрэча з удзельнікамі дзён азербайджанскага мастацтва ў Беларусі.

За час знаходжання ў нашай рэспубліцы госці з Азербайджана наведалі выдатныя мясціны і помнікі рэспублікі.

У Мінску адбыўся канцэрт дружбы майстроў мастацтваў Азербайджана і Беларусі.

НА ЗДЫМКУ: удзельнікі сустрэчы пасля канцэрта.

Цёпла і сардэчна сустрэлі рабочыя Беларускага аўтазавода групу дзеячоў мастацтва Азербайджанскай ССР.

НА ЗДЫМКУ: артысты тэатра музычнай камедыі імя Курбанава Афелія і Сіявуш Асланавы выступаюць перад рабочымі БелАЗа.

Фота У. ЛУПЕЙКІ. (БЕЛТА).

ДЗЕВЯТЫ ТОМ БелСЭ

Выйшаў з друку 9-ы том Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. З'явіўся ён раней восьмага таму, што восьмы том асаблівы—ён амаль поўнасцю прысвячаецца партызанскай тэматыцы. Многія факты з гісторыі партызанскага руху ў рэспубліцы будуць апублікаваны ўпершыню. Цяпер завяршаецца праверка і ўдакладненне матэрыялаў. У 9-ы том уключана больш як 3 тысячы тэрмінаў, расказваецца аб дасягненнях беларускага народа, аб гісторыі БССР, развіцці эканомікі і культуры народаў СССР і свету.

Значнае месца займае артыкул «Расійская Савецкая Федэратыўная Сацыялістычная Рэспубліка». У ім шырока адлюстравана гісторыя брацкага рускага народа, якая на працягу стагоддзяў цесна пераплятаецца з гісторыяй нашай рэспублікі.

Шмат матэрыялаў сабрана ў дзевятым томе аб Саюзе Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік—краіне, у якой жыве больш як 100 вялікіх і малых народнасцей. За гады Савецкай улады склалася новая гістарычная супольнасць людзей—савецкі народ, які ўпэўнена ідзе пад кіраўніцтвам КПСС па шляху камуністычнага будаўніцтва.

Аб развіцці эканомікі Беларусі расказваецца ў артыкулах «Сельская гаспадарка», «Сельскагаспадарчае машынабудаванне», «Салігорскія калійныя камбінаты» і іншых. Упершыню ў энцыклапедычных выданнях з'явіўся артыкул «Салігорск». Гэты горад нарадзіўся ў 1958 годзе. Цяпер у ім жыве 50 тысяч чалавек. Сталіца беларускіх шахцёраў стала буйнейшым цэнтрам краіны па здабычы калійных угнаенняў.

Як і ў папярэдніх тамах, у 9-й кніжцы БелСЭ шырока асвятляецца культура, літаратура, змешчаны артыкулы аб пісьменніках, мастаках і кампазітарах.

Новы том багата ілюстраваны: у ім каля тысячы каляровых і ўнутрытэкставых ілюстрацый.

БЕЛТА.

«ТЭАТРАЛЬНЫЯ СЕРАДЫ» ГАРНЯКОЎ

САЛІГОРСК. (БЕЛТА). Першая «тэатральная серада» адбылася ў Палацы культуры камбіната «Беларуськалій». Да маладых шахцёраў, хімікаў і студэнтаў прыехалі артысты Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага. Яны расказалі аб спецыфіцы тэатра, як віду мастацтва, аб яго ўплыве на духоўны свет чалавека. Вечар закончыўся праглядам і абмеркаваннем новага спектакля «Конь Пржэвальскага» па п'есе М. Шатрова.

Такія сустрэчы стануць рэгулярнымі. У абанементах указаны тэмы маючых адбыцца размоў, названы імёны іх удзельнікаў — народных артыстаў СССР А. І. Клімавай і Я. М. Палосіна, народных артыстаў рэспублікі Г. Б. Абухові, Р. І. Янкоўскага, К. А. Шышкіна і іншых.

У СТАРАДАЎНЯЙ СЯДЗІБЕ

У маляўнічым кутку Падмаскоўя — сядзібе XVIII стагоддзя «Кускова» размясціўся музей керамікі СССР. Цяпер работнікі музея праводзяць выстаўку «Савецкая мастацкая кераміка і шкло». Экспазіцыю склалі творы, датаваныя першымі гадамі Савецкай улады, і работы апошніх гадоў.

Беларускіх мастакоў прадстаўляюць на гэты раз маладыя майстры. Наведвальнікі адзначаюць арыгінальнасць форм, тонкасць, вынаходлівасць колернага малюнка сервізаў «Зарава» Леаніда Багданава, «Юбілейны» і «Павуцінка» Валерыя Леантовіча і іншых вырабаў. Гэты посуд вырабляецца на Мінскім фарфоравым заводзе.

А. КАСЯНКОЎ.

Аляксей ЗАРЫЦКІ

ПАХАВАННЕ Пабла НЯРУДЫ

Альендэ паў, як воін на пасту.
Свабоды сцяг зубамі рвуць фашысты.
Закон яны закрэслілі штыком.
І акіянскага прыбою гул
Каля крутых чылійскіх узбярэжжаў
Гучыць, як рэквіем па змагарах,
Якія палягі ў няроўнай бітве.
Ужо і ў дом вялікага паэта
Пасмела уваліцца салдатня.
Якім ты стаў, блакітны дом Няруды,
Дзе столькі-столькі для людзей паэт
Прыгатаваў дзівосных падарункаў.
Скрозь чарапкі, абломкі і шматкі
І посуду, і мэблі, і адзення.
Прыкладам шыбы выбіты, і вецер
Трывожна кідаўся з кутка ў куток,
Гартаючы пажоўклыя старонкі
Абпаленых чарнавікоў і кніг.
Ён пах крывёй і дымам, і ўрываўся
І ў той пакой, дзе нізка над труной
Схіліліся ўдава й сястра Няруды.
А за дзвярамі тупацелі боты.
Там ворагі са зброяй пільнавалі,
Каб не прыйшоў народ к свайму паэту,
Апошнюю пашану не аддаў.
Але ж прыйшлі і рыбакі і цеслі,
Таварышы па песні й барацьбе.
Выносілі яны ў маўчанні з дому
Вялікую і цяжкую труну.
Такую цяжкую, нібыта ў ёй
Не толькі прах любімага паэта,
А і увесь нязмерны смутак Чылі
Па страчанай свабодзе і сынах.
І плыў і плыў людскі паток маўкліва.
І ўсё яшчэ даносіўся здаля
То стрэл глухі, то ляск і скрыгат танкаў.
І могілкі салдатамі былі
Кругом акружаны. Напагатове
Стаялі наймітыплячо ў плячо.
І вочы іх і дулы аўтаматаў
Халоднай адлівалі пустатой.
І тут маўчанне раптам загучала.
Уладна шуганула з глыбіні
Грудзей:
—Паўстань пракляццем катаваны!—...
Мацнелі галасы і неадольна
Зліваліся яны ў адзіны хор.
Над смерцю, смуткам і крывавым горам
Ускрыліў бессмяротны гімн, звястун
Наступных дзён, прадвеснік Перамогі.
І плыў людскі паток, і плыў, і плыў.

4.XI.1973.

ВОБРАЗ БЛІЗКІ, ВОБРАЗ ДАРАГІ

ШМАТ літаратуразнаўчых прац, мастацкіх і мемуарных твораў прысвечана жыццю і творчай дзейнасці заснавальнікаў беларускай савецкай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа. Аднак тэма гэта невычэрпная. Да яе ўсё часцей звяртаюцца пісьменнікі, крытыкі, бібліёграфы. Сведчаннем таму і новая паэма Антона Бялевіча «Нёманаў дар», якая была надрукавана сёлета ў восьмай і дзевятай кнiжках часопіса «Полымя».

Сэнс назвы твора раскрываецца А. Бялевічам у першых жа, уступных да паэмы радках. Нёман у творы — шчодры, «надзейны друг, сусед і брат, кармілец, бацька родны...» І ўсё ж найвялікшы Нёманаў дар народу — любімы Колас:

Паэта Нёман гадаваў,
Калыскай быў паэту,
Дзівосны дар свой перадаў
Шаноўны УСЯМУ СВЕТУ.

Раскрыць вобраз вялікага песняра аўтару дапамагае прырода. Праз яе адвечную настраёвасць аўтар красамоўна і праўдзіва малюе летуценную душу Кастуся-падлетка, паказвае той фон, на якім вырастаў у гэтай душы «напеў пякучы і сардэчны».

Ад кожнай хвоі і яліны,
Ад кожнай краскі і каліны —
Легенды, казкі і быліны
У сэрца хлопчыку плылі,
Праз дзіва дзіўнае вялі,
У сэрца ўсейвалі надзею,
Душой цяплеў і залацеў;
Рабіўся ў думках чарадзеем,
На крылах высака ляцеў.

Ускалыханы на ўлонні прыроды, хлопчык не мог расці інакшым; ён «шукаў сваю дарожку ў свет дабра і хараства», хоць рабіць гэта «ў цемры векавой» было нялёгка. Беднасць і нястачы ў бацькоўскай хаце засцілі тую дарожку іншымі клопатамі. Пакрысе хлопчык пачаў бачыць і адчуваць душой людскую праўду, якую так бязлітасна душылі «багачы і панства». І прысяга будучага песняра — шукаць сваю дарожку — напаўнялася новым зместам: «шукаць патрэбна праўду недзе». І тут А. Бялевіч сцісла і ў той жа час пераканаўча, выкарыстоўваючы біяграфічныя дадзеныя Я. Коласа, дынамічна ўзбагачае сюжэт свайго твора тымі фактамі, якія дапамаглі Кастусю-семінарысту стаць на перадавыя пазіцыі.

Гэта — вяселле ў паноў Радзівілаў, якія па сваёй нялюдскай прыхамаці, летам, імітуючы зіму, густа ўсыпалі дарогу соллю, па якой цягнула палазы мядзвежая тройка.

На радасць блазну і магнату
Бялее ў полі
Летам соль.
Яе няма ў мужыцкіх хатах,
Дзе толькі сум ды горкі боль.

Паглыбляючы вобраз свайго героя, А. Бялевіч не абмяжоўваецца матэрыяламі толькі гістарычнага характару. Аўтар, які сам уваходзіў у літаратуру «пры Коласе», большую частку твора грунтуе на асабістых уражаннях ад сустрэч з незабыўным чалавекам — і тым самым лірычна ўзбагачае паэму. Вось аўтар апісвае першую, нечаканую сустрэчу з песняром:

Я стаю. Паэт ідзе.
Сумна згорбіў плечы.
«Хіба ж мае чарадзей
Выгляд чалавечы?
Ходзіць босы па расе...»

І далей:

Падышоў да паласы
Сцежкай палявою.
Як сыночкаў, каласы
Гладзіць ён рукою.
— Зажынаць пара, Тарас. —
Кажа паляводу.
— Дык жа хмарыцца якраз.
— Пастаіць пагода.
. . . . . .
А яшчэ, Тарасе, знак,
Добрая прыкмета:
Камары таўкуць свой мак,
На пагоду гэта.

У апраўданне можа занадта шырокага цытавання паэмы хачу сказаць, што, на маю думку, гэтыя мясціны — паказальныя для твора, для вымалёўкі характэрных рыс герояў яе. Такіх мясцін у паэме шмат. Узяць хаця б тыя з іх, дзе расказваецца, як паэт выбірае ў краме мужчынам касу, як шукае грыбы, як з дупла выклікае вавёрку, як даглядае жыта, што сам пасеяў на былым дзірванку, як ён «карчэвіну сячэ», каб напаліць у хаце ў пасляваенным Мінску, як ён прымае маладых літаратараў у гэтай хаце, як адносіцца да іх, і — шмат якія іншыя. Мне асабіста, напрыклад, хацелася б і гэта працытаваць. Але тады, як кажуць, «гаворкі хопіць да рання». Аўтар паэмы валодае вялікім багажом як фактычнага матэрыялу пра песняра, так і паэтычных сродкаў яго літаратурнага ўвасаблення. Усяго гэтага ў кароткім артыкуле, вядома, не выкажаш. Хочацца толькі, можа быць, спыніцца на адным. Гэта — спачатку на нязрокавай (на пачатку паэмы), а пасля і зрокавай прысутнасці ў творы вобраза Янкі Купалы. Ужо ў першым раздзеле паэмы аўтар падае нам Кастуся - летуценніка каля начнога кастра. Тут хлапчуку мроіцца: «Нібыта выйшаў з туману нейкі дзед стары». І думае хлапчук: «Ён, можа, той, што ночкай цёмнай выходзіць, зрынуўшы курган?.. А на дасвеці, раным-рана... стары накрыецца курганам, пакіне росны белы свет?..» Гэта — пра вышэйпамянёную «нязрокавасць». А вось — ужо зрокава. Два будучыя літаратурныя волаты прагульваюцца на золку па аколіцах Мікалаеўшчыны. Косіць селянін. Папрасілі паспрабаваць:

Узяў касу Купала.
Пайшоў, пайшоў! Глядзіць стары:
— Таўкуць цябе хай камары,
Дальбог, касец удалы!..
Каса свістала, гнала
Пракос па струнцы акурат,
Ні касмыля, ні чуба.
— Вось гэтак скосім смутак, брат.
І царанят, Якубе!

У гэтай невялічкай замалёўцы — і характары песняроў, і іх перакананні, і мэта іх жыцця.

У заключэнне хочацца зрабіць і заўвагі аўтару паэмы. Па-першае, ці не занадта расцягнуты твор? Надаючы асаблівую ўвагу прыродзе ў творы, аўтар дзенідзе занадта захапіўся ёю і перабраў меру. Па-другое, псуюць твор паўторы. Напрыклад, пра Коласава жыта гаворыцца некалькі разоў. І яшчэ, не заўсёды да месца ўжываецца шмат памяншальных суфіксаў (люлечка, нялёганька, скварачка і г. д.), хоць у гэтым вось выразе: «скрылёчак з лытку камара» — можа лепей было б сказаць наадварот: «скрылёк з лытачку» — па вазе і масе камара. Далей трэба папракнуць Антона Бялевіча ў паспешлівасці напісання асобных мясцін, напрыклад:

А дзе шукаць яе (праўду — В. Р.)? Скажыце
Працяглым шолахам, кусты!

Хіба ж, калі ў каго пра што пытаецца, трэба абавязкова нагадаць яму і пра тон адказу («скажыце працяглым шолахам...»)?

У цэлым жа паэма аўтару ўдалася. Зварот да вобразаў нашых вялікіх песняроў — вельмі важная і ўдзячная справа.

Віктар РАКАЎ.

Новыя кнігі, якія выйшлі ў выдавецтве «Мастацкая літаратура»: Алесь Звонак «Неспакойныя сэрцы» (мастак Г. Малышаў), аповесці на рускай мове Платона Галавача (пераклад М. Гарулёва, мастак А. Салько) і Барыса Мінуліча (пераклад Б. Бур'яна і Г. Папова, мастак А. Дэмарскі).

МАСТАЦКАЯ ПРОЗА І СЦЭНА

ДАСЛЕДАВАННЕ Ул. Халіпа, аўтара кнігі «Радок, прачытаны тэатрам», засяроджана на адной праблеме — інсцэнізацыя мастацкай прозы і яе вытлумачэнне беларускімі тэатрамі.

Беларуская сцэна мае ў гэтым напрамку цікавыя здабыткі. Яшчэ ў рэпертуар тэатра І. Буйніцкага ўключаліся інсцэніроўкі. На нашу думку, аўтар мае рацыю, калі тлумачыць зварот тэатра да прозы, напрыклад, Э. Ажэшкі («Хам» і «Зімовы вечар») не толькі абмежаванай колькасцю твораў тагачаснай драматургіі, а і грамадскай пазіцыяй тэатра. Праблемы, узнятыя ў творах Э. Ажэшкі, іх сацыяльны пафас і ідэйная накіраванасць, былі надзвычай блізкімі гледачу тэатра Буйніцкага, знаходзілі ў яго сэрцы самы жывы водгук.

Аўтар разглядае інсцэніроўкі такіх твораў, як «Бацькаўшчына» К. Чорнага, «Салавей» З. Бядулі, «Дрыгва» Я. Коласа («У пушчах Палесся»), «Крыніцы» і «Сэрца на далоні» І. Шамякіна, «Людзі на балоце» І. Мележа, «Вайна пад стрэхамі» А. Адамовіча, «Рудабельская рэспубліка» С. Грахоўскага. Некаторым з іх прысвечаны асобныя раздзелы. Ул. Халіп шырока выкарыстоўвае параўнанні і прыклады, узятыя з практыкі шматнацыянальнага савецкага тэатра. Часцей за ўсё з прозы сучаснікаў тэатры бяруць актуальныя творы, якія могуць са сцэны яшчэ больш непасрэдна ўплываць на грамадскія эмоцыі гледачоў. Разглядае Ул. Халіп і прынцыповыя працэсы творчага парадку. Напрыклад, ён цікава гаворыць аб працэсе драматызацыі рамана ў літаратуры 20—30 гадоў. Сцвярджаючы, што гэтая тэндэнцыя найбольш выразна выявілася ў творчасці К. Чорнага, у прыватнасці, у яго рамане «Бацькаўшчына», даследчык падрабязна спыняецца на рамане «Зямля» не так дзеля аргументацыі сваёй высновы, як для таго, каб паказаць у чым непасрэдна адчуваўся працэс драматызацыі рамана: у больш заглыбленай псіхалагічнай распрацоўцы вобразаў, у абвастрэнні ўнутранага канфлікту герояў. Сцэна толькі пацвердзіла новыя тэндэнцыі чорнаўскай прозы. Скажам, эпізод з «Бацькаўшчыны», дзе Леапольд Гушка сярод рынку пачынае распранацца. У гэтай сітуацыі, узятай без яе матывіроўкі, няма нічога драматычнага. Сам па сабе такі «стрыптыз» мог бы выклікаць нават вясёлую ўсмешку. Але не выклікае. Чаму ж? Відаць, якраз таму, што ў гэтым, камічным па сваёй сутнасці дзеянні, выяўляецца глыбокі драматызм становішча героя, які дзеля кавалка ўласнай зямлі вымушан аддаваць **апошняе.** І тэатр разам з празаікам выкарыстоўвае такія прыёмы кантрасту драматычнага і камічнага, ці, дакладней, выяўлення аднаго ў другім.

Раман «Бацькаўшчына» першы буйны празаічны твор нацыянальнай літаратуры, героі якога з'явіліся перад гледачамі ў святле тэатральнай рампы. Як вядома, інсцэніроўка, што легла ў аснову спектакля БДТ-І, была напісана самім аўтарам. Пазней К. Чорны стварае шэраг новых варыянтаў, працуючы над інсцэнізацыяй рамана даволі доўгі адрэзак часу. Гэта сведчыць не толькі аб складанасці працэсу перакладу прозы на мову тэатра, але з'яўляецца пераканаўчым прыкладам высокай патрабавальнасці пісьменніка да сваёй творчасці.

Акцэнтуючы ўвагу на працэсе драматызацыі беларускага рамана і аповесці, даследчык паказвае, як па рознаму гэты працэс праяўляўся ў кожным канкрэтным выпадку.

Аналітычна раскрываючы ў гэтым грунтоўным даследаванні праблемы інсцэнізацыі прозы, Ул. Халіп дае многа цікавых назіранняў і трапных характарыстык. Шмат тут пераканаўчых і пасапраўднаму яркіх старонак, некаторыя з якіх успрымаеш як літаратурнае «аднаўленне» колішніх спектакляў. Трапляюць і старонкі, што больш нагадваюць газетныя рэцэнзіі.

Па-за ўвагай аўтара застаецца вопыт многіх беларускіх тэатральных крытыкаў, якія аналізавалі, давалі ацэнку інсцэніровак прозы (напрыклад, двухтомнік А. Сабалеўскага «Беларуская савецкая драма»). Ствараецца ўражанне, быццам да Ул. Халіпа ў беларускім тэатразнаўстве ніхто ніколі нідзе пра інсцэніроўку не пісаў.

Хацелася б на старонках кнігі прачытаць таксама і аб творчым супрацоўніцтве рэжысуры з аўтарам інсцэніроўкі. Тым больш, што ў гісторыі беларускага тэатра ёсць, нам здаецца, яркі прыклад — праца Э. Самуйлёнка і К. Саннікава над сцэнічным увасабленнем аповесці «Тэорыя Калебрун», якая ішла ў тэатры пад назвай «Сержант Дроб». Аднак у даследаванні чамусьці нават не ўпамінаецца гэты прыклад.

Наогул, варта было б больш шырока і грунтоўна сказаць аб рэжысёрскім вытлумачэнні прозы. Праўда, на старонках кнігі (і да гэтага абавязвае сама яе назва) аўтар, як мы ўжо казалі, вядзе гаворку і аб сцэнічнай інтэрпрэтацыі, ды перавага аддаецца галоўным чынам яе акцёрскаму выяўленню. Магла б тут, вядома, быць і гаворка аб тым, як рэжысёр, не адыходзячы ў прынцыпе ад тэксту інсцэніроўкі, сваімі сродкамі ўвасабляе ў пастаноўцы эпічны дух літаратурнага твора. Гаворыць жа, напрыклад, даследчык, што грунтоўнае знаёмства акцёра з раманам памагае сцэнічнаму ўзбагачэнню вобраза, выпісанага ў інсцэніроўцы, не так усебакова і падрабязна...

Не шкодзілі б рабоце і больш ясныя разважанні адносна матываў з'яўлення аўтаінсцэніроўкі. Бясспрэчна, у кожным выпадку яны свае. Розныя. І ўсё ж, тут ёсць нешта агульнае, што вымушае пісьменніка, часта нявопытнага ў драматургічным жанры, брацца за інсцэнізацыю ўласнага твора. Магчыма, адным з матываў з'яўляецца перакананне, што пераробка рамана ў інсцэніроўку — працэс, які часам дае зусім новае гучанне і нават скажае задуму аўтара.

І яшчэ. На старонках кнігі аж некалькі разоў сустракаеш у якасці своеасаблівага аргумента на карысць незалежнасці інсцэніроўкі ад росквіту ці заняпаду драмы рэпліку — «Хіба мала харошых п'ес...» Спачатку яна прыводзіцца ў выказванні аднаго з колішніх паслядоўных праціўнікаў інсцэнізацыі прозы, а пазней і даследчык сам ужо зусім катэгарычна (на месцы няўпэўненага шматкроп'я з'яўляецца клічнік) сцвярджае, што п'ес харошых нямала. У форме запытання гэтая фраза становіцца нават загалоўкам аднаго з раздзелаў кнігі. Наўрад ці такая канстатацыя факта (дарэчы, і тут выпадаюць перыяды, калі добрых п'ес... мала!) спрыяе навуковаму абгрунтаванню пэўных творчых пазіцый аўтара кнігі. Ёсць важкія падставы сумнявацца ў адпаведнасці такой заявы рэчаіснасці! Бо і сёння, як і ва ўсе часы, п'ес шмат. І харошых, і кепскіх. Бязлікая, шэрая, пасрэдная, а часта і бездапаможная драматургічная прадукцыя, здаецца, заўсёды была традыцыйным фонам, на якім не так ужо і часта ўспыхваюць зоркі па-сапраўднаму выдатных твораў...

Зрэшты, выказаныя намі заўвагі, якія ў асноўным звяліся да размовы аб тым, чаго няма ў даследаванні, не змяншаюць каштоўнасці таго, што ў ім ёсць. Што ж датычыць увогуле кнігі Ул. Халіпа, то яе з поўнай на тое падставай можна лічыць пасапраўднаму набыткам нашага сучаснага тэатразнаўства.

М. КАЛАДЗІНСКІ,
кандыдат мастацтвазнаўства.

Уладзімір Халіп. «Радок, прачытаны тэатрам». На рускай мове. Выдавецтва «Навука і тэхніка». 1973.

ЧАСОПІСЫ ў 1974 годзе

БЕЛАРУСЬ

Новы, 1974 год, крочыць па старонках першага нумара нашага часопіса, які знаходзіцца ў вытворчасці. Што ж, на нашу думку, прывабіць у ім чытача?

Па-першае, шырокая гаворка аб індустрыяльным поступе рэспублікі. Пад рубрыкай «Беларусь індустрыяльная» мы друкуем публіцыстычны матэрыял «Скарбы Салігорскіх шахт» пра гігант вялікай хіміі на Палескай зямлі, які ў красавіку 1975 года дасць краіне 40-мільённую тону «элексіру ўрадлівасці». Ужо сёння беларуская каліійная соль ідзе ў Расійскую Федэрацыю і на Украіну, яе атрымлівае Прыбалтыка, Грузія, Арменія... Пад рубрыкай «Беларусь індустрыяльная» мы надрукуем шэраг матэрыялаў, якія пакажуць новабудоўлі рэспублікі, дасягненні яе працаўнікоў. Гэта будуць падборкі пра такія прадпрыемствы, як Магілёўскі лаўсанавы камбінат, Бабруйскі шынны, Брэсцкі лямпавы, Мазырскі нафтавы, Полацкі хімкамбінат імя 50-годдзя БССР... Кожнае з гэтых прадпрыемстваў уносіць свой уклад у выкананне велічных планаў, што вызначаны Дырэктывамі XXIV з'езда КПСС.

Сярод публіцыстычных жанраў будуць шырока прадстаўлены выступленні вучоных і пісьменнікаў, журналістаў і інжынераў, настаўнікаў і партыйных работнікаў. Яны раскажуць аб дасягненнях і праблемах нашай прамысловасці, аб рабоце навукова-даследчых інстытутаў і іх сувязі з практыкай, пакажуць іх удзел у барацьбе за навукова-тэхнічны прагрэс у вытворчасці. Вось толькі некаторыя з іх.

Пастаянны аўтар часопіса кандыдат філасофскіх навук Ю. М. Манін падрыхтаваў артыкул «Імперыялізм і вайна», у якім расказвае пра міжнароднае становішча нашай краіны і абгрунтоўвае тэзіс аб магчымасці прадухілення вайны на сучасным гістарычным этапе. Аб важных народнагаспадарчых задачах, якія вырашае Інстытут праблем надзейнасці і даўгавечнасці машын АН БССР, вучоныя гэтага інстытута прадоўжаць гаворку, што распачаў кандыдат тэхнічных навук Алег Васільевіч Берастнеў у адзінаццатым нумары. Вучоныя інстытута — у настойлівым пошуку. Як вядома, зараз рамонт, эксплуатацыя і абслугоўванне станкоў каштуе ў 6 разоў даражэй, чым вытворчасць новых. Вось чаму партыя і ўрад паставілі задачу — падоўжыць тэрмін службы беларускіх станкоў і машын у паўтара і болей разоў. Задача вельмі важная і вырашэнне яе звязана з вельмі цікавымі пошукамі.

Навукова-тэхнічны прагрэс ставіць шмат праблем не толькі перад вучонымі-тэхнікамі, іх лабараторыямі, але і перад эканамістамі і сацыёлагамі. Што нясе навукова-тэхнічны прагрэс грамадству, як змяняецца ў новых умовах характар працы, сам чалавек, яго побыт, культурныя запатрабаванні? На гэтыя пытанні дае адказ артыкул вучонага і журналіста Уладзіміра Фаміна, які рыхтуецца да друку.

Камуністычнаму выхаванню моладзі будзе прысвечаны цэлы шэраг матэрыялаў, нарысаў і артыкулаў. Сярод іх — выступленні кіраўнікоў савецкіх і партыйных устаноў рэспублікі, і падборкі на тэмы прафесійнага і маральна-этычнага выхавання, і праблемныя выступленні вучоных сацыёлагаў, пісьменнікаў і журналістаў, настаўнікаў. Адзін з такіх артыкулаў — журналіста Я. Гарэліка — узнімае тэму патрыятычнага выхавання дзяцей у школе і сям'і. Надзённай тэме антырэлігійнага выхавання прысвечаны артыкул кандыдата філасофскіх навук Д. Мацяса «Гуманізм і рэлігія».

Шмат цікавага знойдзе наш чытач і пад такімі рубрыкамі, якія сталі ўжо традыцыйнымі— «Набыткі творчай думкі», «На вахце пяцігодкі», «Акно ў прыроду» і іншыя.

З найбольш цікавых нарысаў, што знаходзяцца ў рэдакцыйнай папцы, хочацца адзначыць нарыс Міхася Вышынскага «Вольгіна». Гэта — расказ пра вельмі цікавага чалавека Вольгу Віктараўну Жамойдзік, імя якой у Мазыры носіць адзін з мікрараёнаў горада. Рыхтуюць нарысы пра перадавікоў вытворчасці, знатных хлебаробаў, людзей творчай думкі, урачоў і настаўнікаў, дзеячоў культуры такія нашы журналісты і пісьменнікі, як Мікола Воранаў, Васіль Макарэвіч, Мікола Сергіевіч, Алесь Марціновіч, Павел Тормасаў, Іван Капыловіч...

Сярод літаратурных жанраў чытач знойдзе лепшыя творы беларускіх пісьменнікаў — апавяданні і навелы, вершы і аповесці, аднаактоўкі і ўрыўкі з буйнейшых празаічных твораў. Шмат увагі часопіс будзе аддаваць выхаванню літаратурнай моладзі. З новымі апавяданнямі выступяць празаікі Леанід Левановіч, Міхась Парахневіч, Аляксандр Капусцін, Мікола Воранаў, Міхась Вышынскі, Мікола Гроднеў. Рыхтуюцца да друку ўрыўкі з раманаў і аповесцей Івана Чыгрынава, Валянціна Мыслівца, Міколы Гамолкі.

Абяцае быць цікавай і паэтычная рубрыка часопіса. Дарэчы, за апошні час яна значна ўзбагацілася новымі імёнамі таленавітай моладзі. Пад рубрыкай «Упершыню ў «Беларусі» часопіс надрукаваў у свой час вершы Нэлы Тулупавай, Раісы Баравіковай, Алега Салтука. Падрыхтаваны да друку вершы Віктара Яраца, Льва Мароза і Любы Філімонавай.

Многія артыкулы і нарысы будуць прысвечаны лепшым дзеячам тэатра, выяўленчага мастацтва, кампазітарам, работнікам кіно і тэлебачання. Значнае месца мы адводзім пытанням літаратурна-мастацкай крытыкі. Тут і агляды навінак літаратуры, і рэцэнзіі на новыя кнігі, і водгукі чытачоў. Сярод іх артыкулы «Аб музыцы беларускага кіно» І. Нісневіча і «Спектакль пачынаецца з п'есы» А. Сабалеўскага і іншыя.

Мы спадзяемся, што нашага чытача зацікавіць і такая рубрыка, як «Успаміны, дзённікі, дакументы». Адзін з першых тут выступіць народны паэт рэспублікі, Герой Сацыялістычнай Працы Пятрусь Броўка з успамінамі пра выдатнага беларускага паэта Пятра Фёдаравіча Глебку. Кандыдат філасофскіх навук Іван Шпадарук падрыхтаваў артыкул «Пісьмы ішлі на Беларусь», які прысвечаны перапісцы Фёдара Дастаеўскага з беларусамі.

З нумара ў нумар часопіс будзе змяшчаць старонку для «Дома, сям'і, быту», парады ўрачоў, педагогаў, паказваць лепшыя моды сезона, даваць месца сатырыкам і гумарыстам. Часопіс будзе імкнуцца задавальняць патрэбы самага шырокага кола чытачоў, быць грамадска-палітычным і літаратурна-мастацкім выданнем для ўсіх. У гэтым напрамку працуе ўвесь калектыў рэдакцыі, наша рэдкалегія, наш аўтарскі актыў.

Георгій ШЫЛОВІЧ,
адказны сакратар часопіса «Беларусь».

ХАРАКТАРЫ ЦІ ШТРЫХІ ДА ІХ?

ПЕРШЫЯ апавяданні Клары Пішчыкавай з'явіліся ў перыёдыцы некалькі гадоў назад, калі яна была членам літаратурнага аб'яднання «Гарызонт» пры рэдакцыі рэспубліканскай маладзёжнай газеты «Чырвоная змена». І вось ужо кніга — «Адраджэнне», у якую ўвайшла аднайменная аповесць і тры апавяданні.

У невялікай выдавецкай анатацыі ёсць сцвярджэнне, якое адразу прымушае ўважліва прачытаць кнігу. «Апавяданні напісаны на матэрыяле з жыцця маладых сучаснікаў, якія робяць першыя самастойныя крокі, шукаюць, памыляюцца, адольваюць свае слабасці, адным словам — **вучацца жыць»** (падкрэслена мною — **А. М.**)

Жыццё... Наўрад, ці знойдзецца такі чалавек, які катэгарычна заявіць, што ён ведае яго дасканала, што аніякія праблемы яго ўжо не цікавяць, дакладней, маўляў, іх наогул для яго няма. Усе мы вучымся жыць. У маленстве, у гады юнацтва і тады, калі прыходзіць першае каханне, і калі пасля некалькіх гадоў сямейнага шчасця прыходзіць у дом разлука.

Знаёмыя сюжэтныя хады напоўнены новым жыццёвым матэрыялам. К. Пішчыкава ўмее са шматлікіх назіранняў выбраць тое істотнае і важнае, што не проста дапамагае раскрыццю ідэйнай задумы, але і ў пэўнай ступені характарызуе аўтарскія адносіны да ўчынкаў герояў. Пазіцыя пісьменніцы ў апавяданні дакладна выражана, яна маральна апраўдана ўсім ходам разгортвання падзей.

Аўтар пагаджаецца са сваёй гераіняй, жанчынай чыстай, бескампраміснай, і ў той жа час надзвычай адкрытай, даверлівай, гатовай любымі сродкамі абараніць сваё каханне, гэткае ж чыстае, як і яна сама. Праўда, яна была рэзкай у адносінах да мужа, калі не паверыла яму, хоць не верыць не было падстаў. Цяпер яна гатова пайсці на прымірэнне: «Я хутка адвяду Волечку ў сад і пайду да цябе. Я не буду ні пра што пытацца, бо я табе не суддзя — я твой абаронца».

Звычайная гісторыя аб каханні, але за гэтай звычайнасцю, здавалася б, будзённасцю, няпросты свет нашых сучаснікаў, свае маральныя праблемы, якія абавязкова патрэбна вырашыць. Іх аўтар не толькі ставіць, яна імкнецца разабрацца ва ўсёй складанасці чалавечых пачуццяў, рашыць нялёгкую алгебраічную задачу людскіх узаемаадносін. Магчыма, чытач у нечым з героямі не пагодзіцца, але ён не застанецца абыякавым да іхніх лёсаў. А гэта выдатна — убачыць у чытачу субяседніка, выклікаць яго на размову. Мажліва, адсюль і пачынаецца першы, няхай і маленькі, крок да пісьменніцкага майстэрства.

...«Пабыць з морам самнасам, пастаяць, памарыць,— я штодня думала гэта, як толькі прыехала сюды. Але ўсё не выпадала. Вось і сёння — шторм, а нейкі дзівак ходзіць і каменьчыкі ў хвалі кідае. І як весела ён гэта робіць!» — так пачынаецца апавяданне «Міколка-Д'ябал». Але расказ пойдзе не аб курортным каханні. Проста сустракаюцца сябры маленства, цяжкага, ваеннага. Яно многіх адразу зрабіла дарослымі. Цэлае пакаленне, не пазнаўшы радасці дзяцінства, пераступіла яго парог.

«Я запомніла цётку Соню ў летнім стэпе».

«...На ўсё жыццё мне запомнілася адна ноч...»

«Я добра памятаю, што рабілася ў той дзень».

Успаміны, успаміны... А за імі не дзіцячыя забаўкі (не да іх было ў вайну), а хуткае сталенне падлеткаў, фарміраванне іхніх характараў. К. Пішчыкава вяртае чытача да тых далёкіх гадоў «не ради праздного любопытства». Зусім не. Вяртанне тут іншага плана, хутчэй за ўсё маральнага. Маленства — гэта той чысты свет даверу і шчырасці, якіх так не хапае часам нам, дарослым. Таму гэта не проста ўспаміны аб перажытым, а імкненне прасачыць той нялёгкі працэс маральнай ломкі ў кожным з нас, які прыводзіць у дарослых да празмернай рацыянальнасці, і што яшчэ горш — да нейкай халоднасці, калі мы нават з блізкімі баімся паказацца слабымі, даверыцца ім, падзяліцца сваімі перажываннямі, сумненнямі.

Гэты бесклапотны свет маленства (як гэта не гучыць у дачыненні да вайны) ўвасоблены ў вобразе Міколкі, якога ўсе за нялёгкі, не пакладзісты характар празвалі Д'яблам. Ёсць над чым падумаць, калі прачытаеш апавяданне. Гэтыя два творы — безумоўная ўдача маладога аўтара.

Аднак, як не шкада, добрыя намеры К. Пішчыкавай расказаць аб нашым сучасніку, яго працы, адпачынку, каханні часта застаюцца не ажыццёўленымі. Прычына тут адна: кніжнасць, няўменне пайсці далей зададзенай схемы. Гэта назіраецца ў апавяданні «Сын», але найбольш характэрна для аповесці «Адраджэнне».

«Адраджэнне» — гэта расказ аб пасляваенным жыцці горада. У апошнюю ваенную вясну вяртаецца ў Мінск былы архітэктар, а цяпер падпалкоўнік Барыс Рагоўскі. Нялёгкае гэтае вяртанне да мірнага жыцця. Разбураны дом, у якім жыў, ды і ўвесь горад у руінах ляжыць, у засценках гестапа загінула жонка-падпольшчыца. А сын Жэнька, якога пакінуў зусім маленькім, калі пайшоў на фронт, жыве ў Дашы, якую ён колісь кахаў. І Барыс хоча паехаць да яе, ажаніцца. Толькі інакш думае Даша, якая не можа забыць свайго першага мужа.

Вось у некалькіх словах сюжэт гэтай невялікай аповесці. Першыя старонкі, дзе расказваецца аб пасляваенным жыцці, напісаны праўдзіва, пераканаўча. Але чым далей чытаеш твор, тым больш пераконваешся, што пачуццё меры, той мастацкай праўдзівасці, без якой наогул не можа быць літаратуры, адыходзіць на задні план. Паступова К. Пішчыкава ператварае аповесць у меладраму, а сапраўдныя пачуцці герояў у сентыментальшчыну.

Псіхалагічна не матывіраваны ўчынкі галоўнай гераіні, жанчыны ўвогуле цікавай і адукаванай. Калі яе адносіны да Барыса (любіць яго сына і не любіць бацьку гэтага сына), можна растлумачыць вернасцю былому мужу, то чым апраўдаць тое, што яна раптоўна выходзіць замуж за скульптара Алеся, якога ведала толькі некалькі дзён. Аўтарскі каментарый мала прасвятляе сітуацыю: «Але, застаўшыся адна, Даша раптам пачынала адчуваць трывогу. І тады абуралася сэрца: «Адкуль гэтая трывога? Чаму я не маю права на звычайнае чалавечае шчасце?» Розум адказваў: «Права маюць усе, толькі шчасце — рэдкі госць».

Значна пазней чытач даведаецца, што Алесь кахае сяброўку Дашы. Сын, які нарадзіўся ў Элы, таксама ад яго. А муж апошняй, амаль сляпы лётчык, былы ваенны, аб усім гэтым нават і не здагадваецца. У такім лабірынце палкага «кахання» цяжка разабрацца.

Праўда, Барыс да ўсіх гэтых любоўных гісторый аніякага дачынення не мае. Ды і Даша, зрэшты, хоць калінікалі і памыляецца ў людзях, па-ранейшаму верыць у сапраўднае шчасце.

Лепш расказана аб тым перыядзе, калі гераіня паказана на пасадзе сакратара райкома партыі. Шкада толькі, што аўтар аніяк не тлумачыць падобнае абранне на такую высокую пасаду. Што Даша цудоўны чалавек, чытач гэтаму верыць. Але вось на працы гераіня амаль не паказана. Праўда, на пасадзе сакратара яна становіцца больш актыўнай. Але, думаецца, К. Пішчыкава зрабіла вялікае ўпушчэнне, што слаба раскрыла характар сваёй гераіні, характар, безумоўна, няпросты, нават шмат у чым супярэчлівы.

Ёсць у Дашы і ўнутраная чысціня, прыгажосць, а вось грамадзянская актыўнасць калі-нікалі праяўляецца толькі на словах аўтара. Ды і большасць сітуацый, якія прыведзены ў аповесці, вельмі ж ужо трафарэтныя. Праўда, месцамі дзеянне развіваецца напружана, цікава. Але адно ўменне будаваць сюжэт яшчэ не можа даць твору поспех, калі пазіцыя аўтара да канца не акрэслена. Менавіта гэты недахоп і назіраецца ў аповесці. Між тым варта нагадаць словы В. Каверына: «Кожная кніга — гэта ўчынак. І каб ён адбыўся, пісьменнік, калі садзіцца за пісьмовы стол, павінен памятаць, што па другі бок стала сядзіць чытач з яго накіраваным, уважлівым, строгім позіркам».

Аповесць «Адраджэнне» з прыватных, агульных разваг аб днях мінулых і сённяшніх не ператварылася ў дакумент грамадскі. Яна, па сутнасці, толькі першая заяўка аўтара ў вялікім жанры, якая патрабуе свайго пацвярджэння лепшымі творамі.

Асобна хочацца сказаць аб мове твораў. Як не прыкра, але ў кнізе шмат стылістычных пагрэшнасцей, звычайнай неахайнасці.

У творчыя магчымасці Клары Пішчыкавай верыцца. Ёсць упэўненасць, што яе наступныя кнігі (а яны, вядома, з'явяцца) прынясуць чытачам задавальненне.

Алесь МАРЦІНОВІЧ.

К. Пішчыкава. «Адраджэнне». Апавяданні і аповесць. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1973.

Іон ДРУЦЭ

РАЗМОВА ПРА НАДВОР'Е

АПАВЯДАННЕ

Яна прыехала ўначы, гадзіны ў тры. Хацела ціхутка адчыніць дзверы, але дзверы былі замкнёны. Падышла да акна, пастукала колькі разоў—ніхто не азваўся. Счакала крышку і паклікала дзіцячым, пакрыўджаным голасам:

— Тата!

Дзіва нейкае. За ўсе чатыры гады, з тае пары, як пачала прыязджаць да бацькоў у госці, яна ніколі не стукала ў акно. Бацька яе чакаў заўсёды. Спаў ён вельмі чуйным, заечым сном. Ён пазнаваў яе па тым, як яна адчыняе фортку, пазнаваў па кроках, і, калі б яна ні прыязджала, дзверы былі ўжо расчынены насцеж, на парозе стаяў бацька з усмешкаю на твары і кідаў свой стары і бяскрыўдны жарт:

— Сама адшукала хату ці людзі добрыя паказалі?

Дзяўчына яшчэ раз пастукала, яшчэ раз гукнула бацьку, але Ікіма ніяк нельга было дабудзіць. Аніка, ягоная жонка, крыкнула з цемры:

— Ікім, чуеш, Ікім?

У хаце цішыня. Занепакоеная Аніка саскочыла са свайго ложка і падышла да драўлянай лавы ў куце, на якой з вечара прылёг быў Ікім. Ён ляжаў на спіне з шырока расплюшчанымі вачмі і ціха перабіраў зубамі тую ж былінку, з якою яшчэ ўчора вярнуўся з каменяломні.

— Чуеш мяне, Ікім?

Былінка задумліва пахіснулася, але Ікім, здавалася, нічога не чуў. Аніка глыбока ўздыхнула, выйшла ў сенцы і адамкнула дзверы. Цяжкае дзявочае дыханне і прыемны пах парфумы адразу напоўнілі святліцу. Дзва вялізныя чамаданы, з якімі калісьці паехала яна з дому, усчалі ў цемрыве сваркy са сталом і крэсламі. У двух словах дзяўчына выказала ўсю сваю радасць, усю сваю гаркоту, усе свае надзеі:

— Добры вечар!

Адказала толькі маці:

— Добры.

Абедзве замаўчалі, з апаскаю пазіраючы ў кут, дзе ляжаў Ікім і перабіраў зубамі былінку. Дужа доўга цягнулася гэтае маўчанне, потым яно зрабілася нават пакутлівае. Дзяўчына ўсхліпнула, узяла свае чамаданы і падалася ўжо да тых дзвярэй, праз якія зайшла ў хату. І тут ужо нябога Аніка не вытрымала, сказала цёплым ласкавым тонам:

— Ідзі ў той пакой і паляжы. Дай я адняму куфры гэтыя.

Рынула лава, але яны харобра кінуліся ў цемру і, шчасліва праскочыўшы міма старога, апінулі ў суседнім пакойчыку. А праз хвіліну адтуль пачуўся ціхі шэпт:

— Не будзе табе холадна пад адной коўдрай?

— Не.

— Дзве падушкі пакласці ці адну?

— Адну.

Дачка распранулася і лягла. Маці ж, ступаючы на дыбачках, вярнулася ў свой пакой і спынілася ля ложка. Праз паўгадзіны, калі з-за сцяны далятела спакойнае дыханне чалавека, які заснуў пасля цяжкай дарогі, Аніка прашаптала:

— Ікім.

Доўга і марна чакала адказу. Потым лягла. Сказала прымірэнча, нібыта хацела, нарэшце, скончыць доўгую і непрыемную гаворку:

— Усё пройдзе, усё забудзецца, Ікім...

Вымавіла вельмі сардэчна і пераканальна, аднак, нягледзячы на гэтую пераканальнасць, пражыла з расплюшчанымі вачмі да самае раніцы, памагаючы мужу ў яго горкай і цяжкай рупнасці. Яна прыслухоўвалася да дочынага сну, прыслухоўвалася да рыпення лавы і ціха малілася, каб хутчай настаў дзень, таму што ўдзень і думкі больш светлыя, і сам чалавек робіцца лепшы.

На досвітку Ікім падняўся і выйшаў на вуліцу. У парозе выплюнуў рэшткі былінкі. Надыходзіла нядзеля, спраў у яго ніякіх не было, але ў яго была ўжо такая завядзёнка—на золку выходзіць на вуліцу. Ранічкаю яго заўсёды адольвалі страшэнныя прыступы кашлю, і ён выносіў іх на вуліцу, каб не турбаваць хатніх.

Прысеў на вялізнай каменнай глыбе, якая калісьці была скінута ля грушы і цяпер служыла замест услона. Мужна перанёс пакутлівы кашаль старога курца, потым, нібы насуперак яму, зноў закурыў. Высокі, з цяжкім, вуглаватым, быццам сякераю сэкданым ілбом, ён доўга і моўчкі курыў, пакуль не ўзышло сонейка. Паглядзеў, як і адкуль яно ўзыходзіць, прыкінуў, колькі яму за дзень трэба прайсці. Абцасам прытушыў недакурак, сеў больш зручна, апусціў галаву і стаў чакаць. Асноўныя варожыя сілы павінны былі наступаць у двух накірунках, і Ікім час ад часу скоса паглядаў то ў бок хаты, то ў бок форткі.

Хоць дачка і вярнулася позняй ноччу, вёска тым не менш нейкім цудам дазналася пра гэтую навіну. Не паспела яшчэ сысці раса, як Ікімава фортка ўжо рыпнула. Бадзёры жаночы голас, голас, які, здавалася, нясе радасць і шчасце гэтай хаце, запаланіў увесь двор, нават суседнія двары:

— Ты што парабляеш, Ікім?

Мажная, дужая кабеціна з чырвонымі шчокамі ваяўнічаю хадою кіравала да Ікіма і, здавалася, гатова была любой цаной вырваць у яго адказ на сваё дзяжурнае пытанне: што ён парабляе?

— Сяджу, хіба не бачыш?

— Дазволь і мне пасядзець.

Ікім неахвотна адсунуўся, даючы ёй месца, і палова каменнай глыбы тут жа знікла пад яе шырокай квяцістай спадніцай. Іяана даводзілася яму стрыечнай сястрой; дарэчы, стрыечнай сястрой яна даводзілася добрай палове гэтай вёскі. Вясёлая, бесклапотная, гэтая кабета вельмі любіла сваіх родзічаў і наведвала іх толькі тады, калі з імі здараліся якія-небудзь непрыемнасці. Апошні раз яна была ў Ікіма гадоў дзесяць назад, калі ў коміне загарэлася сажа і ледзь не занялася страха. І вось яна зноў у гасцях. Села, ветліва ўсміхаючыся, акінула вокам увесь двор, усю гаспадарку. Не ўсё прыйшлося ёй да спадобы, не ўсё яе радавала, але Ікім быў же сваяк, і яна прашаптала, нібыта гаворка ішла пра тое, што было вядома толькі ім адным:

— Кажуць, кінула інстытут?

Ікім быў чалавек цярплівы. За дзесяць гадоў працы на каменяломні, крышачы вялізныя глыбы і здабываючы камене для калгаса, ён стаў яшчэ больш скупы на словы. Ён мог гадзінамі сядзець моўчкі ў якім-небудзь зацішным кутку і прымаць у жыццё ўсё як ёсць. Але бесклапотны шэпт стрыечнай сястры—гэта было ўжо занадта. Цяжкі і вуглаваты лоб яго зрабіўся пунсовы. Ікім знарок адказаў гучным голасам, як бы падкрэсліўшы гэтым, што не мае ніякага жадання падтрымліваць прапанаваную інтымнасць:

— Так, кажуць, кінула...

Памаўчаўшы яшчэ колькі часу, і Іяана вырашыла выправіць першую памылку другой.

— Вось чортава дзяўчо... Яшчэ ў якіх гады два, і стала б дахторкаю, дык жа не... Што ты цяпер будзеш з ёю рабіць?

— Скажу жонцы, каб пакарміла, мусіць жа, галодная прыйшла.

— Гэта ўжо, вядома...

Адказала толькі тоўстая ў хату, то з хаты, крайком вуха пачула, што гаворка ідзе пра ежу, і зараз жа вынесла поўную талерку яшчэ цёплых дранікаў. Яна добра ведала, калі ў Ікіма ёсць апетыт, калі і наколькі ён прападае, але на гэты раз стары дужа доўга нічога не еў. Вынесла, паставіла талерку ля каменнай глыбы.

— І для мяне напякла?

Іяана сваёй ухмылкай як бы прасіла Аніку, каб тая сказала: так, і для яе напякла, але Аніка была жанчына сумленная

— Сказаць, што менавіта для вас я іх пякла, не магу, але калі іншы вам спадабаюцца.

— Ну што ж, з'ем крыху...

Ікім нават не заўважаў тых дранікаў, не чуў, як іх на ўсе лады хваліла Іяана. Усё сядзеў з апушчанай галавой і паглядаў скоса то на дзверы, то на фортку,—злаваў, што дачка гэтак доўга спіць. Была нядзеля светлы сонечны дзень, а ў яго—столькі сваякоў у гэтай вёсцы і гэтак усім хацелася прыйсці, паслухаць, як ён будзе лаяць сваю дачку.

— Тата! Ай-ай-яй!..

Напрастві, цераз сад, у мокрых ад раніцішняй расы штанах, ішоў яго сын Міхуцэ,—ішоў шпарка, распаўсюджваючы па ўсім наваколлі пах конскага поту: гадоў з чатырнаццаці робячы ў калгасе конюхам, ён на ўсё жыццё пераняў гэты пах. Праўда, гэта яго зусім не турбавала. У Міхуцэ была поўная хата дзяцей, бясконцыя даўгі па ўсёй вёсцы, але ён не бедаваў; з кожным годам малых усё прыбывала, даўгі раслі, сам жа ён заўсёды быў у гуморы.

— Значыць, тата, у вас госці... Хіба ж цяжка вам было гукнуць роднага сына, запрасіць яго на чарку?..

Паколькі на гэты раз Ікіму было не да гумару, выручыла яго тая ж Іяана:

— А ён і не сумняваўся, што завітаеш.

— Як жа не завітаць, калі госці...

Міхуцэ сеў на траву, наказаўшы сонцу, наколькі гэта будзе магчыма, падсушыць ягоныя штаны. Іяана пацікавілася:

— Як там маюцца твае малыя, Міхуцэ? Колькі ўжо іх у цябе?

— А бог іх ведае—ці то сем, ці то восем... Трэба ў жонкі спытаць, яна займаецца ў мяне гэтым улікам.

— А як наконт даўгоў?—не спынялася Іяана.

— Даўгі—глупства,—махнуў рукой Міхуцэ. —Дадуць у калгасе дзве прэміі запар, і даўгоў як не было... Трэба толькі, каб запар...

Яны доўга яшчэ гутарылі пра тое, пра сёе, але Ікім не вымавіў ні слова,—відаць, не прыслухоўваўся да іхняе гаворкі. Па-ранейшаму сядзеў з апушчанай галавой, зрэдку паглядаў на фортку, на хату, а потым пачаў кідаць вокам і ў бок саду. Ён выбудаваў хаты побач усім дзецям сваім, і хадзілі яны да яго напрасткі, цераз сад, кожны сваёй сцяжынкай. Міхуцэ ўжо сваёй прайшоў, асталіся яшчэ дзве. Раптам з глыбіні саду, з-за арэшніку, далятела:

— Ты куды, да бацькі?

— Да яго.

— Пачакай, і я з табою.

І вось дзве ягоныя дачкі заспяшаліся да каменнай глыбы. Старэйшая, Марына, вяла за руку трохгадовага хлопчыка, улюбёнца і пестуна малодшай Ікімавай дачкі, якая ўсё ніяк не магла прачнуцца. Другая, Зіна, смуглявая, невысокая, ішла хуценька і мякка, быццам плыла над зямлёю; яна трывожна паглядзела ў бок бацькавай хаціны—страшэнна не любіла сварак і рабіла ўсё, каб толькі пазбегнуць іх. Мусіць, ёй здалося, што сварка ў поўным разгары, таму хуценька падышла, прывіталася, тут жа села ля талеркі з дранікамі і пачала іх аплятаць.

— Колькі год ужо мінула, як пайшла я замуж, а матчына ежа мне падабаецца больш за сваю. Праўду кажу.

Іяана і гэта сустрэла ўсмешкаю.

— Нічога, адвыкнеш.

— Наўрад ці змагу...

Падышла Марына са сваім сынам. Хлопчык быў акуратна, нават прыгожа апрануты—ягоны бацька працаваў прадаўцом у сельмагу, і Іяана, натуральна, не магла, каб не пагаварыць з малым.

— Дзе гэта табе гарнітурчык купілі?

Хлопчык соп, касавурыў на талерку. Ікім моўчкі ўзяў два дранікі, адзін даў малому, а другі—Марыне. Хлапчанё моўчкі стала есці, а Марына адмовілася, паклала дранік зноў на талерку.

Іяана ўгледзела ў гэтым зачэпку для вялікай гаворкі.

— Няшчасны бацька—адзін просіць, а яму няма дзе ўзяць, другому дае, а той не хоча браць...

Міхуцэ не бачыў у гэтым вялікага няшчасця:

— Не бяда, няхай дзеліць. У старога ўсяго хапае ўводзю... Узяць хоць бы сабе каменне... Вядома, крышыць іх цяжка, аднак жа і капейка ідзе...

— Чаго ж ты не пойдзеш тады?—пацікавілася Марына.

— Я не выношу выбухаў. У мяне вочы самі па сабе заплюшчваюцца, калі чую выбух...

Кажуць, пагодны дзень можна пазнаць па ўсходу сонца, але гэта не заўсёды так, Хоць сонца ў тую раніцу ўзыходзіла ясная і чыстае, але гадзінаю пазней раптам падзьмуў моцны вецер і пагнаў перад сабою вялізныя чорныя хмары, якія неўзабаве зліліся на вёскаю ў суцэльную змрочна-шэрую жудасць. Ад аднаго яе выгляду стала неяк не па сабе. Міхуцэ абняў свае мокрыя калені, Зіна накінула хустку, Марына знайшла сабе зацішны куточак. Толькі Ікім не зварухнуўся—сядзеў з апушчанай галавой, здавалася яму, каменялому, усе гэтыя страхі нябесныя хоць бы што.

Аніка пабегла да суседкі і праз хвіліну вярнулася з люстраркам—суседка гэтак прывыкла да іх люстэрка, што ўжо гадоў пяць запар карысталася ім.

Пасядзелі моўчкі, далі ёй магчымасць памыцца, потым яшчэ крыху памаўчалі, далі ёй заплесці косы. Ужо, здавалася, і пара было б ёй выйсці, а яе ўсё не было, яны па-ранейшаму сядзелі пад грушаю і маўчалі. Па дарозе ішлі людзі—чамусьці яны аблюбавалі сёння менавіта гэтую вулачку: ішлі нават тыя, якія да гэтага ні разу ў жыцці не хадзілі па ёй. Ля Ікімавых варот сціпалі хаду і былі такія ветлівыя, што нават віталіся. Гэтае бясконцае «добрай раніцы» гучала прыкладна так: «Ну, Ікім, што ж ты будзеш далей рабіць?.. Выгадаваў, выкармліў гэткую сямейку, а вось малодшая ўзяла ды падвяла...»

Усім вяскоўцам адказвала Іяана. Яе вясёлы, бойкі голас нібыта казаў ім: «Вы не турбуйцеся, ідзіце сваёй дарогаю, а мы тут самі як-небудзь уладкуем свае справы... Вунь колькі нас сабралася!» Пасля кожнага такога адказу яна кідала на Ікіма пераможны позірк: маўляў, бачыш, якія паслугі я табе аказваю? Аднак Ікім не заўважаў ні яе паслуг, ні яе самой.

— Добрага ранку!

Стройная і прыгожая, у моднай шарсцяной кофтачцы, у туфліках на высокіх абцасах, яна ішла лёгка, як быццам ёй нічога не варта было вось гэтак узяць ды і пайсці куды захочацца. За ёю тупала Аніка і не дыхала ад шчасця, гора і страху— усё ў ёй неяк дзіўна змяшалася, і яна вачмі прасіла, каб з гэтай паненкай усе былі як мага больш ветлівыя, таму што любая крыўда болем адгукнецца перш за ўсё ў яе, Анікі, сэрцы. А яна ўжо старая, ужо аджыла сваё, і не трэба было б яе крыўдзіць.

Старэйшыя сёстры і нават сама Іяана міжвольна залюбаваліся дзяўчынай. Ікім, не ўзнімаючы галавы, адказаў гучным голасам за ўсіх:

— Добрага ранку!

Потым выпрастаўся і кінуў на яе строгі пагляд. Нічога не скажаш—прыгожая. Тут, у вёсцы, дзе гэтак багата працы і клопату, дзе столькі сонца, столькі дажджоў, яна ніколі б не стала такая прыгожая.

— Аніка, прынясі ёй крэсла.

Дзяўчына прысела на краёчак, нясмела зірнула на пунсовы, вуглаваты лоб, і ўся яе смеласць, з такою цяжкасцю сабраная, разляцелася ў пыл. Сэндуцэ, як ўлюбёнец, падышоў, прытуліўся да грудзей, штосьці прашаптаў, але яна нічога не чула. Апусціла галаву і ў адказ на ўсе ціхія запытанні хлопчыка толькі гладзіла яго па валасах.

Ікім пачаў рассоўваць свае вялізныя рукі па кішэнях, але ці то далоні былі празмерна шырокія, ці то кішэні занадта малыя — яму гэта ніяк не ўдавалася. Ён злаваў на сябе, злаваў на рукі, злаваў на кішэні; усіх адразу зацікавіла гэтая важданіна з рукамі, і ўсе пачалі сачыць, мяркуючы ў думках, чым усё гэта скончыцца. У Ікіма былі нейкія дзівотныя і непрыгожыя рукі: тоўстыя, валасатыя, са старымі і новымі ранамі, з пазногцямі, якія раслі ва ўсе бакі, адным словам, рукі старога каменялома, і ўся вёска заўсёды з вялікай асалодай разглядала іх. Ікіму гэта не вельмі падабалася, ён стараўся трымаць свае рукі як мага далей ад людской цікаўнасці, і калі вакол збіраўся дужа вялікі натоўп, ён перш-наперш хаваў іх куды-небудзь. Так-сяк ён-такі засунуў іх у кішэні, але, разважыўшы, выцягнуў назад, паклаў на калені—няхай адпачываюць, няхай грэюць на сонейку свае раны.

Так, гэта былі яны, шматпакутныя, працавітыя рукі Ікіма Вэкару. Што зробіш, калі яны не вельмі прыгожыя. Затое гэтыя рукі, такія, якімі вы іх бачыце, выкармілі, выхавалі вялікую сям'ю. Колькі дарог, колькі школ, колькі дамоў пабудавана з камення, здабытага гэтымі рукамі! Нават паненка са сваёй красой, шыкоўнай кофтачкай і з туфлікамі на высокіх абцасах—усё гэта здабытак ягоных рук, за ўсё яны заплацілі сваёй крывёй, сваім потам, сваімі бясконцымі ранамі.

— Няшчасны бацька...

Міхуцэ быў шчыра крануты. Ён хацеў адразу распачаць гарачую размову, але Ікім неяк дзіўна зірнуў на яго з-пад брывей, і той адразу змоўк. Вецер супакоіўся, вялізная змрочная хмара пачала апускацца на вёску,—здавалася, вось-вось абрынецца яна на саламяныя стрэхі.

Сядзелі ціха, кожны быў заняты сваімі думкамі.

Урэшце Марына не стрымалася, спытала:

— Ну, тата, што ж ты мне цяпер скажаш?

Вышлыя старчыя вочы Анікі замерлі. Дзяўчына ў шыкоўнай кофтачцы пачала нервова кудлаціць галаву Сэндуцэ, нібыта баялася, што той вось-вось заплача. Трое ці чацвёра аднавяскоўцаў, якія ішлі вуліцаю, пажадалі добрай раніцы, але ім ніхто не адказаў. Раптам вуглаваты Ікімаў лоб перарэзалі глыбокія зморшчыны; чалавек кінуў некаму востры халодны позірк, спытаў рэзка і злосна:

— А што мне казаць?

Нябога Зіна—яна страшэнна не любіла сварак, —каб неяк выратаваць становішча, хуценька спытала:

— Як ты лічыш, тата, будзе дождж?

У адно імгненне гэта ўсіх надзвычай зацікавіла, здавалася, усім трэба было неадкладна даведацца, будзе дождж ці не, і стары быў той адзіны чалавек, ва ўладзе якога знаходзіўся лёс надвор'я. Быццам бы толькі ён рашаў—быць дажджу ці не быць.

— Дождж будзе,—адрэзаў Ікім.

Гэта нікому не спадабалася, аднак стары вымавіў словы з такою ўпэўненасцю, што нават ніхто і спробы не зрабіў пераканаць яго ў адваротным.

Памаўчалі. Марына нечакана глыбока ўздыхнула:

— Калі мяняецца надвор'е, у мяне страшэнна баляць ногі. Усё гэта лета пакутавала, праўду кажу, усё лета хадзіла, як калека.

Ікім параіў:

— Спірытусам нацерці трэба. Памагае.

Марына горка ўсміхнулася:

— Тата, ды я ўсю скуру спаліла спірытусам, а якая карысць?

Аніка таксама цяжка ўздыхнула:

— Няшчасная мая дачушка... Як жа гэта ты так?

Іяана спаўзла з каменнае глыбы, падышла, памацала Марыніны ногі. Сказала спецыяльна для Ікіма:

— У яе жудасны раматус.

Ікім, здавалася, не чуў, але праз нейкі час кінуў:

— Нічога, яшчэ будзе.

Зіна, якая безуважна ставілася да размовы пра раматус, раптам выгукнула:

— Тата, ды пакінь ты свой дождж! Мой Андрэй пачаў перакрываць гумно... Уяўляеш, што будзе, калі ліне як з вядра?

Нябога Аніка вырашыла заступіцца:

— Ікім, трэба ім перакрыць гумно.

Іяана дадала:

— Калі пойдзе дождж—развалюцца.

— Будзе дождж,—паўтарыў Ікім. Потым, памаўчаўшы, параіў дачцэ:

— Ты перадай Андрэю, няхай не ўсё адразу агаляе. Спачатку трэба адзін бок перакрыць, пасля другі.

(Заканчэнне на 14 стар.)

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

Мікалаю АЛЯКСЕЕВУ — 75

17 снежня вядомаму празаіку Мікалаю Аляксееву спаўняецца 75 год. З гэтай нагоды прадленне Саюза пісьменнікаў рэспублікі накіравала юбіляру прывітанне. У якім гаворыцца:

«Дарагі Мікалай Іванавіч!

Шчыра, ад усяго сэрца віншуем Вас з слаўным 75-гадовым юбілеем.

Вы рана спазналі крутыя дарогі жыцця, прымалі непасрэдны ўдзел у Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Потым свой лёс надоўга звязалі з арміяй. Сорак гадоў Вы аддалі служэнню Савецкай Арміі, прайшоўшы шлях ад салдата да генерал-маёра інжынерных войск. Вы ветэран некалькіх войнаў: у грамадзянскую змагаліся з інтэрвентамі на Карэльскім фронце, потым з белапалякамі на Беларусі, з японцамі на Хасане і з фашыстамі ў час Вялікай Айчыннай вайны.

У літаратуру Вы прыйшлі з вялікім набыткам бачнанага і перажытага. Спачатку выступілі ў армейскім друку з нарысамі, а пазней чытачы атрымалі Вашы раманы «Яков Железнов», «Испытание», «По зову сердца» і некалькі аповесцей. У сваіх творах Вы стварылі цікавыя вобразы і характары савецкіх воінаў і афіцэраў, паказалі іх мужную барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, прасачылі вытокі гераізму савецкага народа ў час Вялікай Айчыннай вайны.

Вашаму пяру належыць кніга «Навстречу победе», напісаная ў саўтарстве, а таксама п'еса «Сестра Варвара».

Нам прыемна адзначыць, што Вы шмат сіл і ўвагі аддаяце работе Камісіі па ваенна-мастацкай літаратуры СП БССР, вядзеце вялікую шэфскую работу ў воінскіх часцях Беларускай ваеннай акругі, актыўна ўдзельнічаеце ва ўсіх іншых мерапрыемствах сваёй творчай арганізацыі.

Жадаем Вам, дарагі Мікалай Іванавіч, новых літаратурных здабыткаў, добрага здароўя, доўгіх год жыцця, шчасця!»

ДАЛЯГЛЯДЫ ЯГО ЖЫЦЦЯ

Першае, што радасна здзіўляе пры сустрэчы і знаёмстве з ім—гэта далечыня яго жыцця, светлая, прыгожая, хоць і трывожная далечыня.

...Неяк спаткаўшыся з ім каля Акадэміі навук і пачаўшы гаворку аб праблемах вядомага цяпер Інстытута фізікі, адкуль мы толькі што выйшлі, я падумаў: «Божухна! Гэта ж чалавек, які гутарыць зараз са мной пра ядзерныя даследаванні, бачыў і ведаў яшчэ дарэвалюцыйны Пецярбург!» І пачалі прыгадвацца факты з яго біяграфіі—тыя, якія я ведаў.

Асірацелым хлапчуком бегаў па напышлівых вуліцах сталіцы Расійскай імперыі: юнаком, вывучыўшыся на электраманцёра, працаваў на трыкатажнай фабрыцы «Керстэн» і Абухаўскім заводзе; прачытаўшы першыя марксісцкія книжкі, стаў наведваць рабочыя сходкі...

Неяк, убачыўшы яго ў святочны дзень на трыбуне ў генеральскай форме, падцягнутага і стройнага—ён пільна назіраў за ваенным парадам,—я ўспомніў, што ён жа служыў яшчэ ў старой рускай арміі з дзевяцьсот пятнаццатага года, ваяваў на Заходнім фронце і ў Галіцыі, што ён у семнаццатым удзельнічаў у рэвалюцыйных падзеях, якія ахапілі Петраград.

А аднойчы мы былі разам з ім у творчай камандзіроўцы ў Гвардзейскай мотастралковай Рагачоўскай Чырванасцяжнай ордэнаў Суворава і Кутузава дывізіі імя Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. Ён цёпла і шчыра гутарыў з маладымі афіцэрамі, з салдатамі, і ўсе яны душой цягнуліся да яго. Мне зноў падумалася: гэта ж ён у васемнаццатым годзе стаў у шэрагі маладой Чырвонай Арміі ў ліку першых яе байцоў, гэта яго біяграфія амаль супадае з гісторыяй нашых Узброеных Сіл! Ён прайшоў шлях ад радавога чырвонаармейца, затым камісара да генерал-маёра інжынерных войск, удзельнічаў у барацьбе з інтэрвентамі на Карэльскім фронце, у вызваленні Беларусі ад польскіх акупантаў, у баях на Хасане і ў Вялікай Айчыннай вайне — на Заходнім і 3-м Беларускім франтах.

Яркая і шырокая вясёлка муаравых стужак палыхае на яго генеральскім кіцелі — два ордэны Леніна, пяць ордэнаў Чырвонага Сцяга, ордэны Кутузава і Айчыннай вайны, крыж Грунвальда, медалі. І яшчэ ўражваюць у рабочым кабінеце пісьменніка на кніжных паліцах яго творы: раманы «Якаў Жалязноў», «Выпрабаванне», «На закліку сэрца», п'еса «Сястра Варвара».

Далечыня жыцця... Сустракаючы сваё 75-годдзе, Мікалай Іванавіч пэўна ўспомніць і аб агнях-пажарышчах, праз якія давялося прайсці з баявымі сябрамі, і аб цярністых шляхах пісьменніцкай працы, якая пранядзіла аўтара з людзьмі рознага лёсу, героямі яго кніг. Але можа здарыцца, што ён па сціпласці ні з кім сваімі ўспамінамі так і не падзеліцца. А цікавяць яны і старэйшых, і малодшых. І я хачу расказаць аб ратным подзвігу і літаратурнай працы, якія так дабратворна склаліся ў адно, успомніўшы ўсяго два эпізоды.

У першыя дні і тыдні вайны афіцэр штаба палкоўнік Аляксееў, знаходзячыся ў камандзіроўцы, апынуўся ў самым цэнтры драматычных падзей на Бярэзіне. Ірваліся бомбы і міны, палалі вёскі, адыходзілі часці і падраздзяленні. Спробы начальніка вучылішча арганізаваць абарону былі беспаспяховымі. І штабны афіцэр, кадравы работнік, прыхаваўшы далей свае паперы, пачаў камандаваць.

На станцыі, якая стала тады канечнай, сышло з апошняга поезда некалькі ваенных.

— Ты як сюды трапіў?—спытаўся Аляксееў, убачыўшы сярод іх знаёмага камандзіра.

— З адпачынку...—адказаў той, нібыта вінавата.

— А куды?

— У Брэст трэба б было, у сваю дывізію.

Аляксееў панура азірнуўся вакол, памаўчаў у тужлівым роздуме. Авалодаўшы сабою, сказаў:

— Прызначаю цябе, баявога камандзіра, памочнікам начальніка раёна абароны.

— Чым жа рашэннем?

— Маім.

— Ёсць.

І потым, ён хуценька размеркаваў на рубяжах пехацінцаў, танкістаў, артылерыстаў, арганізаваў абарону, здольную затрымаць наступленне фашысцкіх войск.

Франтавая камандзіроўка афіцэра штаба зацягнулася надоўга, яна была «праўджана» бавявымі дзеяннямі. Крыху пазней ён разам з генералам Лізюковым займаўся складанымі справамі славутай пераправы, якая ўвайшла ў гісторыю вайны. Неўзабаве генералу Лізюкову было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, палкоўнік Аляксееў—узнагароджан ордэнам Чырвонага Сцяга.

Такой яна атрымалася, першая сустрэча з вайною і першая перамога. Пазней іх было нямала.

Ну, а першая сустрэча з літаратурай—як выглядала яна?

У трыццаць восьмым годзе маёр Аляксееў разам з іншымі работнікамі аднаго з упраўленняў прысутнічаў на гутарцы ў К. Я. Варапылава. Пасля гэтай гутаркі яго накіравалі ў камандзіроўку на Далёні Усход — праводзіць работу з кіруючымі кадрамі. Больш давяраць чалавеку, бачыць яго імкненні, падтрымліваць ініцыятыву — вось у чым, прыкладна, сэнс той растлумачальнай работы.

Там, у час баявых дзеянняў ля возера Хасан, Аляксееў сустрэў чалавека, які стаў правобразам галоўнага героя рамана «Якаў Жалязноў». Спачатку то былі дзённікавыя нататкі, потым запіскі—з роздумам, з сюжэтнымі замалёўкамі. Работа над раманам была завершана напярэдадні вайны. А ў 1944 годзе аўтара рукапісу адшукалі на фронце работнікі рэдакцыі. І праз некаторы час раман «Якаў Жалязноў» убачыў свет на старонках часопіса «Октябрь». Пасля вайны ён быў выдадзены асобнай кнігай, добра прыняты чытачамі і заўважаны крытыкай.

У наступныя гады былі ўжо не сустрэчы з літаратурай, а вялікая і няспынная работа ў ёй.

Паводле календара генералу і пісьменніку М. І. Аляксееву спаўняецца 75 гадоў. І ўсе, уключаючы і аўтара гэтых радкоў, хто добра ведае Мікалая Іванавіча, сямідзесяці пяці яму ніяк не можам даць—настолькі ён жыццярадасны, энергічны, бадзёры.

Як і ў часы службы, так і цяпер, у адстаўцы, генерал ахвотна ездзіць па краіне. Маршруты яго частых камандзіровак, калі б іх нанесці на карту, выглядалі б густой, прамяністай сеткаю.

Яшчэ прыгадваецца — нават не эпізод, а невялікі штрых з «неслужбовага». Здарылася нам разам быць у адной кампаніі, дзе цікава гутарылі і весела спявалі, ігралі на піяніна. Мікалай Іванавіч уважліва слухаў і горача хваліў выканаўцаў. А потым, калі змоўкла піяніна, ён раптам устаў і моцным, добра пастаўленым тэнарам заспяваў: «Я встретил вас...» Яму з захапленнем апладзіравалі, а ён сарамліва ўсміхаўся, пабліскваючы шэрымі вачыма, і нагул выглядаў вельмі маладжава.

Поўны творчых планаў, карпатлівай працы, таварыскіх сустрэч цяперашні дзень Мікалая Іванавіча. На рабочым стале пісьменніка ляжыць новы рукапіс...

З сямідзесяціпяцігоддзем вас, дарагі Мікалай Іванавіч! Поспехаў вам, натхнення! І, гаворачы шчырымі вершамі майго сябра-паэта,

Я по-солдатски
Здравия желаю!

В. ТРЫХМАНЕНКА,
палкоўнік.

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтых віншаванняў і жадае Мікалаю Іванавічу добрага здароўя, здзяйснення творчых задум.

НАШ ДРУГ — ТАВАРЫШ ЭКРАН

Удасканаленню перадавых прыёмаў працы, укараненню ўсяго новага ў вытворчасць вельмі дапамагае кіно, якое, дзякуючы сваім багатым выяўленчым сродкам, паказвае і раскрывае навізну жыцця.

Прыгадаем беларускія дакументальныя фільмы «Нараджэнне велікана» (1962 г.) і «Галоўны канвеер» (1966 г.). Абодва прысвечаны аўтамабілебудаўнікам нашай рэспублікі. На занятках семінара мы перыядычна дэманструем іх, каб праілюстраваць некаторыя тэарэтычныя тэзісы. Шкада, што ў кінапракаце не захавалася карцін, у якіх былі б адлюстраваны больш раннія этапы станаўлення нашага аўтамабільнага. Есць каштоўныя кадры і нават асобныя сюжэты ў поўнаметражных фільмах «Штрыхі да партрэта» і «Кветкі ў снежні».

Праўда, яны маюць аглядальны характар, падкрэсліваюць пэўную кінематаграфічную задуму аўтараў. Даводзіцца выбіраць патрэбнае для чарговых заняткаў з розных стужак. Добра было б, калі б творчае аб'яднанне «Летапіс» стварыла сродкамі кіно вобразную і змястоўную біяграфію буйнейшага прадпрыемства рэспублікі. Магчыма, перш чым здымаць такую стужку, варта параіцца і з прапагандыстамі і агітатарамі.

Звяртаючыся да твораў кінематографа, па сутнасці, мы вырашаем дзве задачы. Па-першае, ілюструючы фільмамі тэарэтычны матэрыял лекцый, якія чытаюцца на занятках семінара, дапамагаем слухачам глыбей зразумець тэму. Па-другое, наладжваючы прагляд дакументальных, навукова-папулярных і вучэбных карцін для ўсяго калектыву ўпраўлення, садзейнічаем ажыццяўленню мерапрыемстваў, накіраваных на павышэнне прадукцыйнасці працы і эфектыўнасці вытворчасці, на разгортванне сацыялістычнага спаборніцтва за выкананне дзевятай пяцігодкі.

Прывяду некаторыя прыклады.

Сёлета для слухачоў семінара была прачытана лекцыя на тэму «Міжнародная дзейнасць КПСС па ажыццяўленню рашэнняў XXIV з'езда партыі». Удзельнікі семінара, рыхтуючыся да заняткаў, прачыталі адпаведную літаратуру — творы класікаў марксізма-ленінізма, матэрыялы XXIV з'езда КПСС, выступленні Леаніда Ільіча Брэжнева. Быў арганізаваны прагляд дакументальных і мастацкіх фільмаў на некалькіх сеансах. Удзельнікі семінара ў Доме культуры трэста № 5 прагледзелі дакументальныя стужкі аб паездках Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева ў Польшчу, ГДР, ФРГ, Злучаныя Штаты Амерыкі і Францыю. Былі паказаны хранікальныя выпускі аб сустрэчах Леаніда Ільіча з працоўнымі ў Алма-Аце і Ташкенце. І хоць кожны сачыў за гэтымі падзеямі па газетах і тэлебачанню, усе ўважліва слухалі жывое слова кіраўніка нашай партыі, дзе так дакладна вызначаны прынцыпы ленінскай знешняй палітыкі Камуністычнай партыі. Вялікае ўражанне пакінуў поўнаметражны дакументальны фільм «XXIV з'езд КПСС».

Былі паказаны таксама мастацкія карціны «Масква — Генуя», «Змова паслоў», «Пасол Савецкага Саюза», «Місія ў Кабуле». Нібы аднавілася знаёмства з першымі савецкімі дыпламатамі Бязлыкавым і Чычэрыным («Масква — Генуя»), паўпрэдам Пятром Сарокіным, які разам са сваімі таварышамі ўмацоўваў дружбу паміж маладой савецкай краінай і Афганістанам («Місія ў Кабуле»), і з тымі, хто, прыкрываючыся дыпламатычным імунітэтам (Локарт), намагаўся знішчыць Савецкую ўладу («Змова паслоў»). Нарэшце, адбылася яшчэ адна сустрэча з дыпламатам Аленай Кальцовай, прататыпам вобраза якой з'явілася першая савецкая жанчына-дыпламат ленінскай школы А. М. Калантай. Фільмы гэтыя — як своеасаблівы летапіс барацьбы і перамог савецкай дыпламатыі на ўсіх этапах існавання нашай сацыялістычнай дзяржавы.

Аб гэтым і гаварылі слухачы семінара на чарговых занятках пасля таго, як былі прагледжаны (многія па некалькі разоў) дакументальныя і мастацкія фільмы. Брыгадзір комплекснай брыгады І. В. Дзялендзік у сваім выступленні, раскрываючы асноўную тэму — XXIV з'езд КПСС аб міжнароднай палітыцы партыі і савецкага ўрада — спыніўся на ролі дакументальнага кіно ў прапагандзе і вывучэнні працоўнымі гістарычных дакументаў нашай эпохі. Ён выказаў думку, што кінахроніка найбольш поўна адлюстроўвае важнейшыя падзеі грамадска-палітычнага і культурнага жыцця. А самая галоўная заслуга хронікі ў выключнай аператыўнасці (вядома, пасля тэлебачання, якое выдае матэрыял у эфір тут жа, па гарачых слядах).

Падводзячы вынікі семінарскіх заняткаў, мы зрабілі такую выснову: дакументальнае кіно — люстра нашага паўсядзённага жыцця. Яно знаёміць нас з лепшымі прадстаўнікамі рабочага класа, сялянства, інтэлігенцыі, закранае важныя грамадскія праблемы. Тыя ж функцыі выконвае і мастацкае кіно, але ігравымі сродкамі, ствараючы абагульненыя вобразы нашых сучаснікаў або герояў гістарычнага мінулага, вобразы, якія запамінаюцца, вобразы эмацыянальныя.

Мы заўсёды з хваляваннем глядзім дакументальную стужку «Жывы Ленін». Кароткія, як імгненні, кадры паказваюць Уладзіміра Ільіча разам з Бонч-Бруевічам, на трыбуне ў часе выступлення перад чырвонаармейцамі, якія накіроўваюцца на Заходні фронт, і іншыя эпізоды. Для кожнага з нас яны бязмежна дарагія. І яшчэ глыбей раскрываецца вобраз любімага правадыра, калі мы бачым, як вярнуўшыся з Фінляндыі, ён кіруе падрыхтоўкай узброенага паўстання, ідзе да гэтай мэты, рызыкуючы жыццём («Ленін у Кастрычніку»), вядзе рашучую барацьбу з контррэвалюцыяй і знешнімі ворагамі маладой рэспублікі Саветаў («Ленін у 1918 годзе»), як выступае бліскучым арганізатарам, натхніцелем барацьбы за Савецкую ўладу, выходзіць пераможцам над яе ворагамі ў самы драматычны час («Шостае ліпеня»).

Славутая кіналенініяна з кожным годам папаўняецца новымі творамі. Для прапагандыстаў усіх звенняў і сістэм — гэта яшчэ адна крыніца глыбокага вывучэння марксісцка-ленінскай тэорыі. Вобразная ілюстрацыя да гістарычнага матэрыялу заўсёды падмацоўвае і пашырае веды слухачоў нашай школы.

У праграму нашай школы ўключаны таксама стужкі «Ленін (апошнія старонкі)», «Агні вялікага пачыну» (пра першы камуністычны суботнік у дэпо Масква-сартыровачная) і «Па запавету Ільіча» (пра суботнік, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна), «Два шляхі» аб сацыялістычнай і капіталістычнай сістэмах), «Мы — рабочы народ» (аб маладым папаўненні рабочага класа) і «Паэма аб рабочым класе») расказ пра яго гераічнае мінулае і сённяшняе), «Дэкрэт аб зямлі» і «Па ленінскаму плану» (пра дасягненні партыі і народа ў перабудове сельскай гаспадаркі з часу ўстанаўлення Савецкай улады), «Эканамічны лад сацыялізма» (аб прынцыпах пабудовы эканамічнага жыцця ў краінах сацыялізма).

Адны з пералічаных фільмаў мы паглядзелі і абмеркавалі, другія нам яшчэ прадстаіць паглядзець і абмеркаваць. Так, праводзячы заняткі, мы кожны раз звяртаемся да паслуг кінаэкрана. Мастацкія і дакументальныя фільмы дапамагаюць нам сваёй нагляднасцю, яркімі прыкладамі з жыцця і працы чалавека.

Не перабольшу, калі скажу, што пад уплывам убачанага на экране працуюць і выхоўваюцца нашы будаўнікі, у тым ліку і слухачы «школы эканамічных ведаў». Сярод іх — ветэран працы, камуніст І. В. Дзялендзік. Комплексная брыгада, якую ён узначальвае, дзвятую пяцігодку рашыла выканаць за чатыры гады. Ёй прысвоена званне камуністычнай, а Іван Васільевіч узнагароджаны медалем «За працоўную доблесць», граматамі гаркома партыі і Міністэрства будаўніцтва БССР.

Добрае слова хочацца сказаць пра іншых слухачоў — ветэранаў працы, такіх, як брыгадзір каменшчыкаў Максімовіч, слесар Маркаў, галоўны механік Емяльянаў. Яны не толькі выдатна працуюць, але і клапоцяцца пра маладых рабочых, перадаюць ім свой вопыт. Такіх ветэранаў у нас амаль пяцьдзесят працэнтаў.

Але дасягнутае — не мяжа. Мы будзем змагацца за новыя поспехі. І ў гэтым нам павінна дапамагаць кіно. Вельмі цікавяць нас стужкі, якія маюць непасрэднае дачыненне да прафесіі будаўніка. Пры гэтым пажадана, каб іх аўтары ў сваіх творах не проста расказвалі пра будаўнікоў, але і глыбока адлюстроўвалі эканоміку будаўніцтва, раскрывалі навукова-тэхнічныя працэсы, даследавалі характары людзей, паказвалі ў адзінку часу працу тынкоўшчыка, муляра, цесляра, мантажніка. Варта было б даць больш фільмаў, абагульняючых перадавы вопыт па якому-небудзь аднаму віду працы, скажам, будаўніча-мантажных работ, або ўкараненні НАП у брыгадах, паляпшэнні структуры будаўнічага ўпраўлення, трэста, разгортванні сацыялістычнага спаборніцтва і, вядома, аб выхаваўчай рабоце ў працоўных калектывах.

Такія кінастужкі, напэўна, памаглі б будаўнікам лепш арганізаваць працу, знайсці новыя рэзервы вытворчасці, павышаць эканамічныя веды.

Мы спадзяемся, што творчае аб'яднанне «Летапіс» студыі «Беларусьфільм» улічыць нашу «калектыўную заяўку» і праз пэўны час у кінапракат паступяць фільмы названай тэматыкі.

А. ПУСТАВАЛАВА,
прапагандыст будаўнічага ўпраўлення № 20 ордэна Леніна будтрэста № 5.

НА ФЕСТЫВАЛЬНАЙ АФІШЫ

Магілёўскі абласны драматычны тэатр паставіў спектакль па п'есе Яна Солавіча «Таямнічы жабрак». Рэжысёр Ул. Караткевіч разам з аўтарам дэкаратыўнага афармлення мастаком М. Волахавым стварыў сатырычнае відовішча, у якім выразна гучыць асуджэнне мяшчанства. У спектаклі ролі выконваюць акцёры К. Масквін, Л. Палонскі, Л. Гурына, заслужаныя артысткі БССР Ю. Гальперына, В. Кабатнікава і Э. Міхайлава.

Да школьных канікул тэатр падрыхтаваў казачнае прадстаўленне па п'есе лаўрэата Дзяржаўнай прэміі ЧССР Войцеха Цынібулкі «Блакітная жамчужына» (рэжысёр А. Кукшынскі, мастак В. Гараднякоў).

Гэтыя работы магіляўчан пазначаны на афішы сёлетняга Усесаюзнага фестывалю чэхаславацкай драматургіі.

На здымку — у ролях Цыцака і Галібы артысты Л. Палонскі і К. Масквін («Таямнічы жабрак»).

Кацярына ШУМЯНКОВА.

ЛІСТКІ З КАЛЕНДАРА

Гэтае маляўнічае і змястоўнае выданне заваёўвае папулярнасць сярод шматлікіх прыхільнікаў сцэнічнага мастацтва — Ленінградскае аддзяленне выдавецтва «Искусство» выпускае штогод «Театральный календарь». Звычайна публікуюцца матэрыялы аб юбілеях тэатраў і акцёраў, змяшчаюцца артыкулы пра вядучыя тэатры Савецкай краіны і свету, цытуюцца дакументы і газетныя артыкулы былых часоў, дзе адлюстраваны знамянальныя падзеі. Так, сёлета атрымаўшы каляндар на 1974 год, мы, напрыклад, чытаем лісткі, прысвечаныя 150-годдзю славутага Малога тэатра ў Маскве, творчы шлях якога быў звязан з вызваленчым рухам у Расіі, з перадавой грамадскай думкай XIX стагоддзя, а пасля Вялікага Кастрычніка ўзбагаціўся буйнымі дасягненнямі ў развіцці савецкай тэатральнай культуры.

Каляндар шырока папулярызуе значэнне А. Пушкіна ў драматургіі — 6 чэрвеня спаўняецца 175 гадоў з дня нараджэння паэта.

Ёсць у календары і беларускія старонкі.

Напрыклад, у сувязі з 75-годдзем з дня нараджэння народнага артыста СССР Г. Глебава (11 мая) публікуюцца водгукі прэсы на выступленні акцёра ў спектаклях «Партызаны», «Пагібель воўка», «Хто смяецца апошнім», «Паўлінка», «Скупы». Між іншым, яшчэ перад вайной крытыка адзначала, што лепшай рысай Г. Глебава была «эканомія выразных сродкаў, эканомія не ад беднасці або скупасці, а ад багацця разумнага мастака, які разумее, што азначае «ледзь-ледзь» у мастацтве».

Спаўняецца 75 гадоў народнай артыстцы СССР Л. Ржэцкай, актрысе, якая выступае на купалаўскай сцэне з дня адкрыцця Першага БДТ. Зноў жа цікава будзе чытачам пазнаёміцца з яркай творчай індывідуальнасцю, якая раскрывалася ў спектаклях, што былі этапнымі для беларускага сцэнічнага мастацтва (Заіра ў «Мяцежы» Д. Фурманава, Кручыніна ў «Без віны вінаватых» А. Астроўскага, Марыля ў «Раскіданым гняздзе» і Альжбэта Крыніцкая ў «Паўлінцы» Я. Купалы, Сакалова ў «Апошніх» М. Горкага, Каспарыха ў «Салаўі» Зм. Бядулі, Аўдоцця ў «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы, Марфа «У мяцеліцу» Л. Ляонава). Дарэчы, каляндар у сваіх характарыстыках Л. Ржэцкай спасылаецца на працы мінскіх тэатральных крытыкаў.

В. ІВІН.

ХАРАКТАР Уладзіміра КАРАВАЯ

ЗАСЛУЖАНЫ АРТЫСТ БССР Пётр ФІЛІПАЎ У СПЕКТАКЛІ «ТАБЛЕТКУ ПАД ЯЗЫК» У ГОМЕЛЬСКІМ ТЭАТРЫ

Аднойчы з вуснаў старшыні калгаса «Маяк» Каравая неяк амаль механічна сарвалася прызнанне: «Маўляў, вы пра мой рэзкаваты і калючы характар... Што ж, у мяне гэты характар склаўся не выпадкова...» Драматург гэтым нібы сцвярджае, што яго герой — чалавек сталы, з устойлівымі поглядамі і пераканаННямі. Між тым, падзеі ў камедыі-рэпартажу «Таблетку пад язык» А. Макаёнка разгортваюцца такім чынам, што Уладзімір Каравай і для самога сябе часам адкрывае ў людзях нешта нечаканае, яму даводзіцца і мяняць адносіны да маладых і да не зусім маладых людзей.

У выкананні П. Філіпава гэтай ролі ёсць хвіліны, дзе герой спектакля а б д у м в а е тое, што адбылося і аб чым мелася гаворка ў яго кабінеце, які нагадвае скрыжаванне працоўных і асабістых шляхоў дзейных асоб камедыі. Да яго звяртаюцца ўсё новыя і новыя персанажы, раз-пораз звоніць тэлефон, яго чакаюць паперы — часу, здаецца, няма вось так сур'ёзна задумацца аб тым, што сказаў, напрыклад, дзед Цыбулька або Аксана Смятанкіна, Юрка ці Скаромны. А ён — думае. Не для таго, каб потым жыць лягчэй самому. Яго клапоціць с п р а в а, якой ён служыць, — зямля, хлеб... Калі пра Васю маці кажа, што ён «мяккацелы... мякчэй ваты», то Каравай з адкрытай павагай аспрэчвае: «Мужык з характарам!» Гэта філіпаўскаму персанажу даражэй за любыя характарыстыкі.

З калгаса ў горад едуць людзі. Каравай у П. Філіпава, як гэта і прадугледжана п'есай, не можа мірыцца з модным настроем сярод моладзі. Спрачаецца, загадвае, нават на дыпламатыю пускаецца, але адстойвае кожнага, хто патрэбны «Маяку». І ён жа раптам адчувае, што міграцыя моладзі — не адно толькі мода. І зноў мы бачым твар сталага чалавека, які пачынае глыбей разумець змены ў жыцці, пачынае разумець імклівы час. Штосьці ён пераадольвае і ў самім сабе — звыклае, завучанае раней.

Крыху здзіўляецца, што стары дзед Цыбулька раней за яго ўголас сказаў, што любіць зямлю — гэта не адно і тое ж, што любіць «пясчаны касагор ці тую лагчыну», што Юрка не бяжыць з калгаса, а ідзе шукаць сваё прызванне — прыслухайся да таго, што імі кіруе, падтрымай, беражліва вядзі да яснай мэты. І гэты рух думкі Уладзіміра Каравая эмацыянальна вельмі выразна перадаецца П. Філіпавым, асабліва ў заключнай частцы спектакля.

Раней старшыня калгаса трохі «зверху» пазіраў на дзеда Цыбульку — вось жартаўнік, балагур, хай сабе тут круціцца ды забаўляе. Часам і падкажа што вартае, усё ж стары хлебароб, знаўца зямлі. Але з цягам часу філіпаўскі Каравай і да старога прыслухоўваецца, пераадольваючы свае адносіны да яго. Ужо не дасціпная балбатня, не толькі дзелавы падказ, а філасофскі сэнс маналогу дзеда Цыбулькі (артыст П. Вараб'ёў) прыцягвае ўвагу старшыні, і ён пачынае здагадвацца, што раней дарэмна лічыў таго толькі звычайным дзедам, абавязковым у вёсцы перасмешнікам. Яны і раней сябравалі, але нешта зусім новае ў Цыбульцы Каравай усё ж адкрывае нават, як кажуць, «пад заслону». І тут П. Філіпаў па-акцёрску паслядоўна прасочвае за тым, што адбываецца ў душы героя.

Спектакль пастаўлены так, што мы адчуваем і яго, Каравая, умоўна кажучы «ўчора» — мабыць, той жа Каравай, якім яго паказвае П. Філіпаў, — любіў і адміністраваць. Загадаў — і кропка! Цяпер ён часцей раіцца з адмысловыми... надумцамі, узважае і абмяркоўвае свае загады. Калі Юрка едзе ў горад і яго не затрымаеш, дык жа Васіль або Вера прыехалі ў вёску і тут шукаюць сваё прызванне —

Гамяльчане ведаюць гэтага артыста як вельмі тэмпераментнага мастака. І ў вобразе Каравая адчуваеш яго такім.

Праўда, да гонару П. Філіпава трэба аднесці яго ўменне дакладна і мэтазгодна размяркоўваць сцэнічныя фарбы. Скажам, не вельмі новая драматургічная сітуацыя ў п'есе з выкрыццём Скаромнага іграецца П. Філіпавым надзвычай стрымана, без «лабавых» прыёмаў. Акцёр бачыць, што адмоўны персанаж нават рэплікамі накшталт — «Я вас па судах зацягаю! Я вас на «кавёр пастаўлю...» — сам выкрыў сябе, і таму больш тонка паказвае перажыванні Каравая, які ўсё ж давяраў Скаромнаму. Зноў мы адчуваем не толькі эмацыянальную плынь пачуццяў, а і ход інтэлектуальных разважанняў героя.

Пасля прэм'еры камедыі, рэжысёрскія абрысы якой выразна вызначыў І. Папоў, у спектаклі адбываецца зусім натуральны працэс станаўлення сцэнічнага твора. У гэтым працэсе адчувальна ўзбагацілася трактоўка і выкананне галоўнай ролі — Уладзіміра Каравая. У рэпертуарным спісе П. Філіпава з'явілася яшчэ адна прафесійна яркая і глыбокая работа.

Р. КАЗЛОВА.

На здымку: заслужаны артыст БССР П. Філіпаў (Каравай) і артыст П. Вараб'ёў (дзед Цыбулька).
Фота Ул. ТКАЧЭНКІ.

І ТАНЦУЙ, І СПЯВАЙ...

Аперэта абавязвае артыста, які прысвячае сваё жыццё гэтаму жанру, да умення рабіць на сцэне ў с ё. Не трэба аддаваць музычнай камедыі перавагі перад іншымі, але ж драматычнаму артысту можна абысціся без вакальных здольнасцей, оперны спявак можа наогул не ўдзельнічаць у харэаграфічных эпізодах спектакля... Калі ж ты назваўся аперэтачным акцёрам — танцуй, гавары, спявай, дзейнічай у пантаміме!

Маладая спявачка Вікторыя Мазур, калі вучылася ў кансерваторыі, развучвала партыю ў музычнай камедыі «Фіялка Манмартра». Вакальныя цяжкасці не так бянтэжылі яе, як драматычная ігра, дыялогі і харэаграфія, хаця на дэбют быў дадзены такі кароткі тэрмін — адзін месяц.

З дня ў дзень рэпетыцыі і ўрокі — з рэжысурай, з канцэртмайстрам, з харэографам. Адны і тыя ж мізансцэны, ноты, рэплікі, пасажы і ўсё дзеля таго, каб знайсці новыя нюансы, новыя фарбы...

Як і заўсёды ў жыцці маладых артыстаў, адны рэпетыцыі здаваліся Вікторыі патрэбнымі і карыснымі, іншыя — механічнымі паўтарэннямі знаёмага. Ды вобраз з аперэты «Фіялка Манмартра» ўжо захапіў, узяў у палон. Калі В. Мазур крочыла з кансерваторыі або з тэатра дадому, спявала яна «для сябе» славутую выхадную арыю Віялеты. Гэта ў яе сэрцы трымцела і пералівалася мелодыя радасці, шчасця, кахання, напісаная некалі І. Кальманам... Тады знікаў настрой «механічнага паўтарэння» і хацелася рэпеціраваць ролю з пачатку да канца, шукаючы самыя пранікнёныя і трапяткія інтанацыі — для слова, для танца, для песні.

Дэбют прайшоў з поспехам. Маладой актрысе апладзіравалі. Яе віншавалі. І яна, здагадваючыся «шостым пачуццём», што не ўсё яшчэ ёй удалося зрабіць так, як таго вымагае музыка, радавалася. У гэтай радасці было і нешта патрабавальнае — а заўтра, у чарговым ужо, а не святочна-прэм'ерным спектаклі, ты здолееш пайсці глыбей і далей таго, што ўжо знойдзена і сыграна табой сёння?

Вікторыя Мазур на сцэне вельмі лірычная і па-акцёрску непасрэдная. Яе гераіня — Віялета — дзіця Парыжа, горада. І непасрэднасць такой дзяўчыны мае штосьці спецыфічнае. Яна павінна быць дасціпнай і стрыманай, палымянай і дыпламатычнай. Бо тыя спрэчкі і нават паядынкі, што чакаюць яе на кожным кроку, вядуць з ёй студэнты, маладыя мастакі і музыканты. Тут умеюць жартаваць і высока цэняць экспромт. І ў сцэнічным вобразе Віялеты, створаным В. Мазур, была акурат такая ступень непасрэднасці, шчырасці з адчувальнай «дозай» інтэлекту. Асабліва маляўніча былі распрацаваны актрысай дуэты з Марселем. Калі мы слухалі іх, міжволі з'яўлялася думка аб тым, што І. Кальман у гэтай аперэце даў своеасаблівую музычную версію на тэму Рамэа і Джульеты парыжскага Манмартра.

Абдумваючы свой дэбют на сцэне, В. Мазур бачыла, што ёй яшчэ трэба ўдасканальваць пластыку і рух. Тое, што прыдатнае для перадачы свайго настрою ў прыватным жыцці, выглядае на падмостках мітуслівым і здробненым. Калі ж надта падкрэсліваць жэст або міміку, губляецца натуральнасць у паводзінах. Зноў жа — рэпетыцыі і рэпетыцыі... Табе ўжо апладзіруюць за Віялету, а ты ўсе роўна працуй і працуй. Такія былі першыя ўрокі прафесіянальнай сцэны. Ды і ў вакальных адносінах было над чым працаваць. Хоць голас салісткі цёплы і мяккі па тэмбру, дыяпазон яго і нюансіроўку можна было і варта ўдасканальваць. І на ўроках вакалу В. Мазур старанна шукае прыёмы «перакладу» музычнай фразы на ріапо, а потым наадварот — на супрацьлеглае адценне.

Пасля гарэзлівых і сур'ёзных, летуценных і практычных, рамантычных і зусім зямных персанажаў, сыграных В. Мазур за тры гады, сёлета ёй даручылі ролю Паўлінкі ў аднайменнай аперэце Юрыя Семянякі паводле камедыі Янкі Купалы.

— Ужо на першай сустрэчы з пастановачнай групай, — расказвае Вікторыя Мазур, — мы, артысты, былі вельмі ўзрушаны тым, што менавіта наш тэатр упершыню ў гісторыі дасць новае сцэнічнае жыццё купалаўскаму твору і чакалі таго часу, калі прагучаць першыя акорды партытуры музычнай камедыі. Якой яна будзе? І тут трэба сказаць, што купалаўскі тэкст найлепш выказаў тое, чым жыве мая Паўлінка. Самабытнае і маляўнічае слова народнага песняра, музычнае і ў драматычным творы, абуджае творчую фантазію кампазітара, лібрэтыста і артыстаў. Колькі смеху заўсёды выклікала на рэпетыцыях сцэна прыезду ў дом Крыніцкіх пана Адольфа Быкоўскага, калі хтонебудзь з выканаўцаў гэтай ролі — ці К. Лосеў, ці В. Фаменка, ці Я. Яўна — пачынаў спяваць вядомы «раманс» пана Адольфа «З нашэго кахання, пэўна, ніц не бэндзе...» Мноства цудоўных музычных момантаў давялося нам праслухаць, калі мы знаёміліся з аперэтай!..

Музыка, на маю думку, і вызначыла напрамак рэжысёрскіх шуканняў. Мы вельмі хутка перайшлі ад застольных да мізансцэнных рэпетыцый. Узаемаадносіны паміж героямі ўсталёўваліся ў дзеянні. Жэст, слова, музычная фраза — і адразу знойдзена арганічная лінія паводзін і натуральная інтанацыя.

Партыю Паўлінкі мы выконваем па чарзе з Наталляй Гайдай. Нам здаецца, што аперэтачная Паўлінка выглядае больш жыццярадаснай, чым у драматычным спектаклі. Гэта жыццярадаснасць закладзена ў самой музыцы партытуры. Дарэчы, Юрый Семяняка ў перыяд пастаноўкі спектакля бываў амаль на кожнай рэпетыцыі і вельмі дапамагаў нам сваімі парадамі.

...Паўлінка з'явілася на сцэне ў другой карціне. Музычны матэрыял ролі вельмі вялікі. Салістка павінна правільна размеркаваць дыханне, «пабудаваць» вакальны малюнак партыі, каб вобраз жыў у руху, у развіцці. Характар гераіні раскрываецца пры дапамозе розных сродкаў — і ў дынаміцы драматычнага дзеяння, і ў дыялогах, і ў песнях, і ў танцавальных нумарах. Але ўсе гэтыя кампаненты не павінны замінаць спевам. І В. Мазур тонка адцяняе вакальнае багацце сваёй партыі.

Роля вельмі танцавальная, але цяпер гэта ўжо не палохае Вікторыю. Яна паспяхова спраўляецца з танцамі ў масавых сцэнах, у сольных нумарах.

На працягу спектакля Паўлінка ўвесь час знаходзіцца на сцэне. І Вікторыя Мазур вельмі вынаходліва па-акцёрску падкрэслівае духоўную шчодрасць простай сялянскай дзяўчыны. Як летуценна гучыць голас спявачкі ў лірычным прасветленым дуэце Паўлінкі з яе каханым Якімам! Цудоўна пераклікаецца яе голас з галасамі сяброваК у сцэне гуляння ў доме Крыніцкіх, калі выконваецца народная песня «Ой, там, у бору...».

Як і кожная роля, Паўлінка пакрысе робіцца для В. Мазур «самай дарагой». І таму ў ёй няма статычнасці, яна набывае новыя і новыя артыстычныя нюансы. Нават, калі б мы некалькі разоў паглядзелі «выхапленыя» з плыні тэатральнага відовішча сцэны Паўлінкі з панам Быкоўскім, то і тады заўважылі б творчы рост выканаўцы: В. Мазур знаходзіць дасціпныя праявы экспрэсіўных паводзін і эмацыянальнага падтэксту партыі. Ёй хацелася, каб Паўлінка на аперэтачных падмостках успрымалася б абавязкова купалаўскім вобразам, зямной і летуценнай натурай. Да гэтага вядзе яе і музыка. Таму і прысуд гледачоў аднадушны: яны вітаюць на аперэтачнай сцэне к у п а л а ў с к у ю Паўлінку.

Л. ІВАШКОЎ.

ТАБЕ, ПЯЦІГОДКА!

У гэтым годзе многія мастакі пабывалі на буйных беларускіх будоўлях, у калгасах і саўгасах, у цэхах заводаў. Яны прывезлі адтуль замалёўкі, эцюды эскізы.

Мастак Іосіф Капялян некаторы час быў на Лукомльскай ДРЭС.

Сёння мы прапануем увазе чытачоў серыю яго малюнкаў.

Вы бачыце: «Блокавы пункт кіравання», «Кветкі ў цэху», «Перазменка».





ВЕРНІСАЖ—28

ПА ТРАДЫЦЫІ напярэдадні гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў Брэсце адбыўся вернісаж 28-й абласной мастацкай выстаўкі. У экспазіцыю ўвайшло звыш ста твораў выяўленчага мастацтва амаль сарака мастакоў Брэстчыны.

Дэвіз выстаўкі—«Беларусь сацыялістычная»—выразна акрэсліў яе ідэйна-эстэтычную накіраванасць. У творах мастакоў услаўляецца стваральная праца савецкіх людзей, будаўнікоў свайго светлага «заўтра», апяваецца прыгажосць роднай прыроды. Асабліва радасна адзначыць творчую актыўнасць маладых мастакоў. Аптымістычнае гучанне вобразнага комплексу выстаўкі з першых жа дзён атрымала гарачыя водгукі шырокага гледача і станоўчую ацэнку мастацтвазнаўцаў.

Экспазіцыя вызначаецца разнастайнасцю мастацкіх жанраў. Але, як заўсёды, дамініруе станковы жывапіс. Пільную ўвагу гледача прыцягваюць работы старэйшага мастака Н. Аўчыннікава. У мінулым годзе ён парадаваў вялікім тэматычным палатном аб сустрэчы Я. М. Свярдлова з У. І. Леніным у Разліве. Гэтую карціну смела можна аднесці да лепшых дасягненняў мастака. А цяпер Н. Аўчыннікаў узнімае іншую адказную тэму—«У. І. Ленін і Н. К. Крупская ў Горках».

Карціна ўдала перадае атмасферу цеплыні і глыбокіх пачуццяў, калі верная сяброўка клапацілася аб здароўі вялікага правадыра ў апошнія гады яго жыцця. Але, на мой погляд, аўтару трэба папрацаваць над пабудовай мізансцэны карціны, палепшыць раўнавагу светакаляровых адносін. Графічныя лісты—«Людзі стаялі тут насмерць» і «Заўсёды напагатове» сведчаць аб тым, што графіка такая ж блізкая мастацкаму профілю Н. Аўчыннікава, як і жывапіс.

Мастак Э. Куфко выступае з цікава задуманай тэматычнай карцінай «Будаўніца», у якой задаўся мэтай стварыць абагулена манументальны вобраз будаўніцы.

Ён абраў актыўную колеравую гаму. Знешне «Будаўніца» Э. Куфко выглядае даволі эфектна. На маю думку, захапленне фармальным бокам абядняе высакародны вобраз савецкай будаўніцы, пазбаўляе яго велічы і адухоўленасці. Цікавы па жывапісу—яго партрэт мастака Кабец.

Своеўласцівасць творчага почырку мастака Н. Чураба асабліва наглядна выявілася ў свежым маляўнічым пейзажы «Раніца ў порце» і «Мужчынскім партрэце». У гэтых работах жывапісец як бы спаборнічае з графікам

У жывапісу Н. Чураба няма ні шырокага корпуснага мазка, ні тонкіх лесіровак. Арыгінальных каларыстычных рашэнняў ён дабіваецца нанясеннем дробных мазкоў, часта лакальнага колеру, побач з мазкамі іншых танальнасцей.

У выразным «Мужчынскім партрэце», выкананым у аднароднай карычневатай гаме, прэвалірує графік, а ў «Раніцы ў порце», які пераліває шматколернасцю спектра,—жывапісец, які супернічае ў мастацкай выразнасці вобразу.

Пейзажы Н. Чураба, такія як «Да бессмяротнасці» (уваход у крэпасць), «Цярэспальская брама» і агульны від мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой», навеяныя суровай эпапеяй, красамоўна гавораць аб тым, што тэма гераічнай цытадэлі стала вядучай тэмай творчасці мастака.

Мастак П. П. Пагодзін, які паспяхова працуе ў жанры плаката, выявіў свае здольнасці і ў іншых жанрах, аб чым сведчыць псіхалагічна выразны партрэт нашага сучасніка «Механізатар», выкананы вугалем, цікавы жаночы партрэт «Настаўніца» і невялікі пейзаж «У сонечны дзень», напісаныя маслам.

Асаблівае месца займаюць работы аднаго са старэйшых майстроў Брэста—П. Данелія. На выстаўцы ён прадстаўлены пяццю пейзажнымі кампазіцыямі, глыбока лірычнымі па настрою.

У карціне «Вячэрняя ўсмешка» П. Данелія выказвае той узвышаны душэўны стан нашага сучасніка, які надыходзіць увечары, пасля напружанага працоўнага дня.

У пейзажы «Дэкар восені» мастак ставіць іншую задачу—перадаць асенні настрой прыроды гамай серабрыста-шэрых таноў, выкарыстоўваючы вялікія лакальныя плоскасці. Карціна «Развітанне» навявае ціхі сум залатой восені пару лірычнага расставання з летам.

«Цёплы дзень» зачароўвае хараством палескага пейзажу, а «Наш дворык», увесь пранізаны сонцам, хвалюе гледача мажорам залатой гамы.

З жыццесцвярджальнай тональнасцю карцін П. Данелія пераклікаюцца работы спевака калгаснага жыцця В. Шыкіна. Яго вялікае шматфігурнае палатно «Свята ўраджаю», нягледзячы на некаторую кампазіцыйную незавершанасць, падкупляе цеплынёй і аптымістычнай лірыкай. Мастак так зрадніўся з калгаснай тэматыкай, што яго карціны ўспрымаюцца як радасны гімн працы хлебароба. З вялікім настроем напісаны ім «Жаночы партрэт», вытрыманы ў той жа мажорнай гаме.

Разам з членамі творчага саюза важкі ўклад у экспазіцыю выстаўкі ўносяць і актывісты, якія групіруюцца вакол Брэсцкай абласной арганізацыі Саюза мастакоў БССР і майстэрняў Мастацкага фонду.

Так, малады мастак шырокага творчага дыяпазону В. А. Нікалаеў, які выступаў у мінулым пераважна ў пейзажным і графічным жанрах, цяпер экспануе дзве маляўнічыя шматфігурныя кампазіцыі на абаронную тэматыку—«Зары насустрач» і «Пагранічнікі».

У першай — б'е крыніцай буйная экспрэсія юных коннікаў, што імчацца ў ранішнім тумане насустрач узыходзячаму сонцу. Дынаміка карціны перадаецца амаль сілуэтна, шырокімі свабоднымі мазкамі. У другім палатне—строгая сканцэнтраванасць пагранічнікаў, на дазорнай службе ўвасоблена з выразнасцю станковага пісьма з псіхалагічнай характарыстыкай персанажаў. Абедзве карціны В. Нікалаева сведчаць аб росце мастацкай сталасці і прафесіянальнага майстэрства мастака.

У творчасці мастака Н. Дударава за апошнія гады адбыліся прыкметныя зрухі. Імкнучыся пазбавіцца ад некаторай неўраўнаважанасці сваіх кампазіцый, ён стаў усё больш настойліва дабівацца арганізаванасці кампанентаў карціны. Ад буйной стракатасці палітры ён стаў пераходзіць да больш строгіх гам з глыбокімі цёмнымі і кантрастуючымі светлымі танамі.

Прыклад настойлівай работы дэманструе малады мастак Л. Салаўёў, які рэкамендаваны да ўступлення ў творчы саюз. Ён стварыў цэлую серыю тэматычных акварэлей. З іх звяртаюць увагу «Завод будуецца», «Новы мікрараён», «Ускраіна Брэста», «Цярэспальская брама» і прыкметны па майстэрству пейзаж «Вясна».

Працуе ў жанры жывапісу нядаўна дэмабілізаваны ваеннаслужачы І. Ламакін, які таксама рэкамендаваны да ўступлення ў Саюз мастакоў. Вядучай тэмай яго пейзажаў з'яўляецца гераічная абарона Брэсцкай крэпасці. Ён стварыў дзесяткі унікальных эцюдаў, пейзажаў і замалёвак. На выстаўцы экспануюцца пяць яго работ у тэхніцы масла і пастэлі: «Прыгонніцкія ўзгоркі», «Сляды вайны», «Мухавец», «Гарадскі пейзаж», «Казематы».

Нязменным удзельнікам абласных выставак з'яўляецца мастачка З. Аверына-Пагодзіна. Яе тонкія лірычныя акварэлі і манатыпіі вабяць увагу аматараў гэтага жанру палітрай, адпрацоўкай дэталей. Цяжкая хвароба, якая прыкавала мастачку да крэсла, не зламала яе волі, і яна працягвае радаваць нас сваім мастацтвам. У кампазіцыю ўвайшлі яе работы: «Жаночы партрэт», «Буракавод Чарняўская», «Піёны», «Ружы», «Сталявар».

Малады мастак-манументаліст М. Клімаў выставіў цікавую па задуме кампазіцыю «Гаворыць Масква», дзе паказаў групу партызан, якія слухаюць у падполлі Маскву. Аўтар разглядае сваю работу як эскіз для будучага манументальнага палатна. Але не варта забываць, што манументальнасць вызначаецца не столькі ўмоўнасцю і сімволікай, колькі маштабнасцю задумы, веліччу форм і філасофскай абагуленасцю вобраза. І думаецца, што ў гэтым аспекце эскіз патрабуе больш глыбокай распрацоўкі.

Мастак А. Кожын, графік па прафесіі, часам можа рабіць цікавыя адкрыцці і ў жывапісу. Многім запомнілася яго кампазіцыя «Цаною жыцця». Па арыгінальнасці маляўнічага прыёму сугучна з ёй новая карціна «Палессе». Захапляе і іншая яго карціна «На рацэ».

Цікавымі работамі прадстаўлены баранавіцкія мастакі: К. Максімцаў — пейзажы «Ранняя вясна», «У парку» (масла), Н. Бранавец—«Ілюстрацыя да аповесці Л. Панцялеева» (акварэль), В. Рамейка—«Партрэт Адама Міцкевіча» (чаканка), Э. Забежаева — «Піёны», «Валошкі» (акварэль), С. Асоскаў — «Нацюрморт», «Вечар» (масла).

З брэстчан, акрамя названых мастакоў, трэба адзначыць рэкамендаванага ў Саюз мастакоў, маладога скульптара І. Хоміча, які выступіў з двумя новымі работамі — экспрэсіўная кампазіцыя «Заклік» (таніраваны гіпс) і лірычны матыў «Ручаёк» (дрэва), што паэтычна перадае прыгажосць юнацтва.

Шкада, што некаторыя члены Брэсцкай арганізацыі Саюза мастакоў абмежаваліся свой удзел у справаздачнай выстаўцы паказам толькі старых работ.

Хочацца выказаць пажаданне, каб мастакі Брэстчыны больш увагі надавалі раскрыццю шматграннага вобраза нашага сучасніка, больш актыўна ўваходзілі ў жыццё, сцвярджаючы нормы развітага сацыялістычнага грамадства і выкрываючы ўсё, што перашкаджае нашаму руху наперад.

А. СУРСКІ.

Брэст.

ПЕСНЯ ПРА КВЕТКІ

СЁННЯ спаўняецца 70 гадоў з дня нараджэння старэйшай беларускай мастачкі Надзеі Прохараўны Варвановіч.

Жывапіс з юных гадоў захапляў Надзею. Малюнкі роднай прыроды, прыгажосць акаляючага свету, прасторы родных мясцін абуджалі дзяўчыну да працы. І яна працавала з вялікім задавальненнем.

— Ніколі не забуду таго дня, — гаворыць Надзея Прохараўна. — З якім хваляваннем я прынесла свае новыя работы ў 1941 годзе на выстаўку ў Дом мастака г. Мінска. Выстаўка была прысвечана Міжнароднаму жаночаму дню 8-га Сакавіка. Тады экспанаваліся мае «Нацюрморт з васількамі», «Партрэт піянера», «Галава старога» і інш.

Так пачалася плённая творчая дзейнасць мастачкі.

Н. П. Варвановіч нарадзілася ў Мінску ў 1903 годзе. Разам з бацькамі пераехала ў Новасібірск а потым у Растоў. Тут у 1935 годзе паступіла ў вячэрнюю студыю пры мастацкім вучылішчы. Праз два гады Надзея Прохараўна з мужам вярнулася ў родны Мінск і пачала наведваць студыю пры Доме народнай творчасці, дзе выкладалі вядомыя беларускія мастакі В. Волкаў, М. Керзін, пазней прыйшоў Н. Тарасікаў. Ён добра ўмеў растлумачыць студыйцам, як выбраць натуру, фарбу, колер, аб'ём, як будаваць кампазіцыю і многае іншае, што неабходна ведаць і разумець мастаку.

Пры Доме мастака ў Мінску працавала студыя павышэння кваліфікацыі маладых мастакоў у 1936—1940 гадах. Н. Варвановіч актыўна наведвала студыю, дабівалася павышэння майстэрства.

У 1940 годзе Н. Варвановіч удзельнічала ў Маскве ва Усесаюзным семінары самадзейных мастакоў па падрыхтоўцы да ўсесаюзнай мастацкай выстаўкі «Абарона СССР».

Але баталіста з Н. Варвановіч не атрымалася, яе пяшчотная жаночая душа пацягнулася да жыватворнай крыніцы чалавечай радасці, добрага настрою — да кветак. Кветкі — добры падарунак чалавеку. Натуральна, што многія мастакі ўводзяць кветкі ў свае нацюрморты, карціны. У творчасці Н. Варвановіч яны сталі асноўным кампанентам яе палотнаў.

Нацюрморт адзін з цікавых і складаных жанраў у жывапісе, які патрабуе асаблівых любоўных адносін да «мёртвай натуры». Кветкі прысутнічаюць амаль у кожным нацюрморце мастачкі і з'яўляюцца зачастую цэнтрам кампазіцыйнага рашэння палатна.

Пасля трывожнага ліхалецця вайны, у мірныя гады надышоў прыкметны ўздым у творчасці Н. Варвановіч. Адзін за адным з'яўляюцца нацюрморты маслам, пастэллю. Надзея Прохараўна праяўляе вынаходлівасць у падборы «прадметнага свету»: рыба, грыбы, гарбузы, дыні, апельсіны і, вядома, кветкі розных гатункаў і адценняў.

Для нацюрмортаў яна беражліва вырошчвае разнастайныя кветкі ў сваім маленькім кветніку. Яна любіць кветкі і ў жыцці.

Свае нацюрморты мастачка піша «шырокім пэндзлем», гарманічна спалучае плоскасці і аб'ёмы прадметаў, насычае іх актыўным пераможным колерам, багата выкарыстоўваючы нюансы і дадатковыя таны — нацюрморты «Хрызантэмы», «Адуванчыкі», «Піёны на вакне», «Бэз з садавінай».

У гэтай серыі мастачка любоўна, трапяткімі мазкамі піша асобныя пялёсткі кветкі, асвятляючы асобныя месцы, выбіраючы правільны тон. Нейтральны па колеру тон драпіроўкі гарманічна спалучаецца з галоўнымі прадметамі, добра перадае фактуру цяжкой гронкі бэзу. Мастачка не імкнецца адлюстраваць натуру, а стварае мастацкі вобраз, адчувае хараство і паэзію прыроды.

Простыя пастозныя мазочкі не кладуцца безразважна, глыбока вывучаецца структура і пластыка выгібаў.

Калі я зайшоў у майстэрню мастачкі, на мальберце стаяў пачаты новы нацюрморт з капустай і рассыпанымі стручкамі перцу.

У сваіх палотнах Н. Варвановіч перадае не проста прыгажосць прыроды, форму, колерную афарбоўку, яе цікавіць жывое жыццё, фактура кожнага прадмета.

Адна з нямногіх мастакоў у Беларусі Н. Варвановіч малюе пастэллю. Лепшыя з яе работ: «Белы бэз», «Нацюрморт з рушнікам», «Нацюрморт са сланечнікамі», «Горкі нацюрморт» з галоўкамі часнаку, вазай, гаспадарчай сумкай, «Нацюрморт з тэлевізарам», «Бэз з садавінай».

Цікавая серыя аўтапартрэтаў пастэллю, іх мастачка не паказвала на выстаўках.

— Рыхтуюся да персанальнай выстаўкі ў наступным годзе, — гаворыць Надзея Прохараўна.

Свае аўтапартрэты яна піша не выкарыстоўваючы люстэрка, а праз звычайнае аконнае шкло, пакрываючы тыльны бок цёмнай паперай. Цікавыя «Аўтапартрэт у беларускім касцюме», «Аўтапартрэт». Яны з вялікім мастацкім густам, псіхалагічнай характарыстыкай, падабенствам перадаюць аблічча жанчыны-творцы. Прыглушаныя таны пастэлі свецяцца з натуры, пераходзячы ад халодных да цёплых таноў, радуюць вока.

Удаюцца мастачцы і пейзажы. Яны носяць камерна-інтымны характар. «Рака ў лесе», «Сівая елка», «Нязжатае жыта», «Зіма», «Вясна-красна», «Бярозкі».

Ляжаць на паліцах поўныя папкі разнастайных малюнкаў алоўкам, вугалем, акварэллю, лінагравюры партрэтаў сына, маці.

Разнастайнасць творчых інтарэсаў, пастаяннае творчае гарэнне, выезды на эцюды ў любы час года, удзел у рэспубліканскіх мастацкіх выстаўках гавораць пра тое, што сярод нас натхнёна працуе цікавая, здольная мастачка.

Ул. САКАЛОЎ,
мастак.

ФОТАГРАФІКА — ГЭТА МАСТАЦТВА

ЗНАЁМІЦЦА з экспазіцыяй другой міжклубнай выстаўкі мастацкай фатаграфіі «Фотаграфіка-73» было надзвычай прыемна. Яе арганізатары — Мінскі абласны савет прафсаюзаў, Дом мастацкай самадзейнасці аблсаўпрофа і фотаклуб «Мінск». Пачуцці радасці, узнёсласці выносіў кожны, хто ўбачыў шматлікія работы лепшых фотамайстроў краіны.

Выстаўка сапраўды прадстаўнічая. Паказваліся работы аўтараў з Рыгі, Вільнюса, Каўнаса, Таліна, Масквы і Ленінграда, Мінска і Паўднёва-Сахалінска, Фрунзе і Нарыльска, Кіева і Паўночна-Дзвінска, Ніжняга Тагіла і Растова-на-Доне, Феадосіі і Караганды, Львова, Тбілісі, Віцебска, Гродна, Харкава... У Мінск было прыслана 1246 работ з сарака гарадоў краіны. Журы было ў надзвычай цяжкім становішчы: добрых здымкаў многа, усе не пакажаш. І вось мінчанам і гасцям была прапанавана экспазіцыя, у якой дэманстравалася 145 работ мастацкай фатаграфіі.

Пра што апавядала «Фотаграфіка-73»? У чым яе адметнасць? Характэрная асаблівасць яе — перш за ўсё ў шырокім паказе нашай рэчаіснасці, нашых працоўных будняў і тых важных надзённых праблем, якімі жывуць савецкія людзі. Бачыш новабудоўлі, шырокія праспекты гарадоў, знаёмішся з нашымі сучаснікамі — рабочымі, вучонымі, дзеячамі мастацтва.

Неабсяжная савецкая Радзіма. Не злічыць яе гарадоў і вёсак, маляўнічых куткоў, непаўторная прыгажосць яе лясоў, лугоў, азёр і рэк, гор. У экспазіцыі вялікае месца займаюць цудоўныя краявіды.

Уражвае работа вядомага фотамайстра з Данецка Рамана Барана «Штурман». Фотапартрэт апавядае пра мужнасць, адвагу, непахісную волю чалавека, які бясстрашна змагаўся з ворагам у гады Вялікай Айчыннай вайны. Наогул усе работы Р. Барана вызначаюцца высокім майстэрствам, уменнем перадаць найбольш яркія рысы ў характары сучасніка.

Серыю сваіх цікавых работ паказаў на выстаўцы Віталій Бутырын з Каўнаса. Яго здымкі адзначаны шматлікімі прызамі. Яны экспанаваліся ў 36 краінах свету. І на выстаўцы ў Мінску яго работы «Партрэт», «Сі-бемоль» (з цыкла «Амерыканскі дзённік»), «Ідылія», «Казка начнога лесу», «Мужчыны з бочкамі» і «Фотаграфіка» прыцягвала ўсеагульную ўвагу. Пераканаўчымі сродкамі паказвае В. Бутырын нашага сучасніка, жанчыну - будаўніка. Мы бачым прывабны жаночы твар, асветлены ўсмешкай, нібы сонечным праменнем. Гледзячы на гэты партрэт, можна многае расказаць пра чалавека, яго характар, яго ўнутраны свет, яго справы.

Міжволі спыняешся каля партрэта ўдарніка камуністычнай працы аленявода, паляўнічага Еўдакіма Еўтысава работы фотамайстра з Паўночна-Дзвінска Юрыя Палыгалава. Адметныя рысы героя не толькі ў знешніх прыкметах: адзенне, вочы. Прыгледзьцеся ўважліва, і вы абавязкова сэрцам адчуеце, што гэты чалавек любіць свой край, сваю заснежаную тундру, сваіх аленяў — усё тое, чаму ён прысвяціў жыццё. У вачах, у кожнай зморшчынцы твару столькі дабраты, чалавечнасці! «Партрэт» — вялікая ўдача Юрыя Палыгалава.

І наш мінскі фотамайстар Самуіл Левіх у партрэце «Сястра» здолеў перадаць духоўны свет сучасніцы, якая сваё жыццё прысвяціла высакароднаму служэнню чалавеку. «Сястра, сястрычка», — з такой любоўю звяртаюцца да яе хворыя, якім яна аддае сваю душэўную цеплыню.

— Прымушаюць спыніцца і задумацца, — гаворыць старэйшы фотамайстар Мінска выкладчык Беларускага політэхнічнага інстытута Мікалай Іванавіч Байцоў, — серыя «Пазбаўленыя дзяцінства» Ілмара Апкалнса з Рыгі і трыпціх «Хатынь» Сяргея Сапоцкага з Омска. Мы добра ведаем серыю «Хатынь» нашага мінскага фотамайстра Яўгена Казюлі. У руках жа амічаніна С. Сапоцкага камера знайшла новыя ракурсы. Прыгледзьцеся, калі ласка, якая спіна ў старога, што нясе забітага ўнука. Колькі адчаю, невыказнага гора вынес гэты мужны чалавек! Ну, а серыя «Пазбаўленыя маленства»? Дзеці за фашысцкімі кратамі мараць пра сонца і кветкі. І гэтую мару так хораша ўвасобіў аўтар. Мы бачым зроблены з калючага дроту рамонак... Гэта страшна... Гэта знаходка мастака, якая пра многае гаворыць.

Гасцям з Таліна Вахі Валдур і Кыль Олеву надзвычай спадабалася работа Станіслава Яворскага з Горкага «Род».

— Сімвалічная назва работы, — дзеляцца ўражаннямі фотамайстры з Таліна. — Старэнькая, згорбленая маці, якая шмат пабачыла на сваім вяку, рукі, што зведалі працу, праніклівы, умудроны жыццём погляд. А над ёй на сцяне — здымкі, цэлы род: яе дзеці, унукі, праўнукі...

Спыняе ўвагу сваім глыбокім філасофскім зместам работа Аляксандра Грынько «Эвалюцыя» (Саратаў).

...Стары пагнілы корч. Здаецца, ён вось-вось рассыплецца. Аж не. Прага да жыцця вялікая. Недзе ў яго глыбінях захаваліся здаровыя карэнні, і яны далі жыццё новаму дрэву, якое весела шапоча маладой лістотай. А побач гуляе маці з малым дзіцем. Хораша. Радасна. І хочацца жыць, і хочацца верыць...

Добрых работ на выстаўцы многа. Гэта і «Дарога» Марана Рэйна (Талін), «Дуб», «Бярозкі» Іонаса Кальвяліса (Каўнас), «Холадна» Яна Глейздса (Рыга), трыпціх «Кіжы» Юрыя Васільева (Мінск), «Вецер, дождж, каханне» Віктара Марыкоўскага (Паўднёва-Сахалінск). Яны ўражваюць высокім майстэрствам, глыбокім пранікненнем у жыццё.

Значна больш работ, чым на папярэдняй выстаўцы, экспанавалася ў колеры. «Дворык» Юрыя Весялова (Вільнюс), «Беларуская архітэктура» (з серыі) Валянціна Ждановіча (Мінск), «Далёкія сны» Віталія Казлова (Растоў-на-Доне), «Рыбак», «Вулачка» Павіласа Карпавючуса (Каўнас) і многа іншых. Яны добра глядзяцца, уражваюць. І ўсё ж хацелася б, каб і ў каляровых работах колькасны рост перарастаў у якасны, каб колер больш дапамагаў, а не адцягваў увагу гледача ад успрыняцця карціны.

Выстаўка закрылася, і вельмі шкада. Няхай бы яе лепшыя работы знайшлі для сябе пастаянную экспазіцыю ў адным з музеяў рэспублікі. Сёння ўзровень фотаграфікі набліжаецца да мастацтва, дастойнага самай шырокай прапаганды і ўвагі нашай грамадскасці. Выстаўка нагадала і пра тое, што да фотаграфікі трэба смялей звяртацца нашым газетам, часопісам, выкарыстоўваць яе багатыя магчымасці ў рэкламе, плакаце.

Д. КУДЗЕЛЬКА.

Р. БАРАН (г. Данецк). Руская зіма.



А. ГРЫНЬКО (г. Саратаў). Эвалюцыя.

РАСКАЗВАЮЦЬ РАБОТНІКІ КУЛЬТУРЫ

ПРАПАГАНДУЕМ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧУЮ ЛІТАРАТУРУ

У кніжным фондзе нашай бібліятэкі ёсць звыш двух тысяч кніг сельскагаспадарчай літаратуры. Апрача таго мы выпісваем часопісы па розных галінах гаспадаркі — па эканоміцы і арганізацыі працы, паляводству, жывёлагадоўлі, механізацыі і г. д. Асноўныя нашы чытачы, безумоўна, спецыялісты сельскай гаспадаркі. З 547 спецыялістаў, якія працуюць у раёне, сталымі чытачамі з'яўляюцца 450 чалавек.

Бібліятэка выкарыстоўвае розныя формы інфармацыі аб новай літаратуры. Мы арганізуем кніжныя выстаўкі, бібліяграфічныя агляды. Шырока прапагандуем і радыёагляды. Так, у апошні час, па мясцоваму радыё, прачыталі агляды «Новыя кнігі па сельскай гаспадарцы для спецыялістаў», «Новыя кнігі для жывёлаводаў па вытворчасці кармоў і кармленню жывёлы». Прапагандзе літаратуры служаць і завочныя канферэнцыі чытачоў, якія праводзяцца на старонках раённай газеты «Заря над Неманом».

Раённая бібліятэка правяла тэматычны семінар па прапагандзе сельскагаспадарчай літаратуры, на якім падрабязна было разгледжана пытанне інфармацыйна-бібліяграфічнага абслугоўвання спецыялістаў. Вялікую работу па давядзенню сельскагаспадарчых кніг да чытача праводзяць Галубоўская, Дубнаўская, Запольская, Рагозніцкая і іншыя сельскія бібліятэкі. Дубнаўская бібліятэка, напрыклад, заўсёды інфармуе аб новай літаратуры жывёлаводаў і механізатараў. Інфармацыйныя спіскі для жывёлаводаў вывешваюцца ў чырвоным кутку на ферме, а для механізатараў — у кабінеце спецыялістаў.

Усё гэта дазваляе значна павялічыць кола чытачоў, прывівае ў іх любоў да навінак літаратуры па сельскай гаспадарцы.

М. КОЖЫЧА,
загадчыца Мастоўскай раённай бібліятэкі.

ПЕРАДАВЫЯ КІНАФІКАТАРЫ

Анатоль Фёдаравіч Кутай працуе дырэктарам кінатэатра «Мір» горада Брэста. Гэты кінатэатр лічыцца адным з лепшых па культуры абслугоўвання гледачоў, па выкананню фінансавых планаў. За старанную працу А. Ф. Кутаю прысвоена званне заслужанага дзеяча культуры БССР, ён — кавалер ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

Званні заслужаных дзеячоў і работнікаў культуры носяць дырэктар Столінскага кінатэатра Сцяпан Адамавіч Цімановіч, дырэктар баранавіцкага кінатэатра «Кастрычнік» Георгій Паўлавіч Раскевіч, кінамеханік са Століншчыны Якаў Аляксандравіч Комік.

Ордэнамі і медалямі адзначаны кінамеханікі Сцяпан Залетка са Столінскага раёна, Іван Мельнічук з Брэсцкага раёна, Вольга Банцэвіч з Пінскага раёна.

Сярод кінафікатараў Брэстчыны — 328 ударнікаў, 6 брыгад і 29 калектываў камуністычнай працы.

Вялікую ўвагу мы надаем рабоце з кадрамі. 20 кінаработнікаў вобласці вучацца ў вышэйшых навучальных установах, 35 чалавек — у тэхнікумах і 180 — у завочных і вячэрніх сярэдніх школах. Толькі ў гэтай пяцігодцы падрыхтавана больш як 700 кінамеханікаў і іх памочнікаў.

За апошні час мы двойчы выходзілі пераможцамі ў рэспубліканскім сацыялістычным спаборніцтве. Кінаработнікам вобласці прысуджан пераходны Чырвоны сцяг Дзяржкамітэта СМ БССР па кінематаграфіі і БРК прафсаюза работнікаў культуры і першая грашовая прэмія за другі квартал 1973 года.

М. ГОЛУБ,
начальнік упраўлення кінафікацыі Брэсцкага аблвыканкома.

НАШ НАРОДНЫ

Дваццаць пяты год пры нашым доме культуры працуе драматычны калектыў. За высокае выканаўчае майстэрства яму прысвоена званне народнага тэатра. На Усесаюзным фестывалі самадзейнага мастацтва ў гонар 50-годдзя Савецкай улады за спектакль «Разлом» па п'есе Б. Лаўранёва тэатр быў удастоены звання лаўрэата.

Дыплом трэцяй ступені за спектакль па п'есе М. Матукоўскага «Амністыя» атрымаў тэатр на рэспубліканскім аглядзе тэатральнага мастацтва.

У рэпертуары народнага тэатра дома культуры звыш 70 спектакляў. Сярод іх — «Юнацтва бацькоў» Б. Гарбатава, «Варшаўская мелодыя» Л. Зорына, «Брэсцкая крэпасць» К. Губарэвіча, «Папараць-кветка» І. Козела, «Праз дваццаць год» М. Святлова, «Выклік багам» А. Дзялендзіка, «Толькі адно жыццё» А. Маўзона і іншыя.

Нядаўна адбылася прэм'ера спектакля «Дзень адчыненых дзвярэй» па п'есе І. Альшанскага і Н. Рудневай.

У тым, што драматычны калектыў жыве паўнакроўным жыццём, што спектаклі яго карыстаюцца вялікім поспехам у гледачоў, вялікая заслуга рэжысёра тэатра Барыса Аляксандравіча Шурына, які працуе тут бяззменна ўсе гэтыя гады.

Барысу Аляксандравічу прысвоена званне заслужанага работніка культуры БССР.

М. НЯФЁДАЎ,
дырэктар Бабруйскага гарадскога дома культуры.

ГАНДАЛЬ КНІГАМІ — СПРАВА АДКАЗНАЯ

У БЯРЭЗІНСКІМ раёне за апошнія гады прыкметна пашырылася і развілася кнігагандлёвая сетка. У райцэнтры працуе цэнтральная кнігарня, два спецыялізаваныя магазіны ёсць у вёсках. Шматлікія аддзелы і полкі маюцца ў сельмагах. Не апошняе месца займае і аўталаўка, якая выязджае ў «глыбінкі».

Неблагія ў раёне кадры прадаўцоў кнігі. Гэта пераважна моладзь, у якой апрача энергіі ёсць і спецыяльная адукацыя.

— Фактычнае выкананне плана таваразвароту па кнігах у нас заўсёды абганяе даведзенае заданне, асаблівых турбот не ўзнікае, — гаворыць намеснік старшыні праўлення райспажыўсаюза па гандлю Аляксандр Іванавіч Іванкоў.

І сапраўды. За дзесяць месяцаў план таваразвароту па кнігах выканан на сто тры працэнты.

І ўсё-такі ў арганізацыі кніжнага гандлю ў раёне існуе шмат праблем, якія патрабуюць вырашэння і ўдасканалення. З мэтай іх выяўлення зазірнем у кнігарні і іншыя кропкі кнігагандлюючай сеткі раёна.

Кніжная прадукцыя, дастаўленая з Мінскай абласной базы ў горад Беразіно, згружаецца спачатку на складзе ў райцэнтры. Старшы таваразнаўца райспажыўсаюза па кнігах В. Я. Чалей перадае літаратуру згодна накладной загадчыцы склада. А потым пачынаецца размеркаванне кніг па магазінах, якое ажыццяўляецца таксама пад кіраўніцтвам старшага таваразнаўцы.

За восем год работы В. Я. Чалей набыла значны вопыт у распаўсюджванні кніг, таму дзейнічае ўпэўнена і энергічна. Яна — экспедытар, які лічыць сваёй мэтай даставіць тавар на месца прызначэння, падпісаць накладную аб перадачы яго матэрыяльна адказным асобам — і з плеч далоў.

Вось і цяпер жанчына звяртаецца ў першую чаргу да загадчыцы цэнтральнага магазіна т. Якаўлевіч:

— Выбірай, калі ласка, Ганна Паўлаўна, на свой густ. І як мага больш. А вось гэтыя даю вам у абавязковым парадку...

— А дзе ж мне старыя кнігі дзяваць, чарга спісваць у макулатуру яшчэ не надышла. У мяне ж і так аж паліцы трашчаць, — адказвае Якаўлевіч.

На працягу дванаццаці год працы ў кніжным гандлі яна добра вывучыла попыт: дай рэдкія выданні, якія альбо зусім не паступаюць у раён, альбо паступаюць у аднымдвух экземплярах. Прывіваць жа густ, развіваць інтарэс у пакупнікоў да тых кніг, што ёсць у наяўнасці, — цяжкі, не вельмі цікавы занятак. Але ж масавы асартымент можна асвоіць толькі шляхам расшырэння кола пакупнікоў, прыцягнення новых аматараў літаратуры. А гэта не так проста, як здаецца неспрактыкаванаму ў галіне кніжнага гандлю чалавеку.

Хочацца папракнуць бярэзінскіх кнігагандляроў у тым, што яны не вельмі ахвотна ўстанаўліваюць паўсядзённыя кантакты з культурна-асветнымі ўстановамі, у прыватнасці, з бібліятэкамі. Загадчыца раённай кнігарні Ганна Якаўлевіч — рэдкі госць у раённай бібліятэцы. У той жа час загадчыца бібліятэкі Вольга Насульская амаль не заходзіць у кнігарню. Пры выпадковых сустрэчах паміж жанчынамі адбываюцца спрэчкі, сэнс якіх можна добра зразумець вось з гэтага дыялога:

— Колькі я вас прасіла, каб вы лепшыя кнігі прадавалі ў першую чаргу бібліятэцы, — выказвае папрок Вольга Насульская. — Аддаючы ў прыватныя рукі, вы ператвараеце кнігі ў мёртвы капітал, а ў нас яны былі б заўсёды ў абароце.

— Не, мы на гэта ніколі не пойдзем, не спрабуйце ўгаворваць, — пярэчыць Ганна Якаўлевіч. — Мы абавязаны прадаваць добрую кнігу ў розніцу з мэтай прыцягнення пакупнікоў. Урэшце, калі паступіць адзін экземпляр, мы і для сябе яго пакінем, можам прадаць сваім актывістам.

— Вось тое і дрэнна, што вы ўсё лепшае ці сабе пакідаеце, ці аддаяце знаёмым, а нас абыходзіце, — працягвае крыўдзіцца бібліятэкарка. — А ў нас кожны можа стаць на чаргу і атрымаць пажаданую кнігу.

— Не вельмі ў вас дачакаешся, усё на руках ды на руках, — не згаджаецца Ганна з довадамі Вольгі Насульскай.

— На руках, дык гэта ж добра, — даказвае сваё бібліятэкарка. — А хіба вы правільна робіце, прадаючы кнігі за межы раёна?..

Адным словам, згоды і ўзаемаразумення так і не дасягаецца. А дарэмна! Сумесныя намаганні райбібліятэкі і кнігарні маглі б павялічыць колькасць чытачоў і пакупнікоў. Варта было ім правесці канферэнцыі чытачоў па новых кнігах беларускіх празаікаў і паэтаў, як у беларускім аддзеле паявіліся новыя аматары літаратуры.

У раёне ёсць некаторы вопыт па распаўсюджванню кніг сіламі актыву. Наладжванне выставак і віктарын, перасоўных кіёскаў на нарадах і ў людных месцах, рэклама лепшых кніг па мясцоваму радыё і ў райгазеце, штатныя і грамадскія кніганошы, — усе гэтыя прагрэсіўныя метады садзейнічаюць набліжэнню кнігі да пакупніка, выяўленню і своечасоваму задавальненню запатрабаванняў насельніцтва. Аднак гандлюючая сістэма не заўсёды эфектыўна выкарыстоўвае патэнцыяльныя магчымасці грамадскіх распаўсюджвальнікаў кніг. З гэтага выпадку хацелася б прыгадаць колішнюю добрую традыцыю піянераў і камсамольцаў мясцовых школ, якія хадзілі са стосікамі кніг па ўстановах, наведвалі нават кватэры, усюды шукалі аматараў розных літаратурных жанраў. Камсамольскія і піянерскія арганізацыі спаборнічалі тады паміж сабой, хто больш распаўсюдзіць кніг. Пераможцам уручалі падарункі і пахвальныя граматы. І вельмі шкада, што каштоўнае пачынанне не знайшло і не знаходзіць цяпер сваіх прадаўжальнікаў.

Загадчыца раённай кнігарні Ганна Якаўлевіч у пачатку сваёй дзейнасці спрабавала наладзіць кантакт з камсамольскім і піянерскім актывам, хадзіла нават у райком камсамола. Там яе сустрэлі ледзь не з захапленнем:

— Моладзь павінна не толькі чытаць кнігі, але і прапагандаваць іх, распаўсюджваць у масах. Распрацуйце мерапрыемствы канкрэтна, мы іх на наступным бюро зацвердзім і...

Энергіі і аптымізму хапіла тады не надоўга. Райком камсамола не змог сканцэнтравацца на «кніжным пытанні» як след, махнулі бездапаможна рукамі на свае задумы і прадаўцы. Яны нават не здолелі арганізаваць работу грамадскага савета «Сябры кніг», які нічым сябе не праявіў і цяпер існуе толькі на паперы. А сілы тут

Тэхнічную бібліятэку Баранавіцкага завода станкапрылад па праву лічаць яшчэ адным цэхам. Разам са службамі навукова-тэхнічнай інфармацыі і навуковай арганізацыі працы бібліятэка праводзіць канферэнцыі з рацыяналізатарамі і вынаходнікамі. Тут чытачы знаёмяцца з тэхнічнымі навінкамі, абмяркоўваюць вынаходніцтвы, якія варта ўкараніць на сваім прадпрыемстве.

Вялікую і карысную работу вядзе бібліятэкар Марыя Дзмітрыеўна Фірсава.

На здымку: яна знята разам з актыўнай чытачкай Таццянай Аляксандраўнай Сабінскай.

Фота Р. АЛЫМАВА.

Знаёмцеся: Раіса Кручкова, Ніна Мянькова, Людміла Барышава і Таццяна Строган (злева направа). Гэты вакальны квартэт Насовіцкага дома культуры Добрушскага раёна з поспехам выступае перад хлебаробамі, жывёлаводамі, механізатарамі.

За актыўны ўдзел у мастацкай самадзейнасці квартэт нядаўна ўзнагароджан Ганаровай граматай раённага аддзела культуры.

Фота М. ХУДАЛЕЕВА.

АБ ЧЫМ ГАВОРАЦЬ РЭЛІКВІІ

Гомельскі абласны краязнаўчы музей... Усе, хто наведае яго, знаёмяцца з рэліквіямі баявой славы, са шматлікімі дакументамі і экспанатамі. Беражліва захоўваюцца тут пранесеныя праз гады партызанскай барацьбы сцягі, пад якімі хадзілі ў бой народныя мсціўцы атрадаў і брыгад імя Кірава, імя Чапаева, імя Варашылава Гомельскага партызанскага злучэння. Тут жа сцягі воінскіх часцей і злучэнняў, якія вызвалялі Гомель і вобласць ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Побач партрэты 118 Герояў Савецкага Саюза — ураджэнцаў Гомельшчыны, 22 кавалераў ордэна Славы.

Аб воінскай доблесці, аб цяжкасцях партызанскай і падпольнай барацьбы, аб адважных воінах і іх баявых справах расказваюць перадсмяротныя пісьмы Героя Савецкага Саюза Ц. Барадзіна і І. Шылава, кніга ўспамінаў «Салдацкі абавязак» маршала Савецкага Саюза К. К. Ракасоўскага, легендарны гвардзейскі мінамёт «Кацюша», пішучая машынка «Партызанка», дакументы і асабістыя рэчы камандзіра 63 стралковага корпуса генерал-лейтэнанта Л. Р. Пятроўскага, асабістыя рэчы іншых відных савецкіх военачальнікаў.

У экспазіцыі «Камсамольска-маладзёжнае падполле» незабыўнае ўражанне пакідаюць дакументы Калінкавіцкай падпольнай арганізацыі, Брагінскага, Васілевіцкага, Даманавіцкага падполляў. Бессмяротнай славай авеяны імёны кіраўнікоў і членаў гэтых падпольных арганізацый.

Вось некалькі экземпляраў сатырычнай партызанскай газеты «Раздавім фашысцкую гадзіну» з малюнкамі і трапнымі вершаванымі радкамі юнага В. Букатага — былога вучня 9-га класа 4-й сярэдняй чыгуначнай школы Гомеля.

На іншых стэндах музея дакументы, якія сведчаць пра мужнасць савецкіх салдат і афіцэраў, расказваюць пра ажыццяўленне грандыёзнай баявой аперацыі часцямі Савецкай Арміі пры фарсіраванні Дняпра ў раёне Лоева. Вось фота, на якім аб'ектыў адлюстраваў распрацоўку плана гэтай аперацыі ў штабе генерала П. І. Батава.

Савецкая Армія гнала ворагаў на захад. Каля Шацілак подзвіг А. Матросава паўтарыў Герой Савецкага Саюза П. Мірашнічэнка, які грудзьмі закрыў амбразуру варожага дота. На берагах Дняпра загінуў беларус-гамяльчанін Б. Царыкаў. Савецкія людзі шануюць памяць герояў. Сёння іх імёнамі названы вуліцы нашых гарадоў.

Экспанаты расказваюць пра подзвігі на гомельскай зямлі рускага К. Захарава, грузіна Г. Майсурадзе, узбека С. Джураева, армяніна С. Атанасяна, татарына Г. Мурзаханава і многіх іншых.

Ёсць у музеі экспанаты, якія апавядаюць пра ўдзел гамяльчан у партызанскіх атрадах Балгарыі, Польшчы, Францыі, Чэхаславакіі, Югаславіі.

А. КАРАЛЁЎ,
гвардыі малодшы сяржант запасу.

можна было б сканцэнтраваць немалыя. Плённа маглі б працаваць у гэтым напрамку такія энтузіясты, уладальнікі асабістых бібліятэк, як А. Комар, Я. Собаль, М. Лысова, У. Каўбаска і іншыя.

У вёсцы Дзмітравічы знаходзіцца спецыялізаваны кніжны магазін. Ім загадвае Роза Чалей, якая добра ведае попыт насельніцтва, імкнецца задаволіць патрэбы пакупнікоў, у час выканаць іх заказы, даць своечасовую інфармацыю. Настаўнікі, спецыялісты сельскай гаспадаркі, урачы, рабочыя мясцовага саўгаса хутка раскупліваюць творы класікаў марксізма-ленінізма, кіраўнікоў партыі і ўрада, кнігі на грамадска-палітычныя тэмы, метадычную і вучэбную літаратуру. Не залежваюцца на прылаўках добрыя кнігі па дзіцячай і мастацкай літаратуры. Значную дапамогу аказвае сельская кнігарня настаўнікам і вучням мясцовай дзесяцігодкі ў набыцці вучэбных дапаможнікаў і самай разнастайнай мастацкай літаратуры па праграме і для пазакласнага чытання. Усё гэта служыць пераканаўчым доказам таго, што наспела неабходнасць адкрываць спецыялізаваныя кнігарні ў такіх густанаселеных пунктах, як Паплавы, Якшыцы, Багушэвічы, Сяліба, Мікулічы і іншыя.

Вёска Пагост — цэнтр калгаса «Камунар»... Прадаўшчыцай там працуе Ганна Сушкевіч. Яна скардзіцца на слабы попыт на кнігу. Але ж у гэтым віноўная сама Ганна Сушкевіч. Бо яна не вывучае інтарэсы пакупнікоў, не імкнецца згуртаваць вакол сябе грамадскіх распаўсюджвальнікаў, не вядзе арганізатарскай работы. Спрабуючы даць аналіз кантынгенту сваіх пакупнікоў, яна выдзеліла сярод іх толькі тры катэгорыі: дзяцей, тых жыхароў, якія вымушаны адкупліваць бібліятэцы згубленыя кнігі, і прыезджых — незнаёмых наведвальнікаў. З мясцовых жа аматараў кнігі мала хто карыстаецца паслугамі магазіна. А Пагосцкая кнігарня размешчана побач з сярэдняй школай і сельскай бібліятэкай.

Але яна не стала адным з цэнтраў шырокага распаўсюджвання літаратуры. А старшыня Пагосцкага спажывецкага таварыства В. Няхай прытрымліваецца вельмі простай тактыкі:

— План дадзім за кошт вучэбных дапаможнікаў, а ўсё, што залежваецца, уключым у акт на спісанне ў макулатуру. Нават уцэньваць не будзем. Іншага выхаду няма. Хіба сілком прымусіш людзей купляць кнігі?

Падобныя скептычныя разважанні можна пачуць і ад прадаўцоў сельмагаў, у якіх ёсць кніжныя аддзелы, куткі, паліцы. Гэтымі словамі яны імкнуцца апраўдаць адсутнасць належнай работы сярод насельніцтва, свае фармальныя адносіны да выканання планаў па распаўсюджванню кніг.

Цяпер вось пра што хочацца сказаць. Вучні і іх бацькі перад пачаткам навучальнага года гуртам ідуць у райцэнтр з самых аддаленых вёсак або едуць у іншыя гарады за набыццём падручнікаў. Прадаўцы самі разумеюць, наколькі крыўдна ім губляць такога актыўнага пакупніка, як школьнік. Але што зробіш, калі заяўкі раёна, які забараняе прадаваць школьную літаратуру ў розніцу, часта застаюцца неажыццёўленымі. Школы па розных прычынах не паспяваюць у час выкупіць належную ім колькасць дапаможнікаў, набываюць іх у іншых месцах і падручнікі пакрываюцца пылам у чаканні наступнага навучальнага года.

З кожным годам узрастае цікавасць савецкіх людзей да кнігі. Абавязак прадаўцоў літаратуры і грамадскіх арганізацый — задаволіць попыт насельніцтва на кнігу, адкрыць самы шырокі доступ да літаратуры, наладзіць даведачна-інфармацыйную службу.

Хутчэйшае вырашэнне ўзнятых намі пытанняў, якія, мусіць, будуць у той ці іншай меры характэрны не толькі для Бярэзінскага раёна, будзе садзейнічаць таму, каб кніга рабілася ўсё больш эфектыўным сродкам камуністычнага выхавання людзей, актыўней удзельнічала ў мабілізацыі працоўных на выкананне задач, пастаўленых XXIV з'ездам партыі.

М. НЯХАЙ,
спец. кар. газеты «Літаратура і мастацтва». Бярэзінскі раён.

РЫХТУЕЦЦА Ў ДАРОГУ ФІЛЬМ...

Работа над фільмам, як вядома, не заканчваецца ў павільёнах і цэхах кінастудыі. Адсюль, ужо зманціраваны і агучаны, ён накіроўваецца на капіравальную фабрыку і пасля гэтага сотнямі экземпляраў разыходзіцца ва ўсе бакі краіны, трапляе «ў рукі» кінапракатчыкаў.

І ад іх у пэўнай меры залежыць поспех таго, як новая стужка «пойдзе» ў масы.

Так, выхаду кінакарціны на экран папярэднічае вялікая, карпатлівая падрыхтоўка. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова хоць на некалькі мінут завітаць у Гродзенскую кантору кінапракату.

Мантажніцы на спецыяльных сталах, а калі трэба, то і на экране, праглядаюць кожную фільмакопію — ці няма фабрычных дэфектаў. Потым, падклеіўшы да кожнай часткі так званыя ракорды, прысвойваюць ім інвентарныя нумары.

Тым часам на складзе гатовыя, праверaныя фільмы выдаюцца кліентам.

Гэта, калі можна так сказаць, тэхнічная і дыспетчарская служба. А рэкламна-прапагандысцкая? Варта адзначыць, што і тут няма «перабояў». Плакаты, даведкі аб фільмах, фотакамплекты, прэсклішэ і іншыя матэрыялы рэгулярна дасылае інфармацыйна - рэкламнае бюро Галоўнага ўпраўлення кінафікацыі і кінапракату.

Да гэтага трэба дадаць, што па два-тры клішыраваных плакаты атрымлівае ў сярэднім кожная кінаўстаноўка. А кінамеханікі забяспечваюцца бюлетэнем «На экранах Беларусі».

Пра навінкі кіно, лепшыя савецкія фільмы гледачы даведваюцца з раённых і абласной газет, радыё і тэлевізійных перадач. Трыццаць з гэтых перадач было прысвечана сёлета такім папулярным стужкам, як «А зоры тут ціхія...», «Сібірачка», «Зямля, да запатрабавання», «Вуліца без канца», «Гэта салодкае слова — Свабода». Мясцовая студыя тэлебачання наладжвае таксама агляды месячнага рэпертуару, акцэнтуючы ўвагу гледача на лепшых творах кінамастацтва.

З чарговым рэпертуарам кінатэатраў знаёмяць насельніцтва стэнды, што ўстаноўлены ў Гродна і Лідзе. Іх прыгожа афармілі мастакі!

Рэкламная работа падмацоўваецца і іншай практычнай дзейнасцю кінапракатчыкаў і іх актыву. Гаворачы так, я маю на ўвазе рэпертуарную камісію. Узначальвае яе ўпраўляючы канторай М. І. Гнядко. Камісія складае месячныя рэпертуарныя планы выпуску мастацкіх фільмаў у кінатэатрах Гродна, раённых цэнтраў і ў буйных населеных пунктах. На першым плане заўсёды знаходзяцца стужкі, якія сваім зместам найбольш адпавядаюць палітычным падзеям і знамянальным гісторыка - рэвалюцыйным датам.

Шырока выкарыстоўваюцца і такія формы прапаганды сярод насельніцтва твораў кінамастацтва, як фестывалі, тэматычныя паказы фільмаў айчыннай вытворчасці і сацыялістычных краін.

Высокая зладжанасць калектыву канторы і садружнасць з прадстаўнікамі партыйных, савецкіх, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый даюць добры плён. Нядаўна Гродзенскія кінапракатчыкі за лепшыя паказчыкі ў сацыялістычным спаборніцтве па выніках за трэці квартал атрымалі другую грашовую прэмію Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі.

А. ФРАДКІН,
старшы інспектар аддзела праката Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі.



Агульны выгляд мантажнага цэха Гродзенскай канторы кінапракату.

Буйнейшы ў абласным цэнтры шырокафарматны кінатэатр «Гродна».

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

Тамары ЦУЛУКІДЗЕ — 70

19 снежня пісьменніцы Тамары Цулукідзе спаўняецца 70 год. З гэтай нагоды праўленне Саюза пісьменнікаў рэспублікі накіравала юбіляру прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагая Тамара Рыгораўна!

З нагоды Вашага 70-годдзя з дня нараджэння шлем Вам самыя найлепшыя сардэчныя віншаванні.

Свой жыццёвы шлях Вы спачатку звязалі з тэатральным мастацтвам, паспяхова выступалі на сцэне Акадэмічнага тэатра імя Руставелі. Вам нададзена званне заслужанай артысткі Грузінскай ССР.

Літаратурную працу Вы пачалі з рэцэнзій і артыкулаў пра тэатр. Прыезд у Беларусь, якая стала для Вас другой радзімай, адзначыўся актыўнай творчасцю. Вашы нарысы і п'есы для школьнай самадзейнасці сталі часта з'яўляцца на старонках часопісаў «Работніца і сялянка», «Вясёлка». Потым яны выйшлі асобнымі выданнямі. Вялікую карысную працу прарабілі Вы, знаёмячы школьнікаў з тэатральным мастацтвам, шмат Вашых нарысаў прысвечана паказу цікавага жыцця дзяцей, якія заняты вучобай і піянерскімі справамі. Вашы яркія і каларытныя творы вучаць юнае пакаленне пазнаваць жыццё, самааддана любіць сваю Радзіму. Прыемна адзначыць, што Вы няблага працуеце і як перакладчыца, знаёміце беларускага чытача з лепшымі здабыткамі літаратуры братняга грузінскага народа.

Жадаем Вам, дарагая Тамара Рыгораўна, добрага настрою, новых творчых поспехаў і доўгіх-доўгіх год жыцця».

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага віншавання і жадае Тамары Рыгораўне доўгіх год жыцця і здзяйснення творчых задум.

З ПОШТЫ «ЛІМа»

СЛОВА ДА СЛОВА...

Наколькі вялікія, сапраўды невычарпальныя песенныя магчымасці фальклору — засведчыў занальны абласны фестываль самадзейнага мастацтва па фальклору і этнаграфіі, які адбыўся нядаўна ў Салігорску. Удзел у фестывалі прынялі самадзейныя артысты Копыльскага, Слуцкага, Любанскага, Старадарожскага і Салігорскага раёнаў. Асаблівую асалоду атрымалі і гледачы, ад выступленняў салігорскіх самадзейных артыстаў.

На сцэне вакальная група дзяўчат з Пузіцкага сельскага клуба. Гучыць беларуская народная песня «Пасею гурочкі». Удалы запеў, моцныя, разлівістыя галасы робяць гучанне песні надзвычай прыгожым.

— Вельмі прыемна, — гаворыць член журы кампазітар І. І. Кузняцоў, — што гэтыя старадаўнія песні выконвае моладзь. Чутно песеннае Палессе!

Слова да слова, радок да радка збірала і запісвала песні «Чаму не прыйшоў», «Ой хаджу я, хаджу», «Ой, калі ж той вечар» загадчыца Бранчыцкай сельскай бібліятэкі Марыя Панкевіч. Народны хор з вёскі Бранчыцы ўжо двойчы выступаў у сталіцы рэспублікі. Адны толькі касцюмы ў артыстаў хору — сапраўдныя творы мастацтва. Сярод спевакоў — свінарка саўгаса «Случ» Кацярына Барташэвіч, даяркі Людміла Таміла, Ганна Панкевіч, брыгадзір Канстанцін Шыкер, электразваршчык Аркадзь Панкевіч, настаўніцы Марыя Вечар і Фаіна Іскрыцкая.

Надзвычай спадабалася гледачам «Беларускае вяселле» ў выкананні самадзейных артыстаў з Пварчыцкага сельскага клуба. Аркестр — інструментальны квінтэт з Мазуршчынскага сельскага клуба — выканаў «Польку», «Свеціць месяц» і іншыя вясельныя танцы.

Л. ДЗЕНІСЮК.

НАВІНКІ ШКОЛЬНАГА МУЗЕЯ

НЯДАЎНА пошта з далёкага татарскага горада Альмецеўска прынесла нашаму музею цікавую бандэроль — заслужаная артыстка Татарскай АССР З. Туешава прыслала нам афішу і здымкі са спектакля «Трыбунал» А. Макаёнка, які іграецца там на татарскай сцэне. Калі глядзіш на фатаграфіі сцэн са спектакля «Трыбунал», пастаўленага Акадэмічным тэатрам імя Я. Купалы ў Мінску, і параўноўваеш з гэтымі, то неяк больш канкрэтна адчуваеш далягляды савецкага мастацтва. П'есы беларускіх аўтараў перакладаюцца на мовы братніх народаў, карыстаюцца папулярнасцю ва ўсіх рэспубліках краіны.

Лепшыя творы сучаснай літаратуры прыцягваюць увагу і ў замежных краінах. І аб гэтым сведчаць некаторыя экспанаты нашага музея. Здымкі і праграму спектакля «Трыбунал» мы атрымалі з Беластока, дзе камедыю паставіў Драматычны тэатр імя А. Вянгеркі. Польскі перакладчык А. Дравіч прыслаў нам выдадзеную ў ПНР аповесць «Сотнікаў» В. Быкава. Такім чынам, наш музей мае кнігу ў арыгінале з аўтографам пісьменніка і ў польскім перакладзе з аўтографам перакладчыка.

Збіраем мы матэрыялы, звязаныя таксама з беларускім фальклорам, з дзейнасцю выдатных вучоных, нашых землякоў.

Галіна ШАЙНОГА,
старшыня савета літаратурна-краязнаўчага музея Гудзевіцкай школы.
Гродзенская вобласць.

УРОКІ ЭСТЭТЫКІ

Для вучняў старшых класаў віцебскіх школ гарадскі аддзел народнай асветы, гарком ЛКСМБ і Беларускі драматычны тэатр імя Я. Коласа наладзілі пад назвай «Два ўрокі эстэтыкі» лекторый па праблемах тэатральнага мастацтва. Заняткі ў ім далучаюць школьнікаў да некаторых істотных пытанняў гісторыі і сённяшняга дня сцэны. Перад пачаткам адбываюцца гутаркі з прафесійнымі рэжысёрамі і артыстамі, потым тэатр паказвае спектакль, які абмяркоўваецца вучнямі.

«Два ўрокі эстэтыкі» праслухалі ўжо вучні дванаццаці школ горада. Адбыліся гутаркі на тэму «Мастацтва быць гледачом», выступілі народныя артысты БССР Ц. Сяргейчык, Ф. Шмакаў, З. Канапелька, І. Матусевіч, А. Трус, прадстаўнікі творчай моладзі трупы коласаўцаў. Вялікую цікавасць выклікае стары і заўсёды малады спектакль «Несцерка» па п'есе В. Вольскага. Да тэмы «Тэатр Астроўскага» коласаўцы аднаўляюць «Багну»; лекцыйнымі заняткамі, прысвечанымі вялікаму рускаму драматургу, будзе кіраваць кандыдат філалагічных навук З. Андрыянава.

Віцебск. **Ф. НІКАЛАЕЎ.**

ШЧЫРАЯ ПАДЗЯКА

ЛІСТ З ЛІТВЫ

Сёлета мне ўпершыню давялося пабываць у Хатыні. Пра гэтую вёску я і раней ведаў — чытаў у газетах і часопісах. Чуў ад людзей, якія там пабывалі. Але зусім іншая справа ўбачыць гэтую святыню зямлі беларускай сваімі вачыма...

Тут, у Хатыні, я ўспомніў іншую вёску — нашу літоўскую вёску Пірчупіс, лёс якой быў падобны на лёс Хатыні.

Чаму я пачаў з Хатыні і Пірчупіса?

Мабыць таму, што дружба літоўцаў і беларусаў ніколі раней не была такой моцнай, як у гады суровых выпрабаванняў, у час агульнай барацьбы супраць фашызму. Нам, пасляваеннаму пакаленню, гэтую дружбу перадалі бацькі нашы. І каб была яна яшчэ мацнейшай, мы прыходзім сюды, да магіл, каб яшчэ і яшчэ раз успомніць, якою цаною нашыя бацькі заплацілі за свабоду.

Цікавіцца жыццём Беларусі я пачаў не выпадкова, і шчыра палюбіў гэты край таксама не выпадкова. Дружба беларускага і літоўскага народаў справдэчная. І пачалася яна ў агульнай барацьбе супраць царскага прыгнёту, у паўстанніцкіх атрадах Кастуся Каліноўскага.

Вось чаму мне такая дарагая гэтая зямля, вось чаму я так цаню гэтую дружбу.

Пазнаць Беларусь, яе жыццё, а асабліва літаратуру мне памаглі сябры-беларусы, якім я за гэта буду ўдзячны ўсё маё жыццё. У літаратуры брацкага народа я знайшоў вельмі многа добрага і цікавага, знайшоў шмат рысаў, якія ўласцівы і літоўскай літаратуры.

Каб я мог у арыгінале чытаць творы беларускіх пісьменнікаў, неабходна было авалодаць беларускай мовай. І дапамаглі мне ў гэтым мае сябры — беларускія студэнты.

Вядома, я яшчэ не так добра ведаю беларускую літаратуру, каб мог шмат пра яе гаварыць. Хачу выказаць шчырую ўдзячнасць братам-беларусам за ветлівыя сустрэчы, за гасціннасць, з якой яны ставяцца да братоў з іншых рэспублік.

Юозас РЫБІКАЎСКАС,
студэнт філфака ВДУ імя Капсукаса.

РАЗМОВА ПРА НАДВОР'Е

(Заканчэнне. Пачатак на 6—7 стар.)

— Ну, на гэта і ў нас розуму хопіць, — сказала Зіна расчаравана. — Я думала, што, можа, дажджу зусім не будзе.

— Дождж будзе.

Запанавала цішыня. Абедзве дачкі сядзелі пакрыўджаныя, пакрыўджаны стаяў і Сэндуцэ — хлопчыка ўжо больш не гладзілі па галоўцы, і ён не разумеў, якая яго віна. Усе тры сястры сталі скоса паглядаць на Міхуцэ — у рэшце рэшт, брат ён нам ці не брат? А калі брат, дык як ён можа трываць, калі ягоных сясцёр крыўдзяць? Міхуцэ закурыў, закасаў свае мокрыя калашыны і ваяўніча кінуўся ў бой:

— Тата, а калі замест дажджу абрынецца бура? Патрэбна яна мне, вам, ці, можа, калгасу патрэбна?

Іяана безапеляцыйна заўважыла:

— Загінуць усе сады ў калгасе.

Клопаты Анікі былі больш сціплыя. Паглядзела трывожна на свой садок, сказала:

— Ікім, у нас расце некалькі маладых дрэўцаў. Ты сам іх садзіў, сам паліваў...

Ікім моўчкі ўстаў і падаўся ў сад паглядзець на маладыя дрэўцы. Усе з палёгкаю ўздыхнулі — нарэшце ён зрушыў з месца. Сачылі, як стары ходзіць вакол саджанцаў; былі яны кволыя і нейкія бездапаможныя — і лісточкаў мала, і галінак, і зямлі было неяк мала для іх...

Вярнуўся Ікім засмучаны. Вуглаваты, неачэсаны лоб зрабіўся шэры, зямлісты. Сеў на каменную глыбу і коратка сказаў:

— Будзе дождж.

— А як бура? — перапытаў храбры Міхуцэ.

— Няхай сабе бура, — няўмольна дадаў Ікім.

У гэтую хвіліну ён зрабіўся для ўсіх нейкі чужы, было і шкада яго і боязна яго. Сам Ікім, мабыць, таксама адчуў сваю адзіноту і, можа, для таго, каб вярнуць сабе сям'ю, а можа, проста дзеля ісціны, сказаў:

— А вы лічыце, што садам не патрэбны буры? Патрэбны.

— Навошта яны? — пацікавіўся Міхуцэ.

Ікім усміхнуўся і, на вялікае здзіўленне ўсіх прысутных, растлумачыў ціхім, ласкавым голасам:

— Бура патрэбна для таго, каб праверыць сад, яна сагне яго, зробіць спробу вырваць з зямлі кожнае дрэва... З моцным нічога не зробіцца. Ну, а тыя, што падгнілі, загінуць. Дык навошта тады бедаваць? Каму яны патрэбны, гэтыя кволыя, гнілыя дрэвы? Лепш ужо на іх месцы няхай растуць іншыя, больш моцныя. Вось гэтак яно...

Упершыню за ўсю раніцу Іяана не ўсміхнулася. Перахрысцілася і жаласлівым голасам вымавіла:

— Які жорсткі, божа ты мой, божа...

— Ён вельмі ўжо стары, — дадала Марына.

— Трэцюю ноч чалавек вачэй не змружыў, — вырашыла Аніка абараніць Ікіма.

— У яго дзве кантузіі... — невядома для чаго сказала Зіна.

Толькі Міхуцэ штосьці доўга маўчаў, не выказваў сваёй думкі. Потым уздыхнуў.

— Гэта чыстая праўда, сястрычкі...

— Ты таксама за буру?

— Так.

Ён устаў. Гэта былі даўнія разважанні Міхуцэ аб жыцці, толькі ён не мог іх сфармуляваць як след. Цяпер жа думка як бы ажыла — у яе паявіліся косці, мяса, сваё сэрца. Міхуцэ, не спяшаючыся, падаўся сваёй сцяжынкай дадому і панёс гэтую мудрую думку так, як нясуць немаўлятка, а ўжо дзяцей ён умеў насіць — іх у яго была поўная хата...

Ціха нашэптваючы штосьці сабе пад нос і падмятаючы траву сваёю шырокаю квяцістаю спадніцаю, пайшла Іяана. Нікому не сказала «да пабачэння», ніхто не пажадаў ёй шчаслівай дарогі.

Сёстры, якія асталіся з бацькам, зрабілі спробу сваімі сіламі вярнуць Ікіма да размовы пра надвор'е, але ў іх нічога з гэтага не атрымалася. Гаворка была скончана. Ікім знайшоў у траве новую былінку і зноў стаў перабіраць яе зубамі. Сёстры пайшлі. Сэндуцэ, высока ўзняўшы над галавой дранік, паклыпаў услед за маткаю.

Цяпер яны сядзелі ўтрох — бацька, маці і дачка. Сядзелі, і невядома чаго яны сядзелі, калі ўжо ўсё сказана, ўсё вырашана. Раптам з саду вярнуўся Сэндуцэ, крышку не дабег, кінуў недаедзены дранік і пабег быў назад, але Ікім уладна паклікаў яго. Хлопчык нясмела наблізіўся.

— Ты чаго кінуў дранік?

— А я болей не хачу.

— Тады трэба было сюды пакласці. Хто цябе вучыў кідаць хлеб пад ногі?

Ікім устаў, падышоў да хлопчыка, спусціў штонікі і дубцом загрэў яго колькі разоў. Дзяўчына ў моднай кофтачцы ажно галаву ўцягнула ў плечы. Аніка кінулася была ратаваць унука, але ён ужо бег сцежкаю па садзе, адной рукой падтрымліваючы штонікі, а другой выціраючы слёзы.

Ікім стомлена сеў на камень, як быццам для таго, каб раз-другі агрэць гэтаю хварасцінаю, яму трэба было аддаць усе свае сілы.

Дзяўчына амаль шэптам сказала:

— Тата...

Ікім здзіўлена паглядзеў на яе — што яна, уласна кажучы, хоча сказаць? Позірк у яго быў такі, што дзяўчына не змагла ўжо вымавіць ні слова. Ікім паглядзеў яшчэ колькі часу моўчкі, падняўся і, перабіраючы зубамі былінку, пайшоў дадому.

Астаўшыся з дачкою, Аніка з жахам у голасе спытала:

— Што ж ты нарабіла, дачушка?

Дзяўчына заплакала. Услед за ёю праслязілася і Аніка. Яны яшчэ доўга сядзелі ля каменнай глыбы і ціха плакалі. Потым Аніка рашуча ўстала:

— Хопіць раўці... Ідзі за мной...

Усё ж яна была ягоная жонка. Пражыла з ім доўгае жыццё. Нагледзелася, як ён перабірае зубамі былінкі... Зайшла ў хату, рашуча, сказала ўладна і злосна:

— Паслухай, Ікім...

Ён ляжаў на лаве з заплюшчанымі вачмі, і былінка заснула на ягоных грудзях. Яны ціха выйшлі, селі ў дальнім кутку саду, дзе іх ніхто не бачыў, і амаль да самага вечара шапталіся. Калі сонца схавалася за небасхілам, Аніка на дыбачках зашла ў хату, узяла абодва чамаданы і гэтак жа ціха, на дыбачках, вышла. На дварэ адамкнула адзін, паклала туды з пяток дранікаў і пайшла праводзіць дачку. Вярнулася позна, спатыкаючыся і выціраючы заплаканыя вочы.

Ну добра, скажаце вы, — а як жа з дажджом? Быў ён ці не было яго? Быў дождж ці бура?

Гэта не мае значэння. Мог быць дождж, а магло і не быць яго. Магла быць нават бура, а магло і не быць яе. Гэтак жа заўсёды — то пройдуць дажджы, то сонейка выблісне, і раптам зноў пачне дажджыць.

Але, калі на тое пайшло, трэба быць справядлівым і да Ікіма — праз які тыдзень пайшоў дождж. Пайшоў ён перад раніцаю, зачапіўшы сваім крылом толькі дальні канец вёскі. А ўвечары Ікім атрымаў вестку, што яго дачка здала экзамены і зноў вучыцца ў інстытуце.

Позняй восенню, зноў жа ўначы, прыехала яна да іх у госці. Прыйшла з адным маленькім чаданчыкам. Пакінула яго ля ганка і падышла да акна, але так і не пастукала. Толькі была падняла руку, як раптам зарыпелі дзверы. Стоячы на парозе, з цемры ўсміхнуўся Ікім і кінуў дачцэ свой стары і бяскрыўдны жарт:

— Сама адшукала хату ці людзі добрыя паказалі?..

Пераклаў Леў САЛАВЕЙ.

Валерый БРУСАЎ

ПРАЦА

Паміж тысяч дзіўных слоў,
Што блішчаць, гараць, іскрацца, —
Дарагое ад вякоў —
Залатое слова: «праца»!

Трагладыт стаў чалавекам,
І магло тады так стацца,
Калі з сошкай на прасеках
Распачаў цяжкую працу.

І, што п'ём мы поўнай чашай,
Створана аддаўна працай,
Ўсё, як ёсць багацце наша,
Ўсё, што лепшым можа звацца.

І святло ад лямп, экранаў,
Бег матораў, гул ратацый,
Лёт бясследны манапланаў,
Спадчына аддаўна працы!

Веды, кнігі, ўсё мастацтва —
Гэта працы ўвасабленне!
Што ні крок, дык праца, праца,
Гэта ўсё яе здзяйсненне.

І ў жыцці на месца права
Толькі тым, хто любіць працу,
Працавітым толькі слава,
І вянкі ім будуць слацца!

А калі ж зара смяецца,
Хоча з зоркай развітацца,
Радасць у душу ліецца
Знітаваных разам з працай.

Той, хто скончыў дзень у стоме,
Ўзнагароджаны нямала,
Калі працай сціплай, плённай
Ураджай сабраны ўдала.

1919.

Пераклаў С. ШУШКЕВІЧ.



ЭНЕРГІЯ І КУЛЬТУРА

ДА 100-годдзя З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Валерыя БРУСАВА

МАЛА ХТО ведае, што ў старадаўнім асабняку, дзе цяпер працуе Праўленне Саюза пісьменнікаў СССР (вуліца Вароўскага, 52), у 1921 — 1925 гадах знаходзіўся Вышэйшы літаратурна - мастацкі інстытут, заснавальнікам і першым рэктарам якога быў Валерый Брусаў. Пасля смерці гэтага выдатнага паэта і грамадскага дзеяча інстытуту было прысвоена яго імя.

Мне давялося вучыцца ў брусаўскім інстытуце, а яшчэ вучыліся там з беларусаў Уладзімір Дубоўка, Міхась Дуброўскі і, мой зямляк са Слуцка Георгій Бярозка (рускі пісьменнік). У інстытуце было два аддзяленні: творчае і інструктарскае, і разлічаны ён быў на моладзь, якая шчыра захаплялася літаратурай.

Вялікі Кастрычнік адкрыў дарогу ў літаратуру народам усіх нашых рэспублік, здольныя людзі з нізоў прыйшлі на змену абраннікам забяспечаных і прывілеяваных класаў. Але, каб падняцца да вяршынь, ім трэба было ўпарта працаваць над сабой, набыць марксісцка-ленінскі светапогляд, авалодаць дасягненнямі папярэдніх пакаленняў і культурай слова. Такую магчымасць магла даць толькі Савецкая ўлада.

Ідэю Валерыя Брусава арганізаваць вышэйшую школу для пісьменнікаў ухвалілі, і, пры актыўнай падтрымцы наркома асветы Анатолія Васільевіча Луначарскага, інстытут пачаў жыць і працаваць.

Ён быў першай у свеце прафесіянальнай навучальнай установай для літаратараў. Гэта была наватарская і шмат у чым эксперыментальная школа.

Вышэйшы літаратурна-мастацкі інстытут імя В. Брусава праіснаваў, праўда, нядоўга — усяго чатыры гады, але ідэя стварэння спецыяльнага інстытута для літаратараў была прынцыпова правільнай і ў 1933 годзе на Цвярскім бульвары, 25, у так званым Доме Герцэна быў адкрыты Літаратурны інстытут імя М. Горкага, які плённа працуе і зараз.

Брусаў быў цудоўны арганізатар, чалавек вельмі чулы, стрыманы, дакладны ў думках і паслядоўны ў сваіх учынках. Аўтарытэт яго быў настолькі вялікі, што лепшыя навуковыя сілы Масквы ахвотна чыталі лекцыі і праводзілі семінары ў нашым інстытуце, а на літаратурныя сустрэчы прыходзілі выдатнейшыя пісьменнікі 20-х гадоў. Бывалі ў нас Луначарскі, Маякоўскі, Асееў, Сяльвінскі, Ясенін, Вера Інбер, Усевалад Іванаў, выступаў з мастацкім чытаннем Яхантаў.

Брусаў не быў прыхільнікам вузкай спецыялізацыі. Апроч розных літаратур, у інстытуце чыталіся лекцыі па гісторыі сумежных мастацтваў — жывапісу, музыкі, выкладаліся замежныя мовы — французская, нямецкая, англійская. Сам Брусаў чытаў некалькі прадметаў: тэхніку вершаскладання, лацінскую мову ў сувязі з агульным мовазнаўствам, але галоўным яго прадметам была антычная літаратура. Чытаў ён выразна, складна, крыху глухаватым голасам, здзіўляючы ўсіх выключнай эрудыцыяй.

Кожны студэнт лічыў справай гонару здаць залік Брусаву як мага лепш. І не без хвалявання ўвайшоў я аднойчы ў невялікі, абабіты шаўковымі шпалерамі пакой, у якім Валерый Брусаў прымаў залікі. Ён сядзеў за сталом, уважлівы, карэктны, і між намі адбыўся дыялог, які ўрэзаўся мне ў памяць на ўсё жыццё.

— Раскажыце пра Гарацыя.

— Валерый Якаўлевіч, Гарацыя я не люблю.

Брусаў здзіўлена прыпадняў бровы.

— А каго вы любіце? — ажывіўся ён, не без іроніі зірнуўшы мне ў твар.

— Авідзія, Валерый Якаўлевіч. Ён мне бліжэй.

— Расказвайце пра Авідзія.

Авідзія я ведаў добра, расказваў даволі доўга, пералічыў амаль усе яго творы і нават тое - сёе працытаваў па-лацінску. Мне хацелася бліснуць, паказаць сябе з найлепшага боку.

Брусаў не перабіваў, слухаў і, як мне здалося, быў задаволены.

Скончыўшы пра Авідзія, упэўнены ў сабе, я сказаў:

— А цяпер, Валерый Якаўлевіч, калі ласка, я магу пра Гарацыя.

— Не, не трэба. Дайце вашу кніжку.

Яго давер'е і добразычлівасць акрылілі мяне.

Як узвышае і радуе, калі вялікі чалавек не падкрэслівае перад іншымі сваёй велічы!

Валерый Якаўлевіч Брусаў нарадзіўся 13 снежня 1873 года ў Маскве ў сям'і купца. Дзед яго па бацькавай лініі — з прыгонных сялян, праз гандаль разбагацеў і адкупіўся на волю. Матэрыяльная незалежнасць дазволіла маладому Брусаву цалкам аддацца навукам і паэзіі, стаць літаратарам-прафесіяналам шырокага дыяпазону.

Універсальнасць інтарэсаў, выключная працавітасць і фенаменальная памяць — тры неад'емныя якасці натуры Валерыя Брусава. І яшчэ трэба адзначыць адну рысу — здольнасць зазірнуць у будучыню. Ён заўсёды імкнуўся наперад і не любіў вяртацца на пройдзеныя шляхі. Прызнаўшы праўду пралетарскай рэвалюцыі, Брусаў у 1920 годзе стаў камуністам.

М. Горкі ў адным з лістоў да яго назваў Брусава «самым культурным пісьменнікам на Русі», а ў другім лісце пісаў: «Я не ведаю ў рускай літаратуры чалавека больш працавітага («деятельного»), чым вы».

Але перш за ўсё, вядома, ён — паэт. Брусаў напісаў безліч вершаў, самых разнастайных па зместу і форме. Схільны да сістэматызацыі, ён падбіраў іх у раздзелы і цыклы, шырока ахапляючы праявы жыцця мінулага і сучаснага. Задумы ў яго былі грандыёзныя. Напрыклад, ён пачаў складаць кнігу «Сны чалавецтва», у якую збіраўся ўключыць больш за 3000 вершаў, напісаных у творчай манеры розных эпох і народаў ад першабытнасці да нашых дзён. Ужо адзін гэты намер сведчыць аб яго энергіі і магутнай фантазіі.

Вперед, мечта, мой верный вол!..
И я тружусь, и ты работай!

Гэтыя праграмныя радкі Валерыя Брусава пераклікаюцца са словамі Максіма Багдановіча:

Трэба з сталі каваць,
гартаваць гібкі верш.
Абрабіць яго трэба
з цярпеннем.

Шліфоўка кожнага радка, імкненне да скульптурнай завершанасці, да гармоніі — тыповая асаблівасць творчага метаду Брусава.

Сярод сімвалістаў, да якіх ён прымыкаў у свой час, Брусаў быў прызнаным «мэтрам», але рацыяналістычны, разумовы характар яго творчасці, пры ўсёй насычанасці атрыбутамі сімвалізму, рэзка выдзяляўся на фоне дэкадэнцкага туману, богашукальніцтва і містыкі. Брусаў быў чалавекам ад зямлі, і яго «сімвалізм» — толькі даніна літаратурнаму стылю пэўнай эпохі.

У снежні 1923 года на адным з вечароў, прысвечаных творчасці Брусава ў сувязі з яго пяцідзесяцігоддзем, адзін з прафесараў назваў яго «бардам сімвалізму», а другі аналізаваў яго сувязі з антычнай літаратурай, і чамусьці гэта хвалебнае таптанне ў мінулым зрабіла на Брусава прыкрае ўражанне. У заключным слове ён папракнуў дакладчыкаў, сказаў, што яго жывога хаваюць, спіхваюць у гісторыю, тады як ён працуе для сучаснасці, для народа, вызваленага ад векавога гнёту. І падзякаваў толькі А. В. Луначарскаму за цёплыя словы прызнання яго ролі як пісьменніка - камуніста ды яшчэ тым, хто расказваў аб яго дзейнасці ў Вышэйшым літаратурна - мастацкім інстытуце.

Нядаўна я перачытаў некаторыя яго вершы, у тым ліку і з пасмяротнага зборніка з лацінскай назвай «Меа» (Спяшайся), вершы, прысвечаныя Ул. І. Леніну, Кастрычніцкай рэвалюцыі, Маскве...

А я, гость лет, я,
постоялец,
С путей веков, здесь дома я.
Полвека дум нас в цепь
спаяли,
И искра есть в лучах — моя!
(«Каля Крамля»).

Далучыўшыся да сацыялістычнай рэвалюцыі, прыхільнік навукова-тэхнічнага прагрэсу, Брусаў верыў у шчаслівую будучыню чалавецтва. Зліваючы навуку з паэзіяй, ставячы мэтай пазнаць таямніцы свету, ён быў нястомным змагаром за масавы ўздым культуры, выяўленне талентаў з народа, за росквіт літаратуры і мастацтва.

Брусаў быў выдатным пушкіністам і ўнёс немалы ўклад у даследаванне творчасці геніяльнага рускага паэта. Нейк аднойчы ён сказаў: «Каб здарылася няшчасце і прапалі ўсе вершы Пушкіна, я з алоўкам у руках, мабыць, змог бы іх аднавіць». І гэта не пахвальба.

Энцыклапедычная памяць памагала, а часам і перашкаджала Брусаву ў яго ўласнай творчасці, перагружаючы паэзію інфармацыяй і аслабляючы яе эмацыянальную сілу.

Добра ведаючы еўрапейскія і антычныя мовы, Брусаў шмат зрабіў і як перакладчык. Ён пераклаў «Энеіду» Вяргілія, «Фаўста» Гётэ, перакладаў творы Петраркі, Байрана, Верхарна, Райніса, Купалы і многіх, многіх іншых паэтаў.

Асабліва каштоўнай з'яўляецца складзеная ім кніга «Паэзія Арменіі з часоў старажытнасці да нашых дзён». Уступны артыкул, большасць перакладаў і каментарыі да гэтай кнігі зроблены Брусавым з уласцівай яму дакладнасцю. Каласальная работа, новая і смелая для таго часу (кніга выйшла ў свет у 1916 годзе). Гэта была першая і вельмі ўдалая анталогія армянскай паэзіі на рускай мове.

Помню ўрачысты вечар у Маскве ў Вялікім тэатры. Адзначалі юбілей Брусава. Пасля бліскучага даклада А. В. Луначарскага з'явіліся дэлегацыі. Прыйшла і армянская дэлегацыя ўшанаваць юбіляра. Валерыю Якаўлевічу было прысвоена званне народнага паэта Арменіі. Праспяваўшы паэту славу, армянскі ашуг паклаў да яго ног свой музычны інструмент — саз. Такая была народная традыцыя ў паэтычных спаборніцтвах. Брусаў быў збянтэжаны, засаромеўся, схапіў інструмент і замітусіўся, не ведаючы, каму яго перадаць. Адбылася прыкрая паўза. У сваім чорным сурдуце, тым самым, што на партрэце Урубеля, у святле электрычных агнёў ён здаваўся нейкім вельмі самотным. Брусаў не любіў пышнасці, параднасці і, наколькі я помню, заўсёды трымаў сябе скромна. Віншавалі яго і беларусы — выступаў Ул. Дубоўка.

Творчая спадчына Брусава далёка яшчэ не ўся сабрана і вывучана. Паэт складаны, супярэчлівы, ён, як рэха, адгукаўся на падзеі часу. Гэта быў падзвіжнік, рабочы ад літаратуры, верны Радзіме і свайму прызванню. Яго запавет маладым літаратарам — служыць народу самааддана і бескарысліва.

Юрка ГАЎРУК.

ВЯСЁЛЫМ ШТРЫХОМ

В. Цвірко.

А. Малішэўскі.

Я. Пакаташкін.

Сяброўскія шаржы К. КУКСО.

ЯДОЎГА марыў, каб атрымаць якую-небудзь грамадскую работу: час жа цяпер такі, што вымагае ад кожнага чалавека актыўнасці ў шматгранным нашым жыцці. І вось нарэшце мара мая збылася. Працую я, каб было вядома чытачу, чарцёжнікам у праектным архітэктурным бюро. Дык на нядаўнім справаздачна-выбарчым прафсаюзным сходзе мяне выбралі ў мясцовы камітэт. Сам загадчык аддзела, паважаны Карп Міхайлавіч, вылучыў маю кандыдатуру.

Аказалі людзі давер — трэба апраўдваць яго. Неўзабаве такая магчымасць надарылася. Даручылі мне, як адказнаму за бытавы сектар, у арганізаваным парадку забяспечыць супрацоўнікаў нашай установы бульбай — каб не турбаваўся кожны сам для сябе. І правільна. Няхай сабе працуюць спакойна — а бульбачка ім да дзвярэй пад'езда будзе дастаўлена. Ссыпай у склеп і ласуйся потым кожны дзень дранікамі.

— Пайду ў магазін,— сказаў я Карпу Міхайлавічу.— дамоўлюся, калі пад'ехаць і закупіць.

— Навошта табе хадзіць? Я пазваню па тэлефоне, а ты працуй.— Карп Міхайлавіч прыязна ўсміхнуўся.— Галоўнае — не хваляваца.

АВОХЦІ МНЕ!

ГАЛОЎНАЕ — НЕ ХВАЛЯВАЦЦА

Праз тыдзень я звярнуўся да загадчыка аддзела:

— Званілі, Карп Міхайлавіч?

— Так вось усё кідай і звані,— незадаволена буркнуў ён.— Толькі таго і клопату ў мяне. Пазваню.

Зноў прайшоў тыдзень.

— Супрацоўнікі папракаць пачынаюць, Карп Міхайлавіч, трэба нешта рабіць.

— Што ты ўсё заладзіў: рабіць, рабіць. Нікуды тая бульба не дзенецца. А цяпер, галубок, вось табе яшчэ адно заданне, і пакуль не зробіш — на вочы не паказвайся.

Мне раптам закарцела абазваць загадчыка аддзела бюракратам, але я стрымаўся: нетактоўнасць не ўпрыгожвае чалавека. Ды і ўспомніў параду: галоўнае — не хваляваца.

Заданне, якое даў загадчык, мне дапамаглі хуценька выканаць супрацоўнікі. Мой бліжэйшы сусед па сталу Даніла Антонавіч, як трэба каму дапамагчы — матнецца, бывала, бы той віхор, толькі ў другі бок. А на гэты раз і ён, як кажуць, стаў у шарэнгу. І я без ведама загадчыка сам заняўся бульбай.

К канцу дня я прывёз аўтамашыну бульбы прама ў двор установы. Насыпайце ў мяшкі, колькі каму трэба, а потым развязём па кватэрах. Спусціўся і Карп Міхайлавіч з трэцяга паверха на двор. Падышоў да мяне, шырока ўсміхнуўся.

— Ну вось, і работа зроблена, і бульба прывезена. А ты кіпеў. Галоўнае — не хваляваца.

А. МАЦВЕЕЎ.

ПАРОДЫІ

ДЗЕ СКЛАД, ДЗЕ ЛАД

Не ўсё ў мяне так ладна,
Хоць гавару я складна.
Нярэдка б'ю я ў ладкі
І там, дзе непаладкі.

Міхась ГУБЕРНАТАРАЎ

А я з маленства гэткі
Быў гожы, ланны, гладкі,
Вясковыя кабеткі
Наўчылі біць у ладкі.

Наўпрост жыццёвай сцежкі
Пакуль узбіўся быў —
Вакол дзіравай дзежкі
Я сам сябе лавіў.

А каб дайсці да ладу —
Ці лепшае было бі
Матуля са спагадай
Памацае мой лоб.

А бацька возьме дзягу
Ды сплюне ўбок найперш...
З маральнай перавагай
Пісаў я кожны верш.

«Не ўсё ў мяне так ладна,
Хоць гавару я складна»...

Аўдоля КОРЧ.

БЛАСЛАВЁНАЯ ПЕРАПЁЛАЧКА

Міхась ВЫШЫНСКІ

САЎГАСАЎСКІ дырэктар цёнгле думаў, што куртаценькія, нібы курачкі, перапёлачкі высвіствваюць у збожжавых зараснікаў — фіў-фіць, фіў-фіць, — так сабе, як высвіствваюць у лясных зараснікаў салавейкі ды іншыя птушачкі.

Саўгасаўскі дырэктар турбаваўся толькі пра тое, каб у пару засеяць саўгасаўскія гоні, вырасціць густыя зараснікі жыта, пшаніцы, ячменю, у пару пачаць жніво гэных блаславёных зараснікаў і хутчэй падбіць бабкі: колькі і чаго прыпадзе на круг?

Сам выхаванец Горацкай акадэміі, саўгасаўскі дырэктар вельмі верыў у навуку, у сучасную тэхніку. Каб падабраць лепшую жніўную пару, ён уважліва слухаў па радыё прагнозы Грэты Міхайлаўны Міхайлавай, вывучаў здымкі хмарнасці, зробленыя штучным спадарожнікам Зямлі, званіў у рэспубліканскі вылічальны цэнтр, дзе працуюць мудрыя машыны «Мінск-32». Усё ўжо даўно сведчыла, што пара жаць збожжавыя зараснікі, пара падбіваць бабкі. Але самы галоўны падбівальшчык бабак, звеннявы саўгасаўскай камбайнавай суполкі Максім Апанасавіч зацята маўчаў. Ён упарта не садзіўся на свой эска-4 і не дазваляў іншым супольшчыкам весці іншыя эска-4 у блаславёныя збожжавыя зараснікі.

Устрывожаны гэнай незразумелай упартасцю звеннявога камбайнавых супольшчыкаў, саўгасаўскі дырэктар праходзіў паўз замглёнае туманам возера і не адчуваў, што яно сёння пахне ўжо не звычайнымі вадаростамі, а цёплым сырадоем, смятанай і нарачанскім сырам. І што блаславёныя перапёлачкі ўжо не проста пасвіствваюць, а падаюць нейкую строгую каманду. Чамусьці ўсхадзіліся ў сваіх травяных зараснікаў і драчы.

Усе камбайнавыя супольшчыкі былі каля саўгасаўскай канторы. Падзяндобрыўшыся з імі і парукаўшыся асабіста з іх упартым звеннявым, саўгасаўскі дырэктар боязна запытаўся:

— Што-а? Можа, хлопцы, і сёння не жацьме? А, Максім Апанасавіч?

— Жацьме! — блаславёным голасам выгукнуў Максім Апанасавіч.— Зараз жацьме, таварыш дырэктар. Вы толькі паслухайце, што спявае перапёлачка, што туруюць ёй драчы!

Дырэктар зірнуў у бок збожжавых зараснікаў на саўгасаўскіх гонях і прыслухаўся. А там ужо ўсё аж разлягалася ад заклапочанага голасу шэранькай птушачкі:

— Жаць-пара! Жаць-пара!

— Рру-пліва! Рру-пліва! — тураваў перапёлачцы з травяных зараснікаў басавіты драч.

Максім Апанасавіч пераможна паглядзеў на збянтэжанага дырэктара і ўсміхнуўся:

— Гэта сігнал нам, камбайнавым супольшчыкам! Такой удалай пары не падбярэ ні ваша Грэта Міхайлаўна, ні эвээм-32!.. Па машынах, супольшчыкі!

Хлопцы дружна забегалі па сваіх эска-4, ведучы іх у ячмянёвыя зараснікі.

Узрадаваны саўгасаўскі дырэктар наўздагон раздзяндобрыўся з супольшчыкамі і кулем кінуўся ў сталоўку.

— Хутчэй рыхтуй абед на поле,— крыкнуў ён саўгасаўскаму кухару.— Ды такі смачны, каб у нашых камбайнавых супольшчыкаў аж насы ўпрысядкі хадзілі!

А камбайнеры ўвішна бегалі па машынах, шастаў з бункераў на кругі ячмень, вучотчыкі падбівалі бабкі. На круг прыпадала па сорак два цэнтнеры. Цюцелька ў цюцельку, як і на гектар!

Шэрая перапёлачка таксама завіхалася і ўсё падахвочвала і падахвочвала з пшанічных зараснікаў:

— Жніце—час! Жніце—час!

— Рру-пліва! Рру-пліва! — натхнёна тураваў ёй з травяных зараснікаў драч.

Ад возера пахла блаславёным сырадоем З белых аўсяных гоняў — смачным кісялём і гатовымі камякамі.

О, блаславёная перапёлачка! О, блаславёная пара жніва!

Макар ПАСЛЯДОВІЧ.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-44-04, аддзела літаратуры — 33-22-04, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела публіцыстыкі — 33-21-53, аддзела культуры — 33-24-62, выдавецтва — 32-22-19, бухгалтэрыі — 32-15-87.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Х. Д. ЖЫЧКА.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. Ц. БАЖКО, Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, Ю. П. ГРЫГОР'ЕЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ, Л. Я. ПРОКША, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

Індэкс 63856. АТ 20229